№ 43 (497) 24 лістапада 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Асьцярожна, дзьверы адчыняюцца

Эўрасаюз прапануе Беларусі шчодрую падтрымку ўзамен за дэмакратызацыю і нармалізацыю адносінаў. Старонка 3.

Эўракамісія гатовая адкрыць рынак для беларускіх тавараў, забясьпечыць фінансавую падтрымку беларускім фірмам, павялічыць колькасьць стыпэндыяў для студэнтаў, спрасьціць працэдуру атрыманьня візаў. Афэрта настолькі прывабная, што ўладам будзе няпроста абгрунтаваць нежаданьне ўвайсьці ў адчыненыя дзьверы.

**21 лістапада кіраўнік прадстаўніцтва Эўракамісіі ва Украіне і Беларусі Іен Боўг прэзэнтаваў новую стратэгію Эўракамісіі «ўладзе і народу» Беларусі.**

## Нечакана вызвалены Астрэйка

«Як ва ўсіх зэкаў, у мяне баляць зубы». Алесь Бяляцкі пра вызваленьне Міколы Астрэйкі: Гэта не сыгнал. **Старонка 6.**

## «Не шкадую, што прайшоў праз турму»

Вызвалены на мінулым тыдні Сяргей Скрабец не выглядае стомленым. Ён даў ужо дзясяткі інтэрвію, але і надалей нікому не адмаўляе, бо «абяцаў гэта Казуліну». **Старонка 10.**

## Адваротны бок Месяца

Што нам рабіць з супрацоўнікамі спэцслужбаў? Піша Віталь Тарас. **Старонка 12.**

## Шаноўныя супрацоўнікі і чытачы «Нашай Нівы»!

Ад імя Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў віншую вас са стогадовым юбілеем і зычу плённай працы на карысьць Беларусі і яе пачэснага пасаду між краінамі — чальцамі ААН!

**Джыхан Султанаглу, прадстаўнік ААН/ПРААН у Рэспубліцы Беларусь**

## Газэта жыве!

**МГА «Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» мае гонар павіншаваць першую беларускую газэту «Наша Ніва» са стагодзьдзем.**

«Наша Ніва», утвораная яшчэ ў 1906 г. і адноўленая ў 1991 г., набыла бясспрэчную папулярнасьць сярод інтэлігенцыі, моладзі, беларускага асяродку.

Нягледзячы на тое, што ў 2005 г. улады забаранілі распаўсюджваць газэту праз «Белпошту» і «Белсаюздрук», дзякуючы вялікім намаганьням супрацоўнікаў і аўтараў Рэдакцыі, газэта жыве! І цяпер яе можна атрымаць, дзякуючы створанай сыстэме распаўсюду, праз рассылку поштай і кур'ерскую дастаўку. Да таго ж, Рэдакцыя ідзе крок у крок з часам і пакарыла віртуальную прастору.

Жадаем «Нашай Ніве» захаваць статус першай беларускай газэты, ня мець перашкод у выданьні і адзначыць 200-гадовы юбілей.

**Управа МГА «ЗБС «Бацькаўшчына»**

«НАШАЙ НІВЕ»

Мая сьвятая, беспартыйная,
Дасюль яшчэ хрэстаматыйная —
Табе, сяброўка стогадовая,
Ад сэрца шлю любові слова я.

Сваёю моваю шляхетнаю,
Сваёй манераю адметнаю
Мяне даўно к сабе прынадзіла
І аніколі йшчэ ня здрадзіла.

Тваю ацэнку бесстароньнюю
Заўжды складаным часам помню я.
Цалую ўсе твае староначкі,
Чытаючы і ўдзень, і ўпоначкі.

Мая зьмястоўная таўстушачка,
Маёй радзімы шчырка-душачка,
Мая яснотка прад хімэраю —
Люблю. Ня здраджу. Шчыра верую.

**Антон Бубала, Дрыса**

* * *

Некалькі вершаваных радкоў у падарунак:

Ёсьць такія людзі, пэўна,
Што працуюць не за пернік,
Што на нітку інтуіцыі
Ніжуць словаў цьвёрдых пэрліны.

Рэдкія, як ювэліры.
Ўчуюць гук трубы і ліры.
І яны не пачынаюць
Працу ўраз на «тры-чатыры!».

Віншую са 100-годзьдзем «Нашу Ніву», а таксама сяброў Рэдакцыі, галоўных рэдактараў, усіх нашаніўскіх аўтараў!

Зычу ўсім моцнага здароўя, мужнасьці, натхненьня і пашырэньня кола чытачоў! Няхай каласуе Наша Ніва!

**Людка Сільнова**

## Хай здохне хоць заўтра

**Віншую калектыў і чытачоў «Нашай Нівы»!** Зычу ўсім творчых посьпехаў у працы і ўсяго найлепшага ў жыцьці!

Хай здохне хоць заўтра
Калгасны наш Гусь.
Мы гукнем упарта:
Жыве Беларусь!

**Юзік Дзенісюк, в.Абухава, Гарадзенскі раён**

* * *

**Шаноўны рэдактару, з дарагой душы віншую Вас і супрацоўнікаў «Нашай Нівы» з стогадовым юбілеем выданьня.** Рады, што вы не апусьцілі рукі і ўпарта робіце нацыянальную справу. Бог вам у помач.

**Мікола Бусел, Дуброва, Сьветлагорскі раён**

## Дарагія нашаніўцы!

**Віншую вас, зычу, каб свабоднае Слова ніколі ня згасала, таму што Свабода ад Бога, а Божае — вечнае.**

Равуць вятры, грымяць грамы,
Пыл засьціць вочы нам, і ўсё ж
І ўсё ж мы дойдзем,
Дойдзем мы да Беларусі!

З Богам! Здароўя вам, веры і надзеі.

**Чытач «НН»**

## Ад газэты «Intex-press»

Імчыць па сьвеце лістапад імклівы
І не бяды, што скончылася лета.
Сто год сьвяткуе сёньня
«Наша Ніва»
Найпершая найлепшая газэта.

Пра родны край у вас нібы пяецца,
Ёсьць у выданьні спорт
і нават гумар.
У рукі з рук яна перадаецца.
Зачытваюць да дзірак кожны нумар!

Вы пішаце, што тут і што ў сьвеце.
Сапраўдны беларус —
«НН» прыхільнік.
І не зьдзіўленьне, што такой газэце
Пашана ў Беластоку і ў Вільні.

Пра вас народ і ведае, і чуе
(Пра вас няцяжка і паэму скласьці).
І «Intex-press» вас ад душы віншуе
І зычыць даўгалецьця,
плёну, шчасьця.

Даўно ў нас забыліся аб скрусе,
І зьвесткі пра вайну даўно ў архіве.
Чаму ж тады ў сталіцы Беларусі
Няма для сьвята месца
«Нашай Ніве»?

Нідзе няма — ад Віцебску да Брэсту
(У палацах гамана пра ўгнаеньні)...
Ды, дзякуй Богу, усё ж знайшлося месца
У сядзібе БНФ, на Варвашэні.

Гучы і радуй, Нашаніўскі голас
(Пакуль такія ёсьць —
нішто ня страшна).
Пакуль у нас Купала ёсьць і Колас,
Ня згіне Беларусь, Айчына наша.

Жадаем росквіту ўсім на дзіва,
Пішыце! Услаўляйце родны край!
Няхай квітнее наша «Наша Ніва»
І дорыць людзям
шчодры ўраджай!

**Калектыў рэдакцыі газэты «Intex-press», Баранавічы**

* * *

**Віншую вас са 100-гадовым юбілеем!** Дзякуй Рэдакцыі за працу, цікавыя матэрыялы і мужнасьць. Здароўя, плённай працы і Божай ласкі вам на доўгія гады.

**Людміла Літвінава, Менск**

## Шаноўныя сябры!

**Віншую ўсіх вас са 100-годзьдзем «Нашай Нівы»**, зычу ўсім вам добрага здароўя, творчага гарту, нястомнага і нязломнага рэжымам жаданьня несьці людзям, шчырым беларусам, праўдзівае, вольнае слова, няхай не затухае ў вас купалаўскі дух свабоды, незалежнасьці, нецярпімасьці да дыктатуры ва ўсіх яе праявах.

Жыве Беларусь!

**Міхась Тычына, ваш падпісчык і аднадумец**

# Віншаваньне ад Міністэрства інфармацыі

16 лістапада «Наша Ніва» атрымала папярэджаньне.

Папярэджаньне вынесенае за тое, што ў выходных зьвестках нумароў за лістапад «не паведамляе сапраўдны адрас рэдакцыі, што парушае артыкул 26 Закону «Аб друку і другіх сродках масавай інфармацыі». Падпісала папярэджаньне намесьніца міністра Лілія Ананіч.

Нагадаем перадгісторыю. Раней «Наша Ніва» накіроўвала ў Менгарвыканкам заяву пра ўзгадненьне разьмяшчэньня рэдакцыі. Аднак у адказе за подпісам намесьніка старшыні гарвыканкаму М.Ціцянкова было сказана (па-расейску, вядома), што Менгарвыканкам «лічыць немэтазгодным разьмяшчэньне газэты «Наша Ніва» на тэрыторыі Менску». Між тым, беларускае заканадаўства не ўтрымлівае паняцьця мэтазгоднасьці, не прадугледжвае яно і ўзгадненьняў з ідэалягічнымі аддзеламі.

Пасьля таго ліста М.Ціцянкова мы чатыры разы заключалі дамовы аб арэндзе памяшканьня. Аднак варта было нам подаць дакумэнты ў Мінінфармацыі і ў аддзел юстыцыі Менгарвыканкаму аб новым адрасе газэты, як літаральна праз пару дзён чарговы арэндадаўца, жудка напалоханы,разрываў з намі дамову аб арэндзе. Адпаведна, праз пару тыдняў зь Міністэрства інфармацыі нам тэлефанавалі і паведамлялі: у іх ёсьць зьвесткі, што дамова з намі скасаваныя, таму яны ня будуць уносіць новы юрадрас у пасьведчаньне». За гэты ж час, акрамя таго, аднойчы быў скасаваны вынік аўкцыёну, паводле якога «НН» выйграла права арэнды офісу.

На нашу думку, ідэалягічныя органы хочуць закрыць «Нашу Ніву», але хочуць зрабіць гэта так, каб выглядала ўсё як спрэчка гаспадарчых суб'ектаў або нядбайнасьць Рэдакцыі. Дык, людзі, ведайце: мы дбалі.

У кастрычніку мы паінфармавалі аб усім міністра інфармацыі, прасілі ўмяшацца, аднавіць законнасьць і абараніць «Нашу Ніву». Але — за тыдзень да юбілею маем папярэджаньне. Як гаворыцца, што савой аб пень, што пнём аб саву.

Пакуль Рэдакцыя ня вырашыла, ці будзе яна абскарджваць гэтае папярэджаньне. Каштуе працэс пад мільён рублёў, а спадзяваньняў на суд мець не прыходзіцца.

# Асьцярожна, дзьверы адчыняюцца

Эўрасаюз прапануе Беларусі падтрымку ўзамен на дэмакратызацыю і нармалізацыю дачыненьняў.

Распрацаваны праект новай стратэгіі Эўракамісіі што да Беларусі. Ён сэнсацыйны: упершыню Камісія робіць канкрэтныя прапановы: нешта ў абмен на нешта. Эўразьвяз гатовы адкрыць рынак для беларускіх тавараў, прапанаваць фінансавую падтрымку беларускім фірмам, павялічыць колькасьць стыпэндыяў для студэнтаў, зрабіць больш простай працэдуру атрыманьня візаў і г.д. Кошт прапановы ЭЗ можна ацаніць у сотні мільёнаў эўра. Гэта ўсё ўзамен на дэмакратызацыю.

Эўракамісія хоча пакінуць Аляксандру Лукашэнку дзьверы прыадчыненымі: ён можа запусьціць дэмакратычныя рэформы сам. Бо з дакумэнту не вынікае, што адыход Лукашэнкі ёсьць самамэтай Эўропы. Тое, у чым Брусэль сапраўды зацікаўлены, гэта дэмакратычны эфэкт. Камісія ставіць Беларусі 12 умоваў, па выкананьні якіх ЭЗ рэалізуе свае абавязацельствы. Гэта, між іншым, вызваленьне палітычных вязьняў, канец перасьледу апазыцыі, праўдзеньне сумленнага сьледзтва ў справе «зьніклых» апазыцыянэраў і журналістаў. І ўрэшце — свабодныя выбары.

Усё гэта прапануецца аформіць у выглядзе дамовы пра партнэрства. Эўразьвяз ужо меў пагадненьне пра партнэрства і супрацоўніцтва зь Беларусьсю, але яно было замарожанае ў 1996 г., пасьля другога рэфэрэндуму.

Эўрапейскі камісар (г.зн. міністар Эўрасаюзу) па замежных стасунках і палітыцы добрасуседзтва **Бэніта Фэрэра-Вальднэр** тлумачыла ў Брусэлі:

**Працяг на старонцы 4.**

## Аляксандар Мілінкевіч: Прапанова своечасовая

«Прапанова Эўрасаюзу мяне ўсьцешыла. Яна своечасовая. Прапаганда ўвесь час даводзіць беларусам, што яны ня могуць спадзявацца на ЭС, бо ў Эўропе нас ніхто не чакае. А тут, калі ласка — маем дакумэнт, які пацьвярджае, што ЭС, аднак, чакае на Беларусь, чакае дэмакратычных пераменаў у нашай краіне. І гатовы падтрымаць Беларусь сур’ёзнымі грашыма. Гэтая стратэгія можа моцна дапамагчы перамаць апатыю, якая апанавала беларускае грамадзтва. Мы, са свайго боку, зробім усё, каб зьмест дакумэнту, падрыхтаванага ў ЭС, як найхутчэй трапіў да ўсіх беларусаў.

Ці скарыстаецца ўлада з гэтых прапановаў? Яна павінна зразумець, што дэмакратыя — гэта ня проста пажаданьне пэўнай часткі насельніцтва нашай краіны, а ўмова ўваходу нашай краіны ў цывілізаваны сьвет».

### 12 пунктаў Эўрасаюзу: перадумовы нармалізацыі адносінаў і эканамічнае падтрымкі

1. Паважаць **права** народу Беларусі **выбіраць сваіх лідэраў дэмакратычным шляхам** — іх права чуць усе меркаваньні і бачыць усіх кандыдатаў на выбары; права апазыцыйных кандыдатаў і груп падтрымкі праводзіць кампаніі без прыгнёту, судовага перасьледу або турэмнага зьняволеньня; незалежнае назіраньне за выбарамі, беларускімі няўрадавымі арганізацыямі ўключна; права волевыяўленьня і права на справядлівы падлік галасоў.

2. Паважаць **права** народу Беларусі **на незалежную інфармацыю** і свабоду слова, напрыклад, свабода журналістам працаваць без прыгнёту або судовага перасьледу, каб не закрываліся газэты і не было перашкодаў іх распаўсюду.

3. Паважаць **правы** недзяржаўных арганізацый як жыцьцёва важнай часткі здаровай дэмакратыі — больш не ўскладняць іх легальнае існаваньне, не прыгнятаць і не перасьледаваць сяброў грамадзкіх аб’яднаньняў, дазваляць ім атрымліваць міжнародную дапамогу.

4. **Вызваліць усіх палітычных зьняволеных** — сяброў палітычных апазыцыйных партый, сяброў НДА і простых грамадзян, арыштаваных падчас мірных дэманстрацый і мітынгаў.

5. Належным чынам і незалежна **расьсьледаваць або перагледзець выпадкі са зьнікненьнем людзей**;

6. Забясьпечыць **права** беларусаў **на незалежную і неперадузятую судовую сыстэму** — з судзьдзямі, не залежнымі ад палітычнага ціску, без самавольства і галаслоўнага крымінальнага судовага перасьледу або палітычна матываванага судовага прысуду, як зьняволеньне ў турму грамадзян, якія мірна выказваюць свой пункт погляду.

7. Спыніць **адвольныя арышты і затрыманьні, дрэннае абыходжаньне зь людзьмі**.

8. Паважаць **правы і свабоды** тых беларускіх грамадзянаў, якія адносяцца да нацыянальных меншасьцяў.

9. Паважаць **правы** беларусаў як **працаўнікоў** — іх права ўступаць у прафсаюзы і права прафсаюзаў працаваць на абарону правоў людзей.

10. Паважаць **правы** беларусаў як **прадпрымальнікаў** ажыцьцяўляць дзейнасьць без празьмернага ўмяшаньня ўладаў.

11. Далучыцца да адмены сьмяротнай кары сьледам за іншымі народамі Эўропы.

12. Выкарыстаць падтрымку, якую АБСЭ, ЭЗ і іншыя арганізацыі прапаноўваюць Беларусі для дапамогі ў выкананьні правоў сваіх грамадзянаў.

Працяг са старонкі 3.

# Асьцярожна,

«Народ Беларусі — першая ахвяра ізаляцыі, навязанай органамі ўлады, і будзе першым, хто скарыстаецца перавагамі, якія прапаноўваюцца дэмакратычнай Беларусі».

Камісар Фэрэра-Вальднэр сказала: «Народ Беларусі мае права ведаць, што ён губляе. Наша пасланьне ў тым, што як толькі краіна выкажа сваю гатоўнасьць рухацца наперад да сапраўднай дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закону, мы будзем гатовыя ўступіць у поўнае партнэрства зь Беларусьсю. Гэта азначала б істотнае павелічэньне дапамогі, каб значна палепшыць якасьць жыцьця беларусаў».

У аўторак, 21 лістапада, у Менску кіраўнік прадстаўніцтва Эўракамісіі ва Ўкраіне і Беларусі **Іен Боўг** прэзэнтаваў новы праект стратэгіі Эўракамісіі адносна Беларусі: «уладзе і народу», як выказалася **Ума Удвін**, прэс-сакратарка эўракамісаркі Фэрэра-Вальднэр.

Зранку Боўг наведаў Адміністрацыю прэзыдэнта і МЗС, каб беларускія ўлады змаглі раней чым хто азнаёміцца з гэтай стратэгіяй. У абед ён правёў адмысловую прэс-канфэрэнцыю з гэтай нагоды. Эўрачыноўнік не паведаміў, з кім менавіта з ураду ён меў сустрэчу.

Паводле словаў Боўга, Беларусь і ЭЗ маюць вялікі патэнцыял для супрацоўніцтва і партнэрства, і цяпер акурат прыйшоў час яго рэалізоўваць. Агучаная мэта стратэгіі — «стабільная, квітнеючая і дэмакратычная Беларусь як частка эўрапейскай супольнасьці».

«Найперш мы можам стымуляваць эканамічнае разьвіцьцё Беларусі», — кажа Боўг. Напрыклад, у гандлі тэкстылем, дзе Беларусь цяпер мае пэўныя абмежаваньні.

Заплянаваная таксама сумесная праца ў галіне энэргетыкі.

Аднак прапанаваць усе гэтыя выгоды Эўропа гатовая толькі той краіне, якая падзяляе міжнародныя прынцы-

## A very good deal

Парадаксальна, але дыктатуру можна някепска прадаць. Піша **Барыс Тумар**.

Лукашэнку ня першы раз адмаўляцца ад прапановаў Захаду. Аднак на гэты раз яму цяжка будзе патлумачыць Сідорскаму з Макеем, чаму не паціснуць працягнутую руку. Цяжэй нават, чым цётцы Сьветцы з Ваўкавыску, якая затаварваецца ў беластоцкім «Ошане». Гэтая прапанова нявыгадная сямі асобам у атачэньні кіраўніка дзяржавы, але выгадная ўсім астатнім лукашэнкаўцам.

Прыняць яе (нават неўсур'ёз і ненадоўга) азначае рызыку пайсьці дарогай Пiначэта. Не прыняць яе азначае рызыку дарогі Хонэкера. Ня заўтра, але зь непазьбежнасьцю. Таму я ацэньваў бы шанцы на яе прыняцьце мізэрнымі, але большымі, чым калі-кольвек раней.

Нашай краіне прапануюць грошы на рэформы ўзамен на збліжэньне з Эўропай. Нашай краіне прапануюць таксама падтрымку ў выпадку расейскага газавага шантажу. Беларусь хочуць упісаць у вялікую гульню Эўропы па стварэньні процівагі расейскаму энэргетычнаму монстру. (Тое самае, толькі ў больш цынічным выглядзе, прапануецца цяпер Узбэкістану. У больш цынічным, бо зацікаўленасьць ва ўзбэцкім газе большая, чым у беларускім транзыце.) І гэта добра. Значыць, справа ня толькі ў ідэалах, ад якіх — мы, на жаль, гэта ведаем — Эўропа ня раз лёгка адмаўлялася. Справа ў канкрэтным эканамічным інтарэсе.

Гаворка пра вельмі істотныя сумы, хіба большыя, чым тыя, якімі ў свой час падтрымалі краіны Балтыі ці дэмакратычную Сэрбію. A very good deal, гаворачы на мове бізнэсу. Парадаксальна, што дыктатуру можна някепска прадаць!

Я бачу ў гэтым шанец для Беларусі. Так, у мінулым для Лукашэнкі Захад быў трэба адно як пудзіла для Масквы. Найхутчэй што і на гэты раз эўрапейцы сваёй афэртай папросту насоляць «Газпрому» на пару соцень даляраў, так бы мовіць, з паршывай авечкі хоць воўны жмут.

Аднак нават калі Лукашэнка зьбяёдае гэты шанец, іншыя запомняць: Эўрасаюз разглядае Беларусь як аб'ект інтарэсу. Нарэшце! Гульня стала вартая сьвечак.

## Аляксандар Фядута: Пернікам сыты ня будзеш, але прапаноўваць яго трэба

Палітыка перніка і бізуна мусіць быць палітыкай — калі наагул яна мае права быць. Дагэтуль да Беларусі ўжывалі толькі бізун.

Так, ад беларускіх уладаў патрабавалі, каб тыя пільнаваліся дэмакратычных нормаў, свабоды слова, сходаў, павызвалялі палітычных вязьняў. Але замест дэклярувалі вядомую дактрыну Балкенстайна: усё адно беларусы ў найбліжэйшай пэрспэктыве застануцца за межамі эўрапейскае сям'і. І калі Лукашэнка казаў, што ў Эўропе нас ніхто не чакае, ён казаў чыстую праўду.

Цяпер Захад, выглядае, зразумеў сваю памылку. Не выключаю, што ён прыслухаўся да меркаваньня Польшчы, якая пераконвала ў галоўным: калі Беларусь пойдзе на дэмакратызацыю, трэба замест бізуна не пустату дэманстраваць, а хоць якую матэрыяльную пэрспэктыву.

Замест пустаты Беларусі паказалі пернік. Стала зразумела, што прапаноўвае Эўропа наўзамен дэмакратызацыі.

Лукашэнка пакуль не адказаў. Часу было замала. Адказваць паводле сутнасьці будуць толькі тады, калі вызначыцца цана на газ для Беларусі.

Але сама пастаноўка пытаньня праз «пернік» патрапіла вельмі ў пару. Я заўсёды вызначаў формулу жывучасьці нашага кіроўнага рэжыму як «+2». То бок, праз два гады пасьля прыняцьця Расеі ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю рэжым абрынецца. У 2007 г. Расея

# дзьверы адчыняюцца

пы правоў чалавека.

«Народ Беларусі мусіць аднавіць свае неад’емныя правы безь якіх-колечы адтэрміновак. Беларускі народ мае права на свабоду выказваньня, на доступ да незалежнай інфармацыі, на стварэньне асацыяцыяў, на вынясеньне празрыстых і справядлівых прысудаў, — кажа Іен Боўг. — Таксама мусяць быць вызваленыя з турмаў усе палітзьняволеныя. Мы спадзяёмся, што народ Беларусі будзе разглядаць гэты дакумэнт, як прадвесьнік дэмакратычнай будучыні краіны».

Ён працытаваў словы камісара Фэрэра-Вальднэр: «Я спадзяюся, што ўрад Беларусі выкарыстае гэтую магчымасьць для правядзеньня неабходных у краіне рэформаў і пакончыць з ізаляцыяй свайго народу».

Прэс-сакратар Міністэрства замежных справаў Беларусі **Андрэй Папоў** у сераду пасьля абеду сказаў карэспандэнту «НН», што міністэрства працягвае азнаямляцца з прапановамі ЭЗ, якія ўчора ў Менску агучыў кіраўнік прадстаўніцтва Эўракамісіі ва Украіне і Беларусі Іен Боўг. МЗС пакуль ня мае ніякіх заяваў на гэты конт.

Раней старшыня камісіі міжнародных справаў палаты прадстаўнікоў **Вадзім Папоў** заявіў: «Гэта чарговая палітыка дыктату: вы гэта рабіце, а мы потым паглядзім. Ня будзе так ніколі. Сустрэчныя крокі павінны быць аднолькавыя і роўныя па часе. Усё гэта песьні з адной опэры, як і тыя падвойныя стандарты».

А радыкальны лукашэнкавец дэпутат **Сяргей Касьцян** сказаў у інтэрвію радыё «Свабода»: «Мы задаволім іхныя ўмовы тады, калі яны выканаюць патрабаваньні ... разагнаць Гааскі трыбунал, усіх судзьдзяў і аддаць саму гэтую Карлу дэль Понтэ пад суд за грубае парушэньне правоў чалавека ...»

**Мікола Бугай, Зьміцер Панкавец**

становіцца чальцом СГА — гэта ўжо зразумела. Адначасовае закрыцьцё эўрапейскіх рынкаў прывядзе нашу эканоміку да поўнага краху. Лукашэнка — разумны чалавек, ён мусіць гэта ўцяміць.

Але я ня стаў бы так радавацца. Па-першае, чалавек, які жыве толькі думкамі пра падаўжэньне асабістай улады, ня будзе сыты пернікамі. Па-другое, беларускае кіраўніцтва ўжо не ўпершыню падманвае даверлівую бабульку Эўропу. Вось і цяпер, вызваліўшы аднаго палітвязьня, Менск будзе патрабаваць скасаваць усе абмежаваньні адразу.

Тым ня менш, меркаваў і мяркую: калі А.Лукашэнка прызначыць спэцыяльнага ўпаўнаважанага ў перамовах з Эўрапейскім Зьвязам, ЭЗ мусіць пайсьці на перамовы з гэтым чалавекам.

Нават калі гэта будзе Віктар Шэйман.

## Камэнтар «Газэты выборчай»: Запускайма тэлеканалы

Піша аглядальнік гэтага ўплывовага польскага выданьня Вацлаў Радзівіновіч.

Нельга разьлічваць на тое, што Лукашэнка прыме прапановы, прэзэнтаваныя ў «дарожнай мапе» ЭЗ для Беларусі. Эўропа гатовая дапамагаць, інвэставаць у беларускую эканоміку вялікія грошы пры ўмовах, якія Лукашэнка ня можа выканаць.

Напрыклад, сумленнае, як хацеў бы Эўразьвяз, сьледзтва ў справе зьніклых бязь вестак апазыцыянэраў ... [не магло б адбыцца]. Цяжка таксама разьлічваць на тое, што сярод тых, хто сёньня кіруе Беларусьсю, знойдзецца нехта сьмелы. Нагэтулькі сьмелы, каб падумаць, што можна паспрабаваць пазбавіцца ад дыктатара, спадзеючыся на будучую дапамогу Эўропы. Гэта Ўладзімер Жырыноўскі можа дазволіць сабе паўтараць у Маскве, што «Беларусь можа вызваліць толькі снайпэр». У Менску страх паралізуе. Лукашэнка трымае сваіх людзей пад абцасам. Палацавага перавароту, калі толькі не дапаможа Масква, ня будзе. Аднак «дарожная мапа» вельмі важная для беларускага грамадзтва. І, насамрэч, можа яго ўскалыхнуць.

Толькі як зрабіць так, каб беларусы даведаліся, што Эўропа гатова ім даць, калі іх краіна пачне дэмакратызацыю? Беларускае тэлебачаньне, радыё, газэты зь вялікім накладам належаць дзяржаве і не напішуць пра «мапу» без указаньня Лукашэнкі. А радыёстанцыі для Беларусі, што мы з такім шумам адкрывалі ў Польшчы, маюць па-ранейшаму мізэрную зону пакрыцьця. Неабходна іх раскручваць, і як мага хутчэй.

Неабходна запускаць ужо абяцаныя беларусам тэлевізійныя каналы. Беларусам патрэбныя ня толькі нашыя словы. Таксама і ўчынкі — хаця б для таго, каб такія словы, якія нясе «мапа», маглі да іх дайсьці.

**Вольга Данішэвіч; Gazeta.pl**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

**Як адкажа беларуская адміністрацыя на прапановы Эўрасаюзу?**

| | |
|---|---|
| Прамаўчыць | 22 (25.0%) |
| Зробіць выгляд | 17 (19.3%) |
| К чорту пашле | 23 (26.1%) |
| Дачакаецца цэнаў на газ | 23 (26.1%) |
| Прыме | 3 (3.4%) |

Усяго за два дні прагаласавала: 88

# Нечакана вызвалены Мікола Астрэйка: «Як ва ўсіх зэкаў, у мяне баляць зубы»



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У пятніцу 17 лістапада са Шклоўскай калёніі быў вызвалены Мікола Астрэйка. Ён быў арыштаваны сёлета ў лютым, у жніўні суд Цэнтральнага раёну Менску прысудзіў яго да двух гадоў зьняволеньне. Астрэйка быў пакараны паводле артыкулу «Дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі». У панядзелак адно з сваіх першых інтэрвію пасьля вызваленьня Мікола даў «Нашай Ніве». Ён адразу папярэдзіў, што пакуль ня вельмі арыентуецца ў палітычных падзеях у краіне, таму папрасіў задаваць толькі асабістыя пытаньні.

**«Наша Ніва»: Мікола, як Вы перанесьлі гэтыя дзевяць месяцаў зьняволеньня?**

**Мікола Астрэйка:** Нельга сказаць, што мне было лёгка. Натуральна, што было вельмі і вельмі цяжка. Гэта тычылася абсалютна ўсяго. Спадзяюся, турма не адбілася значна на маім здароўі, але ўсё адно бліжэйшым часам зьвярнуся да лекараў па мэдагляд. У мяне хранічная хвароба сэрца. А таксама, як ва ўсіх зэкаў, у мяне баляць зубы, таму неабходна ісьці да стаматоляга.

**«НН»: Што для Вас было найцяжэйшым за гэты тэрмін?**

**МА:** Тое, што я быў далёка ад сваёй сям'і: бацькоў, жонкі, дачкі. Мне вельмі не хапала іх усіх. Цяпер пастараюся кампэнсаваць для ўсіх маю тую адсутнасьць.

**«НН»: Ці ведалі Вы папярэдне пра вызваленьне?**

**МА:** Не, абсалютна нічога ня ведаў. Даведаўся толькі ў той момант, калі 17 лістапада ў камэру прыйшоў дзяжурны і сказаў, каб я рыхтаваўся да вызваленьня. Да канца паверыў у тое, што гэта праўда, толькі пасьля таго, як аказаўся за брамамі калёніі. Я быў вельмі шчасьлівы ад такой нечаканасьці.

**«НН»: Калі пра вызваленьня даведаліся Вашыя родныя?**

**МА:** Толькі тады, калі ў пятніцу вечарам я зьявіўся ў менскай кватэры. Для ўсіх гэта быў прыемны шок. Думаю, ня толькі для мяне, але і для ўсіх сваякоў і родных. Такі вось прыемны сюрпрыз я ім падараваў.

**«НН»: Мікола, Вы толькі цяпер пабачылі сваю дачку?**

**МА:** Так. Мне вельмі прыемна ад гэтага, што я ўрэшце пабачыў сваю Лізу.

**«НН»: Чым цяпер мяркуеце заняцца?**

**МА:** Я яшчэ не да канца вольны чалавек. Буду працаваць на папраўчых працах і 15% заробку адлічаць на карысьць дзяржавы. У панядзелак уранку быў у РУУС Першамайскага раёну Менску, стаў на ўлік. Думаю, што бліжэйшымі днямі знайду для сябе нейкую працу. Галоўнае, што я буду жыць разам зь сям'ёй.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

## Алесь Бяляцкі пра вызваленьне Астрэйкі: Гэта не сыгнал

«Наша Ніва» зьвярнулася да праваабаронцы Алеся Бяляцкага, сёлетняга наміната на атрыманьне Нобэлеўскай прэміі міру, з пытаньнем: ці ня зьвязвае ён вызваленьне Міколы Астрэйкі з новай стратэгіяй Эўразьвязу датычна Беларусі?

«Калі такая сувязь ёсьць, то яна вельмі апасродкаваная. Эўразьвяз вылучыў цэлы шэраг рэкамэндацыяў, якія павінны выканаць беларускія ўлады, каб разьлічваць на выдзяленьне дапамогі. Вызваленьне палітвязьняў ёсьць толькі адным з пунктаў гэтай стратэгіі. Мне мала верыцца ў сувязь між гэтымі падзеямі. Хаця, у прынцыпе, гэта і магло быць пэўным сыгналам для Захаду, што беларускія ўлады гатовыя да дыялёгу. Мой скепсіс найперш датычыць таго, што перад вызваленьнем Скрабца і Астрэйкі ў турму кінулі Дашкевіча. Беларуская ўлада ня ёсьць пасьлядоўнай у сваіх учынках. Я ня веру ў паляпшэньне ці пагаршэньне адносінаў, кропкавыя мэтады Эўразьвязу. Найхутчэй, Эўразьвяз і афіцыйны Менск будуць захоўваць ранейшы статус-кво».

# У Фрунзэнскім раёне Менску масава зьніклі выбарцы

Палітоляг Алесь Лагвінец, які вылучыў сваю кандыдатуры на выбары ў дэпутаты Менскага гарсавету па Фрунзэнскім раёне, выявіў дзіўную акалічнасьць. З часу мінулай кампаніі па выбарах у мясцовыя саветы па Фрунзэнскім раёне колькасьць выбарцаў зьменшылася на 13 659 чалавек. Гэта пры ўсім тым, што Фрунзэнскі раён сталіцы найхутчэй, у параўнаньні зь іншымі менскімі раёнамі, забудоўваецца новымі дамамі. Ад 2003 г. у гэтым раёне здалі ў эксплюатацыю каля сотні шматпавярховых будынкаў.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Алесь Лагвінец: афіцыйная статыстыка зьменшыла колькасьць выбарцаў на 39 тысячаў у адным раёне.**

А.Лагвінец падлічыў, што за гэты пэрыяд у новыя будынкі магло быць заселена каля 22 тысячаў новых выбарцаў, гэта калі браць па мінімуме, два дарослыя чалавекі ў сям’і. Таксама пасьля 2003 г. да Фрунзэнскага раёну была далучаная вёска Кунцаўшчына, а гэта яшчэ дзьве з паловай тысячы выбарцаў. Такім чынам, у Фрунзэнскім раёне за гэты пэрыяд мусіла зьявіцца каля 25 тысячаў новых выбарцаў. З улікам гэтага атрымліваецца, што афіцыйная статыстыка зьменшыла колькасьць людзей, што могуць рэальна прыйсьці на выбарчыя ўчасткі, аж на 39 тысячаў.

А.Лагвінец зьвязвае гэтую камбінацыю з імкненьнем наўмысна занізіць колькасьць выбарцаў. А.Лагвінец прапануе разабрацца і прыцягнуць да адказнасьці асобаў, што спрычыніліся да падачы такіх зьвестак.

Такі зварот кандыдат у дэпутаты скіраваў у Цэнтравыбаркам, Менскі гарсавет, Пракуратуру, Адміністрацыю прэзыдэнта.

Найпершай рэакцыяй, зазначае А.Лагвінец, было тое, што зьвесткі пра колькасьць выбарцаў зьніклі з сайту газэты «Минский курьер».

20 лістапада А.Лагвінцу прыйшоў афіцыйны адказ з ЦВК за подпісам Лідзіі Ярмошынай. Нязьменная арганізатарка выбараў у Беларусі даслала яго на расейскай мове, хоць кандыдат у дэпутаты накіроўваў зварот па-беларуску. Яна піша: «Вы не падаяце фактаў неўключэньня выбарцаў у сьпісы. ...ЦВК... ня мае сьведчаньняў таго, што хто-небудзь з жыхароў Фрунзэнскага раёну быў пазбаўлены права ўдзельнічаць у выбарах. Паколькі Вы вылучаецеся кандыдатам у дэпутаты гарсавету, то зразумелае Вашае жаданьне трапіць на старонкі газэт, хаця б і з надуманым канфліктам. Аднак гэтыя варункі ня маюць нічога супольнага з інтарэсамі выбарцаў».

А.Лагвінец мяркуе, што ЦВК такім чынам ухіліўся ад адказу, ён таксама зьбіраецца зьвярнуцца па гэтым пытаньні ў суд.

**Зьміцер Панкавец**

# Кніга пра Плошчу




Новая кніга завецца «Верым! Можам! Пераможам!». Яе склалі праваабаронцы і журналісты, а зрэдагаваў пісьменьнік Барыс Пятровіч.

Першы разьдзел — «Верым!» — гэта інтэрвію і ўспаміны ўдзельнікаў Плошчы і тых, хто быў тады зьняволены.

У частцы «Можам!» пададзеныя ўспаміны журналістаў, што былі ўдзельнікамі падзеяў Вясны–2006.

Разьдзел «Пераможам» — камэнтары праваабаронцаў. «Таксама ёсьць пунктырная хроніка падзеяў ад моманту абвяшчэньня прэзыдэнцкіх выбараў, канца 2005 г., да разгону мітынгу 25 сакавіка, — кажа аўтар прадмовы Алесь Бяляцкі. — Хроніка ідзе праз усю кнігу». Праз усю кнігу ідзе і фатахроніка. Кніга была надрукаваная ў Беластоку і надоечы зьявілася ў Менску.

**ЯК**

# Расея адмяняе датэрміновае галасаваньне

Дума прыняла ў другім чытаньні папраўкі ў выбарчае заканадаўства. Пакет зьменаў у Выбарчы кодэкс у Думу яшчэ летам унесла партыя ўлады «Адзіная Расея», але тады з рэзкай крытыкай выступіў старшыня расейскага ЦВК Аляксандар Вешнякоў. Найбольш ён быў абураны магчымасьцю адраджэньня практыкі датэрміновага галасаваньня, якое неаднаразова крытыкавалі як адзін з асноўных інструмэнтаў фальсыфікацыі выбараў. Спачатку «адзінаросы» праігнаравалі прапановы Вешнякова, але ўрэшце былі вымушаныя да іх прыслухацца.

У Беларусі датэрміновае галасаваньне ўсяляк заахвочваецца, часам цэлыя прадпрыемствы прымушаюць галасаваць загадзя. У ім бярэ ўдзел 20—40% ад ліку тых, хто прыходзіць на выбары. Гэта сусьветны рэкорд. Назіральнікі мяркуюць, што датэраміновае галасаваньне дазваляе запалохваць выбарцаў і лёгка фальшаваць вынікі.

**Лявон Максюта**

# Пра лямпачкі і вялікую палітыку

Пабітая лямпачка ніколі ня будзе нагодай для рэвалюцыі. Некалькі думак наконт кампаніі мясцовых выбараў. Піша Віталь Сіліцкі.

Назіраючы за падрыхтоўкай да мясцовых выбараў, аналітык аднаго зь незалежных інтэрнэт-выданьняў параіў апазыцыі, што «лепей лямпачку ўкруціць, чым дарэмна гаварыць!», маючы на ўвазе бессэнсоўнасьць прасоўваньня буйных ідэяў і неабходнасьць сканцэнтравацца на сацыяльнай тэматыцы. Здаецца, усё правільна, але ўзгадалася вось што.

## Зыход у сацыялку

Я асабіста ведаю не адзін дзясятак апазыцыянэраў, якія спрабавалі і спрабуюцьісьці ў народ менавіта гэткімі сродкамі і лаяліся з тымі апазыцыянэрамі, хто імкнуўся змагацца толькі «за свабоду», як казаў Міхаіл Сяргеевіч, «у цэлым». Што выйшла? Тых, хто больш упарта за іншых круціць лямпачкі, хутчэй за ўсіх здымуць зь перадвыбарнай дыстанцыі. А потым паспрабуй даказаць, што лямпачку ўкруціў менавіта ты, а не, прынамсі, Паўлаў (а хутчэй нават вышэй). Чысьціня ў пад'ездах і ўтульнасьць у доме ў нас забясьпечваюцца, як кажа плякат на плошчы Бангалор, «хозяином, который все это создал». Сучасная палітыка, і ня важна, пра які мы рэжым кажам, — гэта рэч нашмат болей віртуальная, чым рэальная. Сэнс укручваньня лямпачак альбо якой пасадкі дрэваў перад Нацыянальнай бібліятэкай — не ў саміх лямпачках ці дрэвах, а ў тым, каб гэта паказалі па тэлевізары. А тое, што паказвае тэлевізар, залежыць ад таго, хто яго кантралюе.

Не, я не заклікаю да таго, каб рабіць добрыя справы толькі на паказуху. Проста часьцяком складваецца ўражаньне, што тыя, хто імкнецца пакрытыкаваць апанэнтаў улады (а крытыкаваць іх ёсьць шмат за што), проста імкнуцца засьвяціцца, што яны іх крытыкуюць, не жадаючы крытычна ацаніць свае ўласныя заўвагі і прапановы. Рабіць добрыя справы трэба заўжды і нават яшчэ больш тады, калі гэтыя справы іншым, даруйце за калямбур, да лямпачкі. Але гэта — не палітычная дзейнасьць, гэта максымум той від дзейнасьці, які можа прывесьці хіба што да лякальных міні-вынікаў, да якіх трэба прыкласьці звышвысілкі. Проста кажучы, зыход у сацыялку — гэта своеасаблівая форма народніцтва. Памятаеце, з урокаў гісторыі, былі такія разумныя дзядзькі ў царскай Расеі, якія спрабавалі дамагчыся пераменаў, зыходзячы ў вёскі і займаючыся дробнымі добрымі справамі? І ніхто ня скажа, добрыя былі дзядзькі і цёткі ці не. Толькі гналі іх у шыю ня толькі жандары, а самі сяляне. А праз пару дзесяцігодзьдзяў, калі «высьпелі» ўмовы, пайшлі тыя ж самыя сяляне за ідэйнымі адмарозкамі ўсіх колераў. Што з гэтага выйшла — вы ведаеце. Ратуй, Божа, Беларусь ад такіх вось «пераменаў», але, як вядома, гісторыя часам паўтараецца...

## Усюды пастка

Самыя лякальныя пытаньні заўжды маюць больш шырокі складнік. Просты прыклад зь лямпачкамі паказвае, што куды ні ткніся — для апазыцыі ўсюду пастаўленая пастка. Шляхам простага практыкаваньня фармальна канкурэнтных выбараў рэжым Лукашэнкі падтрымлівае пэўны грамадзкі інтарэс і чаканьні што да палітычных працэсаў. Гэта таксама забясьпечвае, у нейкай ступені, падтрыманьне попыту на збольшага маласэнсоўныя ў гэтых абставінах формы дзейнасьці.

Крытыкі апазыцыі часта проста імкнуцца засьвяціцца, не жадаючы крытычна ацаніць сваю ўласную крытыку.

Напрыклад, ад апазыцыі патрабуюць праграмаў, якіх яна ня зможа ажыцьцявіць (зразумела, што пытаньне пераменаў у Беларусі — ня сёньняшняга дня, а, скажам, у 2015 г. праграмы, што напісаныя ў 2006-м, безнадзейна састарэюць), альбо выкананьня нейкіх сацыяльных функцыяў (тыя ж самыя лямпачкі ў пад'ездах), зьдзяйсненьне якіх наўпрост вядзе да ліквідацыі пазасталых апазыцыйных актораў (лямпачка ў пад'ездзе — гэта ўсё ж такі подкуп выбаршчыка).

Па сутнасьці, мы маем справу з майстравіта сканструяваным суіснаваньнем супярэчлівых рэалій і ўяўленьняў, якія адно аднаму не адпавядаюць, а таксама практыкі і яе ўспрыманьня. Назваць рэчы сваімі імёнамі, заявіць, што палітыкі няма і пакуль ня будзе, для апазыцыі яшчэ даражэй — тады яна сама расьпісвалася б у тым, што яе існаваньне ня мае сэнсу.

## Перафарматаваньне электарату

Разьлічваць на нейкія зьмены ў рамках асобна ўзятых мясцовых выбараў — гэта глупства, зразумела. Праблема, аднак, ня толькі ў мясцовым фармаце, але і ў самой сацыяльнай тэматыцы, якая непазьбежна будзе дамінаваць, і якая, як ні круці, служыць дэмабілізацыі грамадзтва.

Палітычныя перамены ва ўмовах прэвэнтыўнага рэжыму і карпаратыўнай дзяржавы магчымыя толькі ў рэжыме выбуху — прычым ня толькі сацыяльнага, але і маральнага — той самай рэвалюцыі духу, якая адбылася ў сакавіку ў межах адной асобна ўзятай плошчы. Рацыянальныя людзі на абардаж не ідуць — яны прыстасоўваюцца да таго, што ёсьць, і рэалізуюць свае жыцьцёвыя памкненьні, у тым ліку і прагу да пэўнай ступені свабоды, у межах магчымага. На абардаж лезуць людзі, апантаныя верай і каштоўнасьцямі, тыя, хто гатовыя змагацца за Бога і Бацькаўшчыну.

Галадоўка пратэстанцкіх вернікаў толькі пацьвердзіла тэзу, якую аўтар гэтых радкоў прапанаваў быў пасьля сакавіцкіх падзеяў, — што небясьпечнымі для ўладаў на сёньняшні дзень могуць быць ня нейкія палітычныя ды сацыяльныя тэхналёгіі (іншымі словамі, праявы рацыянальнага дзеяньня і мысьленьня), а іррацыянальныя, самаахвярныя ўчынкі адзінак і групаў. У той жа час, абмежаваньні на падобныя ўчынкі накладваюцца далёка ня толькі жорсткасьцю рэпрэсіяў.

За апошнія гады ў грамадзтве адбылася рацыяналізацыя дачыненьняў паміж рэжымам і грамадзянамі. З аднаго боку, падтрымка ўлады і яе кіраўніка пазбавілася нейкай экзальтаванасьці яе прыхільнікаў, якая была характэрная ў іншы час.

Любая бабця сёньня можа лягічна і пасьлядоўна растлумачыць, чаму яна за Лукашэнку. А вось адказам тых, хто супраць, часьцяком гэтай лягічнасьці і пасьлядоўнасьці бракуе — таму што апанэнты хочаш ня хочаш, а вымушаныя прызнаваць, што ў Беларусі ў нейкім сэнсе, з жыцьцёвага гледзішча, ня ўсё так дрэнна (а калі ня ўсё дрэнна, то чаму быць супраць? Мы ж самі сабе на гэтае пытаньне адкажам, а што сказаць тым, хто не падзяляе нашай веры, каштоўнасьцяў і памкненьняў?)

Зь іншага боку, гэтая самая рацыяналізацыя прывяла да пашырэньня кола падтрымкі рэжыму ў грамадстве — проста таму, што пэўныя сацыяльныя групы, як той казаў, перафарматаваліся, увайшлі ў кантракт зь дзяржавай і вызначаюць свае адносіны выключна адпаведна ступені і пэрыядычнасьці аплаты гамбурскіх рахункаў.

## У чым сэнс дзейнасьці

Дадамо да гэтага, што на палітычны вынік у блізкай ужо выбарнай кампаніі разьлічваць таксама не даводзіцца. Рызыкую зрабіць прагноз, што мы неўзабаве пабачым давяршэньне стварэньня сыстэмы татальнага кантролю за выбарамі. Гэтая сыстэма трошкі прабуксавала ў 2003 г., калі некалькі дзясяткаў апазыцыянэраў усё ж такі здолелі дамагчыся дэпутацкіх мандатаў. Што іх саміх не зьберагло, а мабыць, толькі падкінула многім зь іх, напрыклад, Алесю Чыгіру з Бабруйску ці Юрасю Губарэвічу зь Белаазёрску, жыцьцёвых непрыемнасьцяў.

Шмат хто зь іх будзе ізноў змагацца, так бы мовіць, на пэрспэктыву — сэнс удзелу ў выбарах, незалежна ад стадыі, на якой удасца фінішаваць, шмат для каго будзе проста нагодай засьвяціцца сярод выбаршчыкаў, разьлічваючы на гіпатэтычную пару, калі выбары стануць больш зьмястоўныя, а мандаты — больш важкія. Але гэта, хутчэй, індывідуальныя стратэгіі, а не калектыўныя. На гэты раз, прагназую, усё будзе, як на праспэкце Незалежнасьці пасьля суботніку. Што ў такім разе рабіць апанэнтам улады на мясцовых выбарах, ды на выбарах наагул?

Збольшага, ізноў паўстае пытаньне, якое неаднаразова задавалася цягам гэтага году: а ў чым наагул сэнс палітычнай дзейнасьці ва ўмовах карпаратыўнай дзяржавы. Калісьці я выказаў меркаваньне, што такая дзейнасьць ня мае шмат сэнсу. Але ж...

## Агульнанацыянальныя лямпачкі

Калі мы настойваем на тым, што палітычная апазыцыя мусіць захавацца, то варта нешта паспрабаваць. Толькі рабіць гэта апазыцыі трэба, ня ўцягваючыся ў фармат гульні, запраграмаваны ўладамі, а спрабуючы гуляць у сваю гульню. Фактычна, гутарка ідзе пра тое, каб выкарыстаць кожную магчымасьць, нават кожную дату ў афіцыйным палітычным календары для рэалізацыі больш шырокіх мэтаў прыхільнікаў переменаў. Што тут маецца на ўвазе?

Па-першае, у апазыцыі сёньня катастрафічны недахоп эфэктыўных мясцовых палітыкаў. Ня «крэпкіх хазяйсьцьвеньнікаў» і не народнікаў, а тых, хто сапраўды ўмее разгарнуць мясцовыя, жыцьцёвыя, сацыяльныя праблемы ў палітычную роўніцу. Бо палітык — гэта ня той, хто ўкручвае лямпачкі (гэты чалавек завецца электрыкам), а той, хто здольны мабілізаваць грамаду, у пад'езьдзе ці ў вёсцы, на рашэньне сваіх уласных праблемаў, зрабіць штосьці карыснае ці дамагчыся праўды разам. Такія прыклады сярод нашай апазыцыі ёсьць.

> Перамены ва ўмовах прэвэнтыўнага рэжыму і карпаратыўнай дзяржавы магчымыя толькі ў рэжыме выбуху — прычым ня толькі сацыяльнага, але і маральнага — той самай рэвалюцыі духу.

Праблема ня толькі ў тым, што такіх людзей няшмат, але і ў тым, што на іх час ад часу, мякка кажучы, коса паглядаюць нават тэарэтычна свае. А шкада. Не называючы імёнаў (хто ведае, той ведае), я б грунтоўна параіў нашым палітычным лідэрам выкарыстаць гэтых людзей прынамсі для трэнінгаў патэнцыйных кандыдатаў. Досьведу, як зарганізаваць і змабілізаваць людзей на месцы, у нас мала, і дзеля гэтага ён яшчэ больш каштоўны.

Па-другое, мясцовая кампанія ёсьць проста добрай нагодай, для таго, каб павысіць пазнавальнасьць і палітыкаў з агульнанацыянальнымі амбіцыямі. Спадар Мілінкевіч падаў добры прыклад, вырашыўшы прыняць удзел у кампаніі не на карысьць сабе, а на карысьць іншых кандыдатаў. Усе астатнія лідэры мусяць зрабіць тое ж самае. Вас здымаюць з дыстанцыі — нават лепш. У вас разьвязаныя рукі працаваць на больш шырокую аўдыторыю.

Па-трэцяе, нават самой мясцовай кампаніі сьлед імкнуцца надаваць агульнанацыянальнае адценьне. Адзін з такіх кірункаў — інфармацыйная праца з выбаршчыкамі. Ёсьць нагода проста праінфармаваць пэўную частку грамадзтва аб тым, што насамрэч адбываецца ў краіне. Другі напрамак — больш шырокі.

Рацыяналізацыю стасункаў паміж дзяржавай і грамадзтвам, аб якой казалася вышэй, таксама можна паспрабаваць выкарыстаць як пэўную магчымасьць для выпрацоўкі і данясеньня пазытыўных пасланьняў.

Штодзённыя праблемы беларускіх выбаршчыкаў наўрад ці радыкальна адрозьніваюцца ў розных кутках Беларусі. А гэта значыць — і простым рэчам, такім, як тыя ж самыя лямпачкі, варта надаваць больш шырокае, агульнанацыянальнае адценьне.

## Зьбіраць камяні

Болей за тое, перад грамадзтвам паўстаюць абсалютна канкрэтныя пытаньні і праблемы, на якія палітыкі мусяць рэагаваць. Мясцовая кампанія — гэта проста нагода, каб данесьці наконт іх той самы пазытыўны мэсыдж. Напрыклад, што варта рабіць у эканоміцы ў сьвятле блізкага ўжо падвышэньня цэнаў на газ? Як вырашыць пытаньне імклівага ўзьлёту коштаў на жытло, якое становіцца галаўным болем для цэлага пакаленьня беларусаў? Ці як, напрыклад, скарыстаць з прапановаў аб нармалізацыі дачыненьняў, вылучаных нядаўна Беларусі Эўрасаюзам, і што гэтыя прапановы нясуць сярэднестатыстычнаму беларусу?

Вядома ж, кандыдаты будуць размаўляць і імправізаваць, але, каб гэтая імправізацыя была зьмястоўная і мела хоць нейкія доўгатэрміновыя наступствы, трэба, пакуль ня позна, адмовіцца ад бачаньня мясцовай кампаніі як проста сумы кампаніяў індывідуальных.

Надзвычай палітызаваць мясцовыя выбары было б таксама недарэчна. Палітычнага запалу, настрою, узбуджанасьці, якія былі падчас сакавіцкіх падзеяў, цягам наступных двух месяцаў ня будзе. Пабітая лямпачка ніколі ня будзе нагодай для рэвалюцыі. А калі так, то лепш выкарыстаць нагоду, каб паказаць, што апазыцыя можа і здолее ня толькі раскідваць камяні, але і зьбіраць іх. Урэшце, маленькая спроба ў гэтым напрамку будзе лепшай, чым выхад з чарговага афіцыйнага мерапрыемства з нулявым вынікам.

# Сяргей Скрабец: Не шкадую,


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Вызвалены на мінулым тыдні з турмы **Сяргей Скрабец** не выглядае стомленым. Скрабец даў па вызваленьні ўжо дзясяткі інтэрвію, і надалей нікому не зьбіраецца адмаўляць, бо «абяцаў гэта Казуліну».

## «Не магу расказаць усе падрабязнасьці, каб не шакаваць чытачоў»

**«Наша Ніва»: Давайце ўзгадаем, як Вас арыштоўвалі, бо пра гэта амаль ніхто ня ведае.**

**Сяргей Скрабец:** Яшчэ перад гэтым мае сябры патэлефанавалі мне ў Маскву і сказалі, што мяне арыштуюць, каб я не вяртаўся ў Беларусь. Я вярнуўся, і мяне насамрэч арыштавалі. У нядзелю зранку, калі я ішоў у басэйн. У мяне сапраўды тады ўзьнікла адчуваньне, што вось зараз пасадзяць, бо каля дому ў той дзень дзяжурылі міліцэйская і гэбэшная машыны. Я прайшоўся дзесьці з кілямэтар пешшу, і да мяне падышлі людзі ў цывільным, яны прапанавалі праехаць зь імі на паўгадзіны. Я тады яшчэ пасьмяяўся, што ў нас у краіне затрымліваюць на паўгадзіны, а пасьля выпускаюць толькі праз восем гадоў. Яны запіхалі мяне ў машыну і павезьлі. Дарога ішла праз лес, таму я нават спалохаўся, што могуць забіць.

**«НН»: Як падзеі разьвіваліся пасьля?**

**СС:** У Менск па мяне прыехалі нейкія людзі зь Берасьця. Адвезьлі мяне туды. Я адразу па дарозе аб’явіў галадоўку, каб асабліва не расслабляцца.

**«НН»: Адразу па арышце Вы аб’явілі галадоўку. Значыць, Вы бачыце сэнс ад палітычных галадовак, ці яны могуць прынесьці вынік толькі ва ўмовах зьняволеньня?**

**СС:** Так, канечне. Галадоўкі карысныя заўсёды. Гэта пратэст ня толькі ў фізычным, але і ў мэнтальным пляне. Ты можаш не адстаяць сваю праўду сёньня, але пасьля ўсё абавязкова вернецца да цябе. Такім радыкальным шляхам толькі і магчыма адстаяць свой пункт гледжаньня. У прынцыпе, галадоўка — гэта крок адчаю. Яна моцна б’е па нэрвовай сыстэме. Галадоўкі, вядома, кепска адбіліся на стане майго здароўя, бо пасьля трыццаці сутак у арганізьме пачынаюць адбывацца жахлівыя працэсы, пра якія я ня буду расказваць чытачам «НН», каб не шакаваць іх.

> Калі мне не заўжды пісалі зваротны адрас, то Казуліну пішуць. Страх у народу становіцца меншым.

## «Пры нашым ладзе твой голас могуць пачуць толькі з турмы»

**«НН»: Не было спакусы застацца за мяжой, ведаючы, што Вас арыштуюць?**

**СС:** Не, ні ў якім разе. Мне ўжо тады Швэцыя прапаноўвала палітычны прытулак, але я адмовіўся. Я сказаў, што не баюся турмы, а з краіны павінны ўцякаць сапраўдныя злачынцы, а ня я.

**«НН»: Што адчувае чалавек, які ведае пра сваю невінаватасьць, але знаходзіцца ў турме?**

**СС:** Я абсалютна нармальна сябе адчуваў, бо разумеў, што пры нашым ладзе твой голас могуць пачуць толькі з турмы. Я, натуральна, не ўзрадаваўся, бо турма — гэта

# што прайшоў праз турму

жорсткае выпрабаваньне. Але ўспрыняў гэта як знак лёсу, сёньня я не шкадую, што прайшоў праз турму.

**«НН»: Вам далі 2,5 году, хаця пракурор патрабаваў значна большага тэрміну. Як Вы ўспрынялі прысуд?**

**СС:** Калі скласьці ўсё, што патрабаваў пракурор, то выходзіла гадоў адзінаццаць. Адвакат таксама гаварыў, што менш чым пяць з паловай не дадуць. Прысуд усё ж быў значнай палёгкай, хаця я не чакаў такога выраку. Што датычыць злачынства, у якім мяне абвінавацілі, то праз два з паловай тыдні сканчаўся тэрмін дзеяньня гэтага злачынства.

## «Мэтады ГУЛАГу і гестапа»

**«НН»: Вы казалі, што ў турме давялося перажыць мноства абраз. У адным зь інтэрвію ўжылі такі выраз, як «мордай аб асфальт».**

**СС:** Натуральна, што гэта вобразны выраз, але, калі, напрыклад, ты пішаш запіску, што патрэбны доктар, праз трое сутак прыходзіць жанчынка і пытаецца: «Чаго хацеў?» Кажу, што баліць жывот, але мне даюць таблетку ад прастуды, ад якой мне няма ніякай карысьці. Альбо на этапе мне даводзілася гадзінамі на кукішках сядзець тварам у сьнег, у трыццаціградусны мароз. Нібыта ў ГУЛАГу ці ў гестапа. Свалачное стаўленьне. Цябе яшчэ нават не пасьпелі асудзіць, але ніхто ўжо ня лічыць цябе за чалавека, ты — скаціна. Кожная дробязь. Напрыклад, трэба абрэзаць пазногці, а нажніцаў няма. У кожную сэкунду цябе могуць абшукаць. Ідзеш па зоне, цябе кліча нейкі сэржант, якому заманілася цябе праверыць. Могуць у любы момант цалкам распрануць. Табе пастаянна кажуць, што ты — г...о. Праз адно і тое ж акенца ў камэры, «кармушку», падаюць і ежу, і мачу для аналізу. Дык пра што тады можна гаварыць?

**«НН»: Лісты з волі дапамагалі?**

**СС:** Так. На маю радасьць, іх было шмат, я сам не чакаў такога наплыву. Людзі пісалі. Што захапляюцца маёй мужнасьцю, казалі, каб я трымаўся. Лістоў было шмат, прычым ня толькі зь Беларусі, але і з Амэрыкі, Нямеччыны і г.д. Я не чакаў такога, ад разуменьня, што мяне помняць, было здорава. Казуліна цяпер папросту завалілі лістамі, і калі мне не заўжды пісалі зваротны адрас, то Казуліну пішуць, страх у народу становіцца меншым.

**«НН»: Знаходзячыся ў турме, Вы пайшлі на прэзыдэнцкія выбары. Дзеля чаго?**

**СС:** Я не лічу сябе палітыкам. Палітыкай я займаюся не таму, што я гэтага хачу, а таму, што гэта неабходна. У мяне ёсьць мара, каб некалі кінуць гэты занятак і засяродзіцца на сваіх справах, але ня ведаю, ці ўдасца мне гэта.

## «Нісьцюк — гэта здраднік»

**«НН»: Знаёмства з Казуліным адбылося ў турме?**

**СС:** Не, яшчэ за два месяцы да арышту мы абмяркоўвалі нашу стратэгію на прэзыдэнцкіх выбарах. Аднак першае наша знаёмства адбылося яшчэ ў 1998 годзе, я зьвяртаўся да Казуліна па сваіх бізнэсовых справах. У турме ж мы даведаліся адзін пра аднаго як чалавек пра чалавека. Выявілася, што ў нас вельмі падобныя погляды на жыцьцё, сьвет, палітыку. Больш цеснае знаёмства з Казуліным дало мне веру ў будучыню Беларусі. Цяпер я пераканаўся, што зьявілася сіла, якая можа нешта зьмяніць у краіне. Казулін, што самае галоўнае, ведае шляхі для вырашэньня сваіх задач. Мяне радуе, што зьявіўся такі чалавек.

**«НН»: Як увогуле трымаецца Казулін?**

**СС:** Добра трымаецца. Гэта сапраўдны стоік. Казулін сказаў, што ў гэтай галадоўцы ён гатовы зайсьці настолькі далёка, наколькі гэта магчыма. Па вызваленьні я зьвярнуўся да лідэраў палітычных партыяў, да Алеся Пашкевіча, Уладзімера Коласа з просьбай падтрымаць Казуліна, ягоную галадоўку і патрабаваньне, але, на жаль, ня ўсе згадзіліся на гэта. Яны баяцца згубіць нейкі там аўтарытэт, але ж яго яны згубілі і так сваімі ўнутрыкааліцыйнымі разборкамі, а ня тым, што яны падтрымаюць чалавека, які паміраe ў турме.

> Ты — скаціна. Кожная дробязь. Напрыклад, трэба абрэзаць пазногці, а нажніцаў няма.

**«НН»: Што думаюць зьняволеныя пра палітыку, пра Вашы з Казуліным галадоўкі?**

**СС:** Зьняволеныя звычайна кажуць, што мы за любы «кіпіш», апроч галадоўкі. Яны падобныя да людзей на волі: батарэі цёплыя, ежа ёсьць, значыць усё нармальна. Палітыка іх не цікавіць, як ні дзіўна, зьняволеныя жывуць сёньняшнім днём.

**«НН»: Што Казулін думае пра заявы Нісьцюка?**

**СС:** Ні я, ні Казулін не разумеем яго. Мы шмат размаўлялі з Казуліным па гэтым пытаньні. Казулін назваў здрадай прапановы Нісьцюка аб дыялёгу з уладай, якая пасадзіла на такі тэрмін лідэра партыі. Нісьцюк — гэта здраднік, які паверыў уладам, што яны дадуць яму месца ў гарсавеце, а ў 2008 годзе яму паабяцалі месца ў парлямэнце. Аднак Казулін пэўны, што Нісьцюка абдураць у любым выпадку.

## «Я памыляўся наконт ролі парлямэнту»

**«НН»: Як праз краты бачыліся палітычныя падзеі, што разгортваліся ў краіне?**

**СС:** Інфармацыя была, але яе было вельмі мала. У турме немагчыма было выпісваць «Нашу Ніву» ці «Народную волю», бо ўсё блякавалася. Была магчымасьць крыху паглядзець тэлевізар, але ўсе добра ведаюць, што такое Беларускае тэлебачаньне. Тое, што я бачыў на прыкладзе дзеяньняў Казуліна і Мілінкевіча, мне ў цэлым спадабалася. Яны годна змагаліся. Мяне больш расчаравала тое, што адбылося пасьля выбараў. Я найперш маю на ўвазе фактычнае прызнаньне ЭЗ трэцяга тэрміну Лукашэнкі, бо амаль ніхто не адмаўляецца супрацоўнічаць зь ім. Даверчыя лісты дасылаюць усе краіны ЭЗ.

**«НН»: Што Вы думаеце пра дзейнасьць дэмакратычнай кааліцыі сёньня?**

**СС:** Такая кааліцыя, якая ёсьць у апазыцыі цяпер, на карысьць толькі аднаму чалавеку, на месцы Лукашэнкі я б ужо ўсталяваў апазыцыі помнік, бо пры такой раскладцы ён будзе кіраваць яшчэ вельмі доўга.

**«НН»: Ці варта апазыцыі ісьці на мясцовыя выбары?**

**СС:** Я думаю, што трэба выкарыстоўваць дзеля палітычнай агітацыі, але ні ў якім выпадку не ісьці ў мясцовыя саветы, бо яны, як і парлямэнт, ня маюць абсалютна ніякай улады. Я, калі ішоў у парлямэнт, моцна памыляўся, думаючы, што ён мае нейкія паўнамоцтвы. Гэта проста фон, які надае легетымнасьці уладзе.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# Адваротны бок Месяца

Што нам рабіць з супрацоўнікамі спэцслужбаў? Піша Віталь Тарас.

### Сярэднявечча на пачатку стагодзьдзя

Брытанская крымінальная паліцыя — Скотлэнд-Ярд — распачала афіцыйнае сьледзтва ў справе атручэньня былога афіцэра ФСБ Аляксандра Ліцьвіненкі ў Лёндане. Па сустрэчы з сваім італьянскім інфарматарам у рэстарацыі, падчас якой Ліцьвіненка разьлічваў атрымаць важныя зьвесткі наконт забойства расейскай журналісткі Ганны Паліткоўскай, ён быў дастаўлены ў шпіталь зь цяжкім атручэньнем. У крыві Ліцьвіненкі выявілі талій і яшчэ адзін яд, склад і паходжаньне якога пакуль што невядомыя.

Ліцьвіненка вядомы тым, што ў свой час публічна заявіў аб замаху, які, нібыта, рыхтавала ягонае ведамства супраць Барыса Беразоўскага. На эміграцыі ў Англіі Ліцьвіненка выпусьціў кнігу, у якой піша, быццам да выбухаў у жылых дамах у Маскве пры канцы 1990-х таксама мела дачыненьне ФСБ.

Успамінаецца даўняя гісторыя з расейскім пісьменьнікам Уладзімерам Вайновічам, якая здарылася зь ім перад тым, як той вымушаны быў эміграваць на Захад. Паводле Вайновіча, супрацоўнік КГБ падчас гутаркі зь ім незаўважна для суразмоўцы падмяніў пачак цыгарэт. Пасьля гэтага пісьменьнік адчуў на сабе моцнае псыхатропнае ўзьдзеяньне нейкага рэчыва. Самае цікавае ў тае гісторыі, што знаёмыя Вайновіча адмаўляліся тады верыць яму й нават пасьміхаліся — лічылі, што ён стаў ахвярай уласнай параноі.

Успамінаецца й больш блізкая ў часе трагічная сьмерць Генадзя Карпенкі, аднаго зь лідэраў беларускай апазыцыі, чалавека, які карыстаўся высокім маральным аўтарытэтам. Лекары назвалі прычынаю сьмерці інсульт, які напаткаў Карпенку неўзабаве пасьля вячэры з знаёмымі журналістамі ў менскай рэстарацыі. Што стала непасрэднай прычынаю інсульту — невядома. Няма доказаў таго, што Карпенка мог быць атручаны. Тым больш няма доказаў датычнасьці да раптоўнай сьмерці апазыцыянэра спэцслужбаў. Як, дарэчы, няма доказаў, што да атручаньня Ліцьвіненкі ў Лёндане спрычынілася ФСБ.

Выпадкі з атручэньнем, як паказвае старадаўняя ды найноўшая гісторыя, цяжка раскрываць. Досыць згадаць выпадак зь Віктарам Юшчанкам, які быў атручаны падчас выбарчай кампаніі ва Украіне. Нягледзячы на тое, што Юшчанка стаў прэзыдэнтам, сьледзтва ў гэтай справе дагэтуль не дало вынікаў.

Відавочна, што ва ўсіх гэтых выпадках арганізатары замахаў не абавязкова ставілі на мэце забіць сваіх ахвяраў. Куды больш важная для іх задача — запалохаць. І ня толькі канкрэтных асобаў, але й грамадзтва ў цэлым.

### Нішто безь нічога не зьнікае

Гэтай задачы спэцслужбы, трэба прызнаць, пасьпяхова дасягнулі. У часе перабудовы быў папулярны такі вершык: *«У нас сейчас эпоха гласности, свобода слова нам дана. Но Комитет госбезопасности запомнит наши имена».* Тады гэты вершык выклікаў сьмех. А пасьля таго як з Лубянскай плошчы ў Маскве прыбралі помнік Дзяржынскаму, многім падалося, што разам зь ім адышла ў нябыт эпоха КГБ. Але ёсьць закон захаваньня рэчыва. Нішто бясьследна не зьнікае.

Яшчэ да таго, як копія таго помніка зьявілася ў Беларусі (а ўсьлед за ёй — і бюст Сталіна), перабудовачны вершык пачаў успрымацца не як гумар, але як сумнае прароцтва.

Зноў, як у даперабудовачны час, людзі пачынаюць размаўляць паміж сабой з аглядкай. Яшчэ адзін стары савецкі жарт перастаў быць сьмешным: «Ты чытаў сёньняшнія газэты?» — пытаецца чалавек па тэлефоне ў свайго знаёмага. «Ціха, ціха! Гэта не тэлефонная размова!» — у страху адказвае суразмоўца. Дзяржаўныя газэты, нават «СБ», дазваляецца толькі выпісваць ці купляць. У крайнім выпадку, іх можна чытаць. Але ні ўякім выпадку не цытаваць і не камэнтаваць, тым больш публічна. Інакш можна чакаць непрыемнасьцяў. Сытуацыю прадбачыў Оруэл у рамане «1984». (Больш за дваццаць гадоў мінула, як назва антыўтопіі састарэла, але сам зьмест раману — ні трохі!) У Міністэрстве праўды, разумеючы небясьпеку старых газэт, штодня цалкам перапісвалі іх, каб яны адпавядалі патрабаваньням моманту.

Аднак Оруэл недаацэньваў узровень цынізму ўлады ў будучыні. Ніхто ў дзяржаўнай прэсе не баіцца сёньня казаць адно, заўтра — процілеглае. Сёньня няважна, ці вераць людзі ў тое, што гавораць газэты і тэлебачаньне. Галоўнае — каб баяліся выказваць свае думкі, каб трымалі іх каля сябе. (Вось пішу гэтыя радкі, а ўнутраны рэдактар нашэптвае — лягчэй, лягчэй. Можа, ня трэба пісаць на гэтыя тэмы?)

Падпіска на выданьні, выкінутыя з каталёгаў «Белпошты», ператвараецца ў акт грамадзянскай мужнасьці. Таксама як і маўленьне па-беларуску ў публічным месцы.

### Аматары чапляць пагоны

Але паралізуе волю людзей і грамадзтва ня толькі страх і вера ва ўсёмагутнасьць органаў бясьпекі. Ёсьць яшчэ другі бок мэдаля — узаемны недавер людзей, усеагульная падазронасьць і гатовасьць верыць у горшае.

Калі ў якой-небудзь грамадзкай арганізацыі насьпявае раскол — няйначай да гэтага спрычыніліся спэцслужбы.

Не пасьпеў Беларускі ліцэй прыпыніць зь нейкіх прычынаў заняткі, як папаўзьлі чуткі: «да гэтага яўна спрычыніліся органы».

Пра каго толькі не даводзілася чуць ад самых аўтарытэтных людзей: вось той, без усялякага сумненьня, служыць у КГБ. У таго пад цывільнай вопраткай пагоны лейтэнанта, а ў таго — нават палкоўніка. Такое гавораць часьцей за ўсё пра тых, хто больш навідавоку. Называць імёны няма сэнсу — кожны, хто хоць чымсьці вылучаецца на шэрым фоне, можа быць завочна «ўганараваны» рознымі званьнямі. А чаму, калі гэты апазыцыянэр такі сьмелы, яго дагэтуль не пасадзілі? А чаму, калі газэта сапраўды беларуская, яе яшчэ не забаранілі? А чаму гэты піша крытычныя артыкулы пра ўладу — напэўна, яшчэ недзе атрымлівае зарплату.

Яскравы прыклад такой псыхалёгіі — пытаньне, зададзенае галоўнаму рэдактару «ARCHE» Валеру Булгакаву падчас он-лайнавай канфэрэнцыі на радыё «Свабода». Сэнс пытаньня зводзіўся да наступнага: ці не таму прыпынілі выхад вашага часопісу, што вы разьлічваеце атрымаць грант? Спэцслужбы ў гэтым выпадку ня згадваюцца, але яны як бы трымаюцца на ўвазе ў падтэксьце (хіба можна ў наш час атрымаць фінансавую падтрымку бяз згоды ці ведама ўладаў?)

Можна дапусьціць думку, што падобныя пытаньні ў часе он-лайнавых канфэрэнцыяў задаюць супрацоўнікі спэцслужбаў. Але й гэтае цьверджаньне з разраду спэкуляцыяў, якія толькі затуманьваюць сутнасьць справы.

Чаму так зацягнуўся працэс люстрацыі ў некаторых постсавецкіх краінах, напрыклад, у Латвіі? Не таму што КГБ захаваў там былую магутнасьць. Проста латвійскія палітыкі ня хочуць паўтараць чужыя памылкі. Усе, хто ў свой час трапляў у поле зроку органаў дзяржбясьпекі, заносіліся ў картатэку. Нават імёны тых, каго «апрацаваць» не ўдавалася, засталіся ў адпаведных архівах, пад адпаведнымі мянушкамі. Так здарылася ў Польшчы, дзе ў ролі агента ГБ апынуўся нават… Лех Валэнса. А цень супрацы з СБ упала ледзь не на ўсіх былых лідэраў апазыцыйнага прафсаюзу і дзеячаў КОС-КОР. Тыя ж, хто нічым асаблівым не вылучаўся ў падпольлі альбо ўвогуле трымаўся ўбаку ад нелегальнай дзейнасьці, аказаліся цяпер ледзьве не героямі нацыі.

## Адваротны бок Месяца

Гэта звычайны вынік усіх рэвалюцыяў, пладамі якой, як вядома, карыстаюцца зусім ня тыя, хто іх ажыцьцяўляе.



Нядаўна былі абнародаваныя дакумэнты, зь якіх вынікае, што ніхто іншы, як Берыя, распачаў пасьля сьмерці Сталіна шырокую амністыю. І тычылася яна не «крымінальнікаў», як запэўнівалі афіцыйныя гісторыкі, а непаўналетніх дзяцей, жанчын і старых — усяго ў 1953-м было вызвалена з ГУЛАГу амаль мільён чалавек.

Органы партыйнай і савецкай улады пачалі тады закідваць лістамі: што ж такое робіцца, чаму выпускаюць ворагаў народу? Абураліся тыя, каго прынята называць «простымі савецкімі людзьмі» — дворнікі, прыбіральшчыцы, дробныя службоўцы, настаўнікі ды хто заўгодна. Грамадзтва не было гатовае да рэабілітацыі ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў, і Берыя быў скінуты й абвешчаны… брытанскім шпіёнам. У што ахвотна паверылі масы. А вось у даклад Хрушчова на ХХ зьезьдзе доўга не хацелі верыць.

Гэты факт я згадаў таму, што і ў беларускім грамадзтве таксама хапае добраахвотных памочнікаў улады, заўсёды гатовых напісаць данос на знаёмых і нават на сваякоў. «Усёмагутнасьць» сакрэтных службаў заўсёды грунтавалася на тым, што яны зьвярталіся да цёмнага боку чалавечай душы. Гэты бок, як і ў Месяца, застаецца нябачным звычайнаму назіральніку.

Што з гэтага вынікае? Калі ствралася польская «Салідарнасьць», яе актывісты ведалі, што сярод іх ёсьць агенты спэцслужбаў. Але яны вырашылі ігнараваць гэты факт і дзейнічаць так, быццам усе аднолькава служаць супольнай справе. Яны паставілі на сьветлы бок чалавечай натуры. І ў канчатковым выніку выйгралі.

А што пладамі іх перамогі скарысталіся ўсе, у тым ліку й нягоднікі — ня страшна. Прынамсі, гэтым людзям давялося прыкідвацца прыстойнымі людзьмі і хаваць да пары ад усіх цёмны бок сваёй душы. А гэта ўжо няблага для пачатку.

# Левыя яднаюцца

Камуністы зьвязваюць зь яднаньнем вялікія надзеі. Сацыял-дэмакрат Анатоль Сідарэвіч крытыкуе сваіх аднапартыйцаў.

Неўзабаве можа паўстаць саюз левых партыяў. З такой прапановай выступілі прадстаўнікі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) і Партыі камуністаў Беларускай. У саюз мае ўвайсьці таксама Партыя жанчын «Надзея».

Паводле папярэдняй інфармацыі, новае ўтварэньне атрымае назву Саюз левых партый або Сацыял-дэмакратычны саюз. Галоўным органам саюзу будзе Канфэрэнцыя.

Са згоды ўсіх партыяў-заснавальніц да СДС на правах удзельніц або назіральніц могуць далучыцца іншыя сілы.

Алена Скрыган (ПКБ) тлумачыць: «Партыі-заснавальніцы саюзу дзейнічаюць у рамках адзінага дэмакратычнага руху і не нясуць яму ніякай пагрозы. Робіцца гэта для ўзгадненьня нашых пазыцыяў». На яе думку, левыя партыі Беларусі маюць шмат супольнага ў сваіх праграмах, але часта дзейнічаюць з розных пазыцыяў. «Будучы саюз дазволіць нам працаваць больш эфэктыўна, што будзе на карысьць дэмакратычнаму руху».

Адзін з бацькоў Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады Анатоль Сідарэвіч разаслаў аднапартыйцам з БСДП (Грамада) ліст з рэзкай крытыкай ідэі аб'яднаньня. На яго думку, недапушчальна «аддаваць сьцяг сацыял-дэмакратыі камуністам». Ён нагадвае: у праграме ПКБ няма адмовы ад спадчыны КПСС—КПБ і асуджэньня сталінскага тэрору. Між тым, у ім загінулі ў тым ліку гістарычныя лідэры беларускай сацыял-дэмакратыі Тарашкевіч, Луцкевіч, Смоліч.

Лідэр камуністаў Сяргей Калякін пасьлядоўна выступаў супраць дыктатуры і за саюз з усім спэктрам дэмакратычных партый.

Лідэр БСДП (Грамада) Аляксандар Казулін адбывае пакараньне ў турме, 34-ты дзень трымае там галадоўку пратэсту.

На мясцовых выбарах ПКБ выставіла каля 150-ці, а Грамада каля сотні кандыдатаў.

**Сямён Печанко**




РУСЛАН РАВЯКА

## У Баранавічах апаганілі бігборд пратэстантаў

21 лістапада ноччу на бігбордзе царквы «Збаўленьне» (хрысьціянаў веры эвангельскай) на скрыжаваньні вуліц Тэльмана і Першукевіча, чорнай фарбай напісалі «Не верь секте», закідалі камянямі і пляшкамі ад піва.

На думку Юр'я Ступакова, адміністратара бажніцы, прычына ў тым, што пратэстантаў называюць сэктамі па тэлебачаньні. «Нехта спэцыяльна напружвае сытуацыю». Кіраўніцтва царквы зьвярнулася ў міліцыю.

Тое самае некалькі тыдняў таму адбылося ў Менску з будынкам бунтоўнага «Новага жыцьця».

**МБ**

## У Мацкевіча ныркавая недастатковасьць

16 лістапада шпіталізавалі паліталяга Ўладзімера Мацкевіча, які 23 дні ўдзельнічаў у галадоўцы пратэсту царквы «Новае жыцьцё». Ён ляжыць у гастраэнтэралягічным аддзяленьні 1-й клінічнай больніцы Менску. Дыягназ — ныркавая недастатковасьць у выніку галадоўкі. У 6-й больніцы з дыягназам пнэўманія да гэтага часу знаходзіцца яшчэ адна ўдзельніца акцыі — Ірына Васілеўская.

**МР**

## Дочкі Казуліна абвесьцілі галадоўку

Вольга і Юлія Казуліны далучыліся да эстафэтнай галадоўкі салідарнасьці, якую ладзяць актывісты Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада). «Мы ва ўсім падтрымліваем нашага бацьку, які змагаецца за Беларусь», — кажа Юлія Казуліна.

Дзяўчаты галадаюць ад 18 лістапада. У эстафэтнай галадоўцы ўдзельнічала ўжо 30 актывістаў партыі.

Казулін у турме трымае галадоўку ад 20 кастрычніка. Ён дамагаецца разгляду беларускага пытаньня ў Радзе бясьпекі ААН.

**Паводле радыё «Свабода»**

## Журналіста «Каўказ-цэнтру» пасадзілі на 5 гадоў

Суд Масквы прысудзіў да пяці гадоў зьняволеньня рэдактара выданьня «Радикальная политика» і журналіста сайту «Каўказ-цэнтар» Барыса Стамахіна.

Стамахіна прызналі вінаватым у распальваньні міжнацыянальнай варожасьці і ў закліках да экстрэмізму ў публікацыях, прысьвечаных Чачэніі. Сваёй віны журналіст не прызнаў.

Больш за два гады Стамахін знаходзіўся ў вышуку і быў затрыманы сёлета ў сакавіку.

Стамахін вядомы публікацыямі з асуджэньнем вайны ў Чачэніі, расейскай нацыі як такой і імпэрскай палітыкі расейскіх уладаў. Ён аддаўна ўдзельнічаў у дысыдэнцкім руху Расеі.

**МБ; радыё «Свабода»**

# Што цікавага на «Лістападзе»

З 18 да 25 лістапада ў сталіцы адбываецца традыцыйны кінафэст «Лістапад». Хоць сапраўдным кінафэстам – з прадуманаю палітыкай і інтрыгай – яго назваць цяжка, асобныя фільмы паглядзець можна. Збольшага расейцы – і крыху Захаду.

Тутэйшыя стужкі «Я памятаю» Сяргея Сычова і «Спакуса» Маргарыты Касымавай можна сьмела можна прапусьціць. Расейская распрацоўка традыцыйных беларускіх тэмаў крыху цікавейшая.

Так, вайсковая стужка «Франц + Паліна», пастаўленая маладым рэжысэрам Міхаілам Сегала паводле сцэнару нашага клясыка Алеся Адамовіча, расказвае пра каханьне беларускай дзяўчыны і немца. Гэта скандал для «дзяржаўнае ідэалёгіі», але не для спонсара, кампаніі «Югра». Расейская акторка Сьвятлана Іванова гаворыць у фільме на бездакорнай беларускай мове. Праўда, відэакліпны досьвед рэжысэра тэме не адпавядае.

Прадстаўленая на фэсьце й карціна Валера Рубінчыка, слыннага рэжысэра «Дзікага паляваньня». З 90-х гадоў Рубінчык жыве ў Маскве. Але 21 лістапада ў кінатэатры «Цэнтральны» будзе існаці ягоная стужка «Нанкінскі пэйзаж».

З расейскіх фільмаў будуць карціны «Эйфарыя» Івана Вырыпаева, «Граючы ахвяру» Кірыла Сярэбранікава і «Мне не балюча» Аляксея Балабанава. Яны ўжо дэманстраваліся на беларускіх экранах.

У стужцы «Выспа» Паўла Лунгіна Пётра Мамонаў грае праваслаўнага сьвятара. Гэта карціна – пра пакаяньне й даравaньне. А фільм Аляксандра Велядзінскага «Жывы» – драма пра «віетнамскі сындром» у выкананьні братоў Чадавых. Абедзьве стужкі ужо закупленыя менскім кінапракатам. На фэсьце прэзэнтуецца й «Сувязь» – дэбют «тэлепляткаркі» Дуні Сьмірновай, але неўзабаве гэты фільм зьявіцца на малым экране.

Кіргіскі «Куфар продкаў» засьвяціўся ў фармаце «4х4», а вось эстонская дарожная стужка «Дастала» Пеэтара Сіма нам пакуль невядомая. Карціна – пра дачыненьні Эстоніі і вялікай Эўропы – вачыма недарэкі-вандроўніка.

Сярод найцікавейшых паказаў – «Марыя» амэрыканскага незалежніка Абэля Фэрары. А самы ўганараваны фільм «Вецер, што калыша верас» Кена Лоача – пра нацыянальна-вызваленчую барацьбу ірляндцаў. Ірляндыя падобная да Беларусі, і таму карціна найбольш пасуе нашым гледачам. Абодва фільмы ўжо сустракаюцца на лічбавых носьбітах.

З самых невядомых карцінаў – бэльгійска-мараканскае «Дзіця заснула» і японскае «Каб я мог пражыць іншае жыцьцё» Хірокі Хаяшы. Мо гэтыя стужкі стануцца сюрпрызам і для крытыка.

**Андрэй Расінскі**

# Літканфэрэнцыя на кватэры

17—18 лістапада ў полацкай майстэрні мастачкі Тацяны Козік адбылася літаратурная канфэрэнцыя, прысьвечаная сучаснаму моманту.

Арганізатарам выступіў паэт Алесь Аркуш. Раней на падобныя імпрэзы ў Полацку выдзяляліся цэлыя музэі. Цяпер ёсьць магчымасьць сабрацца толькі на прыватнай кватэры. Нехта з прысутных параўнаў гэты сход зь першым зьздам РСДРП.

Зьехаліся дваццаць творцаў з усёй Беларусі і госьця з Украіны — рэдактарка аўтарытэтнай украінскай «Критики» Багдана Маціяш. На канфэрэнцыю не прыехаў ніхто з кіраўніцтва Саюзу пісьменьнікаў. Ніхто з крытыкаў і пісьменьнікаў, што працуюць на дзяржаўных пасадах. Затое з Горадні дабраўся паэт Юрась Пацюпа. З Пружаншчыны – паэт (і пчаляр) Мікола Папека. Зь Менску — паэт Віктар Жыбуль і філёзаф Валянцін Акудовіч. Ён прачытаў эсэ на тэму крызысу ідэі літаратурнага часопісу. Серж Мінскевіч гаварыў пра беларускую дзіцячую літаратуру, а філёзаф Юрась Барысевіч — пра літаратуру ў Інтэрнэце.

Багдана Маціяш паінфармавала пра стан рэчаў у сучасным украінскім прыгожым пісьменстве. Усе даклады суправаджаліся актыўнымі дыскусіямі.

Прайшлі й прэзэнтацыі кніг Алеся Аркуша «Аскепкі вялікага малюнку», Альгерда Бахарэвіча «Ніякай літасьці Валянціне Г.», а таксама «Прыгоды Какоса-маракоса» Сержа Мінскевіча.

Аркуш абяцае ладзіць такія сустрэчы і надалей.

**Зьміцер Панкавец, Полацак**

# Парыж гаворыць – Беларусь!

Тыдзень у Парыжы доўжыўся фэст «Мы гаворым – Беларусь!», прымеркаваны да Дня беларускай салідарнасьці, што праводзіцца ў 16-ы дзень кожнага месяца.

Дні салідарнасці набылі статус буйных грамадзка-культурных мерапрыемстваў у розных краінах Эўропы. У варшаўскім канцэрце рок-музыкаў у падтрымку Беларусі браў удзел Анджэй Вайда. «NRM» выступіў на сцэне Швэдзкага каралеўскага тэатру. Праект «Музыкі свету ў падтрымку Беларусі» стартаваў з выступу ў Менску тройкі вядучых эўрапейскіх ды-джэяў. Прэзэнтацыя п’есаў беларускіх драматургаў у Нью-Ёрку прайшла пад патранажам Тома Стопарда.

Фэст «Мы гаворым – Беларусь!» знаёміў зь беларускай контракультурай парыжанаў.

Канцэрты Вайцюшкевіча й Камоцкай адбыліся з аншлягамі. Напярэдадні іх выступу паказваў свае фільмы Юры Хашчавацкі. Публіка, якая цалкам запоўніла залю «Дому Ўсходняй Эўропы», прагледзела «Звычайнага прэзыдэнта» і працоўны матэрыял новае стужкі «Плошча Каліноўскага». Пасьля паказу рэжысэра дзьве гадзіны закідвалі пытаньнямі.

На працягу ўсяго фэсту працавалі фотавыставы. Адна зь іх – фотамастака Джэфа Баніфацыно – уяўляла сабой партрэтамі вядучых дзеячаў нефармальнага мастацтва Беларусі.

Кульмінацыяй фэсту стаў паказ спэктаклю «Свабоднага тэатру» «Пакаленне Jeans» у тэатры Theatre-Studio (ён ёсьць рэзыдэнцыяй «Свабоднага тэатру» ў Заходняй Эўропе). На сцэне менавіта гэтага тэатру на вясну заплянаваныя першыя вялікія гастролі тэатру з паказам 20-ці спэктакляў.

Праект стаў магчымы дзякуючы энтузіязму Ганны Дыд’е, арганізатаркі. «Перавага беларускага праекту – у яго прастаце, — кажа яна. — Мінімум сродкаў і максымум вынаходлівасці».

**Паводле charter97.org**

# Валер Булгакаў: Куды завяла

Галоўны рэдактар часопісу «ARCHE» пра газ, выбары, Фідэля Кастра, Натальлю Пяткевіч, будучыню беларускай мовы, грамадзтва й інтэлектуалістыкі, і, вядома ж, пра сытуацыю вакол «ARCHE». Адказы на пытаньні чытачоў і слухачоў радыё «Свабода».

**Якую цану на газ Вы прагназуеце?**

Для лукашэнкаўскай Беларусі цэны на энэрганосьбіты — гэта галоўнае пытаньне. Прагназую доўгую фізычна і псыхалягічна затратную кампанію перамоваў, прычым беларускі рэжым будзе выкарыстоўваць аргумэнты самага рознага кшталту, каб толькі зьмяніць гэтыя кошты як найменш. Зь іншага падыходу, відавочна, што такіх цэнаў, як сёньня, беларускаму рэжыму дасягнуць ужо ніколі ня ўдасца. Мой прагноз, што ў наступным годзе цэны на газ для Беларусі будуць у калідоры паміж 80 і 130 далярамі ЗША за тысячу кубамэтраў.

**Чым Вы патлумачыце, што міністар абароны Беларусі фактычна дэзавуяваў пазыцыю Лукашэнкі адносна перагляду дамовы з Масквой аб утрыманьні на тэрыторыі Беларусі расейскіх ваенных базаў у выпадку росту цэнтаў на энэрганосьбіты?**

У палітыцы гэта называецца мэтадам бізуна і перніка, у крыміналістыцы — мэтадам добрага і злога сьледчага. Да таго ж, ад ідэі кроўнага братэрства з Расеяй беларускі рэжым проста так ня можа адмовіцца, хоць ідэі гэтай менш за 200 гадоў веку. Я не выключаю, што нават пасьля пераходу з Расеяй на радыкальна іншыя прынцыпы гаспадараньня гэтая ідэя проста так не памрэ. Як афіцыйная пазыцыя яна аджыве сваё толькі пасьля краху цяперашняга рэжыму.

**Лукашэнка ўжо пабіў рэкорд Мілошавіча (той кіраваў 11 гадоў). Ці здолее ён хаця б прыблізіцца да паказчыка Фідэля Кастра?**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Антон.**

Я не люблю такія пытаньні, бо яны не даюць беларускай супольнасьці аптымізму. Перадусім, ад Вас, Антон, і ад Вашых прыяцеляў залежыць, як доўга будзе кіраваць Лукашэнка. Ніякага дэтэрмінізму, што ён будзе кіраваць столькі ж, як Кастра, няма. Дзеля гэтага яму трэба стварыць такую перадумову, як цалкам адгарадзіць Беларусь ад вонкавага сьвету, ператварыць Беларусь не ў анкляў аўтарытарызму на эўрапейскім кантынэнце, а ў нейкую іншую геаграфічную адзінку, напрыклад, у востраў, якім ёсьць Куба.

## Мне падабаецца Пяткевіч

**Якія з сучасных беларускіх палітыкаў Вам падабаюцца?**

Вольга Карач і Алёна Валынец. Вельмі падабаецца таксама Натальля Пяткевіч.

**На Вашую думку, наколькі апраўданы ўдзел апазыцыі ў мясцовых выбарах? Ці ня ёсьць гэта гульнёй паводле сцэнара ўлады, які ўжо адпрацаваны фактычна да дасканаласьці і не прынясе ніякіх станоўчых вынікаў, калі не перахапіць ініцыятыву? І ці магчыма ў цяперашніх умовах тую ініцыятыву перахапіць?**

Удзел апазыцыі ў афіцыйных выбарчых мерапрыемствах апраўданы. Як паказалі сёлетнія прэзыдэнцкія выбары, нават пры поўным кантролі ўлады над вынікамі галасаваньня магчымыя неспадзяванкі. Выбары, адным словам, у Беларусі — гэта падзея, вынікі якой немагчыма прадугледзець на сто працэнтаў.

Цешыць таксама, што рэжыму патрэбныя выбары для таго, каб пацьвярджаць сваю палітычную легітымнасьць. Значыць, калі заўтра іх проста скасуюць, апазыцыя будзе мець магчымасьць паказацца людзям.

**На Вашу думку, чаго вартыя нашы палітычныя лідэры як палітыкі? Чаму год ад году мы бачым адзін і той жа сцэнар барацьбы: усе на выбары, выбарчыя камісіі ў руках улады, мітынг у дзень выбараў, АМОН, арышты актывістаў і выпадковых удзельнікаў, і потым усе дахаты? Што гэта, адсутнасьць палітычнага майстэрства ці нізкія арганізацыйныя якасьці апазыцыйных палітыкаў?**

Я бачу праблему палітычнага лідэрства інакш. У адрозьненьне ад суседніх дэмакратыяў, дзе рэгулярна адбываецца зьмена ўладнай эліты і ратацыя апазыцыйнага кіраўніцтва, у Беларусі палітычная прастора замарожаная. У нас касьнее ня толькі апарат улады, але і т.зв. сыстэма апазыцыі. Ёсьць апазыцыйныя палітычныя партыі, кіраўнікі якіх не мяняліся дзесяцігодзьдзямі.

У такой сытуацыі кіраўніцтва апазыцыйных сілаў сапраўды сутыкаецца зь небясьпекай ператварыцца ў палітычных кліентаў Захаду. Часам здаецца, што набілая аскоміну нерашучасьць лідэраў дэмсілаў тлумачыцца тым, што яны даўно ўжо граюць у спэктаклі, пастаўленым закулыснымі рэжысэрамі. У такой сытуацыі ініцыятыўнасьць непатрэбная — яна нават шкодная, таму што можа пабурыць арыгінальную задуму.

**Што нас чакае ў найбліжэйшы час? Што нам рабіць, каб нас не праглынула Расея?**

У найбліжэйшы час нас чакае незалежнасьць. Але ад народу нашага залежыць, якой яна будзе — змрочнай ці сьветлай. Пара ўжо ўсьвядоміць, што паміж Лукашэнкам і незалежнасьцю няма супярэчнасьці. Незалежная Беларусь — дасканалае пал-

# нас вялікая расейская культура

ітычнае цела для нашага дзейнага прэзыдэнта. Бязвольнае, апатычнае насельніцтва, якое ў нашай краіне пражывае, дае магчымасьць рабіць з сабой што заўгодна. Я думаю, бадай толькі калі ўлада, як той цар Ірад, пастанавіла б забіваць немаўлятаў адразу пасьля іх нараджэньня, нашы людзі схамянуліся б.

## Несвабодная краіна некультурных людзей

**Калі Вы ўжо выведзеце беларускія інтэлектуальныя прадукты з маргінэзу ў мэйнстрым? Бяз гэтага ў наш час «паўстаньня мас» яны ня маюць шанцаў на выжываньне.**

Інтэлектуальныя прадукты — гэта прадукты, прызначаныя для эліты. Я калісьці думаў, што ў такіх высокаразьвітых краінах, як ЗША ці Нямеччына, жывуць толькі вельмі інтэлігентныя людзі, якія чытаюць вельмі разумныя кнігі. Я памыляўся. Свабоднае грамадзтва — гэта ня тое грамадзтва, дзе інтэлектуальныя прадукты сталі ўсеагульным здабыткам. У такім грамадзтве кожны мае сваё. Большасьць выбірае кока-колу, парнафільмы і патрыманыя аўтамабілі, а ня Ніцшэ з Чэхавым. У такім грамадзтве няма прымусу чытаць інтэлектуалістыку. Свабоднае грамадзтва — гэта грамадзтва, дзе інтэлектуальныя прадукты існуюць як сацыяльная зьява, і ніхто не пярэчыць паляпшэньню іх якасьці.

Беларусь — несвабодная краіна малаадукаваных і малакультурных у масе сваёй людзей (хоць, натуральна, у грамадзтве функцыянуе адваротнае ўяўленьне). Так што інтэлектуалістыка тут будзе на маргінэзе. Вастрыня моманту палягае ня ў тым, ці стане яна масавай, а ў тым, ці стане яна якаснай. Выяўляецца, у нашай краіне — гэта палітычнае пытаньне.

## Не дзяржава, а людзі

**Як вы ацэньваеце пэрспэктывы беларускай мовы цяпер, калі ёсьць стандарт «Нашай Нівы», «Дзеяслова», іншых і школы?.. Ці не была галоўнай памылкай Вашага пакаленьня бабілёнская гардыня: спроба паправіць мову?**

«Наша Ніва», «Дзеяслоў» ці «ARCHE» не папраўляюць мову, а спрабуюць яе аджывіць. Розныя правапісныя мэтоды толькі падкрэсьліваюць той цяжкі стан, у якім яна апынулася. Наагул, што да беларускай мовы — я аптыміст. Адмаўленьне лукашэнкаўскім рэжымам за нашай мовай правоў, якія маюць у Эўропе нават мовы этнічных меншасьцяў, штурхае да супраціву тых, для каго нацыянальныя каштоўнасьці нешта значаць.

> Пэрспэктывы ў мовы зьявяцца, калі нацыя будзе змагацца за кожную клясу, школу, кніжку.

**Як Вы лічыце, ці ёсьць пэрспэктыва разьвіцьця Беларусі як беларускамоўнай дзяржавы?**

Пэрспэктывы ў беларускай мовы ў Беларусі зьявяцца, калі за іх нацыя будзе змагацца. Трэба біцца за кожную беларускую клясу, кніжку і школу. Я ўжо гаварыў, што нічога ў нашай моўнай сытуацыі фатальнага няма. На жаль, да апошняга часу наша інтэлігенцыя думала, што беларусізацыю і, напрыклад, стварэньне беларускамоўнага ўнівэрсытэту мусіць зьдзейсьніць беларуская дзяржава. Гэта ня так — статус беларускай мовы ў нашай краіне зьменіцца ад пасьлядоўнай і мэтаскіраванай дзейнасьці твар у твар, плячо ў плячо. Не дзяржава, а людзі могуць паламаць існы каляніяльны статус-кво.

## Нас дзесяць тысяч

**Разгортваньне справы з «ARCHE» выдае на тое, што Рэдакцыя наўмысна вырашыла «зьліць праект», каб звонку склалася ўражаньне, што сыход з дыстанцыі вымушаны, а не заканамерны.**

...і падкупіла міністра Русакевіча, каб ён прыпыніў наш часопіс. А пасьля суд, каб ён пакінуў Русакевічаў загад у сіле. Ваша сьцьвярджэньне паказвае, што параноікаў ня так мала ў беларускім адраджэнскім руху.

**Спадар Валер, колькі пастаянных чытачоў у «ARCHE» ў Беларусі і за мяжой? Ці існуюць якія-небудзь пляны па пашырэньні аўдыторыі?**

Мне цяжка сказаць, колькі ў нас чытачоў. Ад моманту пуску праекту сукупны наклад выданьня склаў больш за 40 тыс. асобнікаў. Але меркаваць, што нас прачытала 40 тыс. чалавек, бадай, няма падставаў. Сёлета наклад часопісу вагаўся ад 700 да 900 асобнікаў. Наклад нумару 5 прададзены зусім. Я ацэньваю, што кожны нумар трымала ў руках 3—5 чалавек. Калі далучыць яшчэ Інтэрнэт, выйдзе, што наша аўдыторыя складае ад 5 да 10 тыс. чалавек.

**Ці адновіць «ARCHE» выхад у папяровым выглядзе? Калі можна чакаць наступнага нумару?**

Тры папяровыя нумары выйдуць у апошнюю дэкаду сьнежня.

**Ці мусяць выданьні ў Польшчы ці Літве паведамляць у свае міністэрствы пра зьмену тэматыкі? І ці могуць іх міністэрствы ўзяць і забараніць зьмену тэматыкі?**

Сытуацыя зь зьменай тэматычнага профілю і з рэпрэсіямі з гэтай нагоды магчымая толькі пры жорсткім аўтарытарным рэжыме — я нядаўна быў у Лёндане на сустрэчы рэдактараў культурных часопісаў з усёй Эўропы, і мне амаль гадзіну давялося тлумачыць, за што ж нас пакаралі. У Эўропе такога няма — але ёсьць у Бірме і Зымбабвэ. Гэта, між іншым, паказвае нам месца, куды завяла нас вялікая расейская культура.

**Якую мастацкую прозу можна будзе пабачыць на старонках «ARCHE» бліжэйшым часам?**

У бліжэйшых нумарох з мастацкай літаратуры будзе і Яраслаў Гаўлічак, і Філіп Топал, і Сяргій Жадан, і Юры Андруховіч, і другія.

**Ці няма ў плянах вельмішаноўнай рэдакцыі «ARCHE» нейкім чынам палепшыць працу сайту часопісу?**

Магчыма, з наступнага году зьменіцца і наш сайт — відаць, у бок набліжэньня да звычайнага інтэрнэт-парталу.

**Што варта рабіць падпісчыкам, якія па віне міністра інфармацыі ня могуць чытаць друкаваную вэрсію часопісу? Якія пляны ў Рэдакцыі «ARCHE» на наступны год?**

Якой бы моцнай ні здавалася цяперашняя беларуская дзяржава, я думаю, што яна ня ў сілах зьнішчыць «ARCHE». Адзіны эфэктыўны мэтад закрыць часопіс — гэта фізычна зьнішчыць яго рэдакцыйны пэрсанал. Пакуль гэтага не адбудзецца, «ARCHE» будзе выходзіць. У Беларусі ці Літве, Польшчы ці Ўкраіне — хутка гэта ня будзе мець значэньня. Таму ў плянах нашых змагацца не за выжываньне, а за працьвітаньне «ARCHE».

**Паводле www.svaboda.org**



# Кардынал Сьвёнтак – першы беларускі кавалер Ордэну Ганаровага Легіёну пасьля Тызэнгаўзаў

Французскі прэзыдэнт Жак Шырак надаў кардыналу Казімеру Сьвёнтку званьне Камандора Ордэну Ганаровага Легіёну. Як гаворыцца ў прэс-рэлізе французскага пасольства, узнагарода нададзена «чалавеку, які ў вачох французаў увасабляе сабой гісторыю беларускага народу апошніх сямідзесяці гадоў».

Кардынал Свёнтак — адзіны беларус, якому было нададзена гэтае званьне з моманту абвяшчэньня дзяржаўнага сувэрэнітэту. Да кардынала апошнімі з нашых суайчыньнікаў Крыжам Ганаровага Легіёну ўзнагародвалі Ігнацыя Тызэнгаўза і ягоны сын Канстанціна, палкоўнікаў войска Вялікага Княства Літоўскага.

Урачыстая цырымонія ўзнагароджаньня адбудзецца 23 лістапада ў рэзыдэнцыі пасла Францыі ў вёсцы Зацань.

**СП**

**Гістарычная даведка**

Ордэн Ганаровага Легіёну – найвышэйшая ўзнагарода Францыі. Заснаваны Напалеонам у 1802 годзе, ён прыйшоў на зьмену каралеўскаму ордэну Сьвятога Людовіка. Сярод яго кавалераў — Ёзаф Ратцынгер, сёньняшні Папа Бэнэдыкт XVI, Гюстаў Эйфэль, Мсьціслаў Растраповіч, Мая Плісецкая. Ордэн мае пяць ступеняў – кавалер, афіцэр, камандор, вышэйшы афіцэр і кавалер Вялікага крыжа, які прызначаецца за выключныя заслугі.

# У войску дзьве трагедыі

На Гарадзеншчыне на вучэньнях загінулі двое салдатаў, яшчэ двое пакалечыліся. Гэта другі за гэтую восень трагічны выпадак у нашым войску: у верасьні ў адной зь берасьцейскіх частак салдату выбухам адарвала руку.

Трагедыя здарылася 16 лістапада на палігоне Гожа пад Горадняй. На плянавых стрэльбах 6-й гвардзейскай асобнай мэханізаванай брыгады адбыўся выбух снараду. У выніку загінулі 20-гадовы шараговец Аляксандар Кулеша і 21-гадовы сяржант Віталь Ляўкевіч. Прапаршчык М.Касянік і старэйшы лейтэнант Т.Шарадок атрымалі раненьні і цяпер ляжаць у рэанімацыі ў цяжкім стане.

У верасьні Берасьцейская міжгарнізонная пракуратура таксама разглядала выпадак выбуху, у выніку якога 20-гадоваму салдату адарвала руку, яшчэ двух яго аднагодкаў параніла. Гэта здарылася 20 верасьня ў 38-й асобнай мабільнай брыгадзе.

**Сямён Печанко**

# Шатляндзкія фаны патрабуюць адстаўкі Малафеева

Заўзятары шатляндзкага «Хартсу» патрабуюць адстаўкі прэзыдэнта клюбу літоўскага бізнэсоўца Ўладзімера Раманава, які таксама валодае літоўскім «Каўнасам» і менскім МТЗ-РІПА, і выканаўцы абавязкаў трэнэра «Хартсу» Эдуарда Малафеева (**на фота**).



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

У 15-м туры чэмпіянату Шатляндыі «Хартс» мінімальна саступіў на сваім полі «Рэйнджэрз» і апусьціўся ў турнірнай табліцы на 5-е месца.

Капітан «Хартсу» і яшчэ некалькі гульцоў старэйшага пакаленьня (апошнім часам у складзе «Хартсу» зьявілася сямёра літоўскіх футбалістаў) выступілі супраць палітыкі клюбнага кіраўніцтва. Да гульцоў далучыліся заўзятары.

Летась «Хартс» заняў другое месца ў чэмпіянаце Шатляндыі, саступіўшы толькі «Сэлтыку», але ня трапіў у групавы турнір Лігі чэмпіёнаў, саступіўшы грэцкаму АЕКу.

Сам Малафееў заявіў, што з радасьцю вярнуўся б працаваць у Беларусь, але яго не адпускае клюбнае кіраўніцтва.

**Зьміцер Панкавец**

# Ад прэзыдэнцкай адміністрацыі адганяюць варон

Сталічных варонаў прымусілі зьмяніць месца жыхарства. Дзякуючы экспэрымэнтальным біяакустычным ды ўльтрагукавым прыстасаваньням, вароны з ваколіцаў Адміністрацыі прэзыдэнта пераляцелі ў іншыя месцы.

На думку арнітоляга Аляксандра Вінчэўскага, старшыні грамадзкай арганізацыі «Ахова птушак Беларусі», зганяць варон з наседжаных месцаў – ня значыць вырашыць праблему чысьціні гораду. «Наяўнасьць вялікай колькасьці варон у горадзе – індыкатар чысьціні гораду. Як тэрмомэтар. На Захадзе гарадзкія сьметнікі апрацоўваюць адмысловай пенай, пасьля гэтага ўжо птушкі не ядуць гэтага – значыцца, у пошуках ежы будуць шукаць іншыя месцы. А ў нас іх папросту сагналі з наседжаных месцаў, а сьмецьця, дзе яны шукаюць ежы, засталося столькі ж. Біяакустычныя сыстэмы зьнішчаюць сымптомы, а не іхную прычыну. Зь іншага боку, гэта робяць без забойства».

**Паводле радыё «Свабода»**

# На Шуміліншчыне падпалілі вёску

16 лістапада а восьмай ранку на пульт МНС у Шуміліне паступіў сыгнал: гарыць вёска Скаціца. Тэлефанавалі з Казьянаў, ад якіх да Скаціцы 5 км. У самой Скаціцы выклікаць пажарных няма каму. Гэтая вёска вымірае. Сталых жыхароў у ёй не засталося. Дзясятак хат выкарыстоўваюцца пад лецішчы. Калі выратавальнікі прыехалі, палалі дзьве хаты, ад адной да другой мэтраў дзьвесьце адлегласьці. Каб ня пільнасьць жыхаркі Казьянаў, зьнелюдзелая вёска магла б выгарэць дашчэнту.

Мусіць, прычынай быў падпал. Каму і нашто было гэта трэба, разьбіраюцца.

**Паводле «Народных навінаў Віцебску»**

# «How to make revolution in Belarus», альбо падарунак для мытнікаў

Актывіст Сяргей Сямёнаў падрыхтаваў спэцыфічны падарунак для супрацоўнікаў мытнай службы. Улічваючы пастаянную цікавасьць да ягонай асобы падчас перасячэньня мяжы, маладзён узяў з сабой CD з надпісам «How to make revolution in Belarus», на якім была запісана інфармацыя эратычнага зьместу.

На днях Сяржук перасякаў украінска-беларускую мяжу. Яго асабістыя рэчы пільна надглядалі мытнікі. Яны аж схапіліся за кружэлку з надпісам «Як рабіць рэвалюцыю». У выніку быў складзе-

ны пратакол і дыск канфіскавалі. «Спадзяюся, азнаёміўшыся са зьместам дыску, – адзначыў маладзён, – хтось з супрацоўнікаў мытнага пункту ўсьвядоміць абсурднасьць дадзенай сытуацыі».

Глядзі, Сярожа, каб табе толькі распаўсюд эротыкі не прычапілі.

**МБ; Паводле hart.3dway.org**

## Беларусы — у фінале Кантынэнтальнага кубку

Трыюмфальна для хакейнага клюбу «Юнацтва» скончыўся паўфінальны турнір розыгрышу Кантынэнтальнага кубку 17—19 лістапада у менскім Палацы спорту.

У Менск прыехалі кіеўскі «Сокал», аўстрыйскі «Рэд Бул» і казахскі «Казахмыс». Галоўным прэтэндэнтам на выхад у фінал былі менскае «Юнацтва» і «Казахмыс». Акурат таму матч гэтых каманд быў прызначаны на апошні дзень турніру, нядзелю.

Напярэдадні «Казахмыс» меў перавагу над «Юнацтвам» па колькасьці шайбаў: у выпадку нічыі ў фінал выйшлі б казахі.

Палац спорту быў запоўнены. Гульня спраўдзіла чаканьні. «Юнацтву» прыйшлося адыгрываць дзьве шайбы, і зрабілі гэта хлопцы літаральна ў апошнія сэкунды матчу.

На овэртайм казахі выйшлі дэмаралізаванымі. Прайшло ўсяго 50 сэкундаў, як Ігар Андрушчанка прынёс «Юнацтву» перамогу і адначасова пуцёўку на фінальны турнір Кантынэнтальнага кубку, які 5--7 студзеня прыме вугорскі Сэкешфэхервар.

Акрамя нашых, там гуляюць вугорская «Альба Волян», фінскі «Ільвэс», расейскі «Авангард». Беларусы гулялі ў фінале такога турніру ў 2004-м. Тады «Гомель» атрымаў срэбныя мэдалі.

**Зьміцер Панкавец**

## БеСТ будзе выкарыстоўваць вышкі МТС і Velcom

Супольнае выкарыстаньне вежаў сувязі пачнецца ў 2007 г. «Гэта выгадна ўсім , бо дазваляе эканоміць на будаўніцтве вежаў, кошт якіх складае 40 тыс. даляраў», – тлумачаць у дзяржаўнай кампаніі.

Незразумела, якую выгаду ад пагадненьняў атрымаюць лідэры сотавага рынку. Відаць, гешэфту паспрыяў адміністратыўны рэсурс. Бо як патлумачыць рэзкае зьніжэньне цэнаў на паслугі «БеСТу».

**Bybanner.com**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Вікторыя Махота зь Менску будзе прадстаўляць Беларусь у фінале конкурсу «Форд супермадэль сьвету», які пройдзе ў Нью-Ёрку. Летась супэрмадэльлю сьвету агенцтва «Форд Модэлс» стала беларуска Кацярына Даманькова. На здымку: Даманькова (справа) віншуе Вікторыю Махоту.**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Божая ніва

Штопятніцы тысячы беларусаў атрымліваюць праз пошту вялікую капэрту землянога колеру, якой чакаюць цэлы тыдзень. Адкладаюць усе свае справы, бліскучым лязом, быццам плугам, або проста прагнымі пальцамі ўспорваюць пакунак, за ім распалавіньваюць газэтныя палі, засеяныя роўнымі баразнамі радкоў, — і рупліва, да апошняе літаркі, перабіраюць ворыва.

Нашу Ніву.

Гэтаксама штопятніцы тысячы беларусаў вылучаюць час для Нацыянальнага посту й малітвы за Беларусь — каб прасіць у Бога збаўленьня й дабраслаўленьня для гэтага народу й гэтае зямлі.

Супадзеньне зусім не выпадковае. Надрукаваныя ў адным з апошніх нумароў «НН» зьвесткі пра рэлігійнасьць і канфэсійную прыналежнасьць чытачоў вельмі паказальна характарызуюць нашаніўскі фэномэн. Толькі каля 1/10 зь іх — няверуючыя. Першую беларускую газэту чытаюць тыя, хто *верыць*.

У Першым пасланьні да Карынцянаў ёсьць такі зварот да вернікаў: «Мы — супрацоўнікі ў Бога, а вы — Божая ніва» (І Карынц 3:9). Божая ніва — хрысьціяне гэтай зямлі. «Каласы пад сярпом Тваім» — амаль паводле Караткевіча.

Для Беларусі «Наша Ніва» была й застаецца той самай эвангельскай нівай, дзе зерне «ўпала на добрую зямлю і дало плод, што ўзышоў і вырас, і ўрадзіла тое трыццаць, тое шэсьцьдзесят, а тое сто» (Марка 4:8). Стогадовае поле сьвядомасьці, поле памяці, поле спадчыны дае найбагацейшы валавы збор беларушчыны. А стагодзьдзе таму «Першая беларуская газэта з рысункамі» адна ўрабляла сямімільённую вёску, падымала, быццам цаліну, стоеную ў стагодзьдзях прыгнёту ды акупацыяў беларускасьць, сеяла, зжынала, малаціла, веяла, малола, выпякала — і раздавала тыя пяць хлябоў па ўсёй згаладалай краіне.

Асноўная прычына посьпеху «Нашай Нівы» з таго часу не зьмянілася — укарэненасьць у народзе. Прынцып тут просты: кожнаму народу Бог даў магчымасьць расьці, квітнець і прыносіць плён. Калі супрацоўнікі Бога будуць працаваць як сьлед на гэтай Божай ніве — абуджаны народ дасьць ураджай, сувымерны з маштабамі краіны.

«Нашу Ніву» часта называюць *элітнай*. Справядліва: практычна ўсе «валадары дамоў»

## ХРОНІКА

### 15 лістапада: суд над ПКБ адклалі

Маскоўскі суд Берасьця аштрафаваў за Дзень салідарнасьці, наладжаны ў кастрычніку, **Андрэя Шарэнду** (50 базавых велічыняў), **Анатоля Ермака** (30 б.в.), **Ганну Берсан**, **Юр'я Боўбеля**, **Кацярыну Бельскую** (па 20 б.в. кожнага).

Вярхоўны суд адклаў разгляд пазову Мін'юсту да **ПКБ** наконт прыпыненьня дзейнасьці партыі — да заканчэньня выбараў у мясцовыя саветы.

Гандлёвая фірма «Эўраопт» звольніла з працы спэцыяліста па рэкляме і мэрчэндайзінгу, актывіста БСДП(Г) **Максіма Касьцевіча**, калі ён вырашыў балятавацца ў дэпутаты.

### 16 лістапада: Дзень салідарнасьці

Суд Цэнтральнага раёну Менску не задаволіў пазоў **ПКБ** пра абарону дзелавой рэпутацыі, скіраваны на адрас КПБ і яе газэты «Коммунист Белоруссии. Мы и время» за артыкул пра «ўзьяднаўчы» зьезд партыі. Суд пастанавіў, што адбываецца палітычная дыскусія.

У Менску на вакзале перад пачаткам акцыі «Дзень салідарнасьці» затрыманыя маладзевыя актывісты **Зьміцер Хведарук**, **Сяржук Гумілін**, **Надзея Клімовіч**, **Крысьціна Шацікава**, **Вольга Жураўлёва**. Пазьней тамсама затрымалі 9 удзельнікаў акцыі салідарнасьці і фотакарэспандэнтаў **Юлію Дарашкевіч**, **Сяргея Грыца**, **Васіля Фядосенку** і **Аляксея Мацюшкова**. Журналістаў пасьля праверкі дакумэнтаў адпусьцілі. На затрыманага **Аляксандра Сьцепаненку** пагражалі скласьці пратакол пра «супраціў работнікам міліцыі», калі ён не аддасьць лічбавы фотаапарат з здымкамі затрыманьня.

Каля станцыі мэтро «Маскоўская» затрымалі **Ўсевалада Шашарына**, **Кірылу Шымановіча**, **Надзею Клімовіч**, **Сяргея Гумінскага**, **Натальлю Харытанюк**, **Уладзімера Маляўку**, **Віялету Мікульчык**.

У Горадні на акцыі салідарнасьці затрымалі музыку **Станіслава Пачобута**: наступнага дня яго асудзілі на 5 сутак арышту. На знак пратэсту актывіст абвясьціў галадоўку.

Падчас Дня салідарнасьці ў Віцебску затрымалі актывіста ПБНФ **Кастуся Смолікава**, журналіста радыё «Рацыя» **Вадзіма Баршчэўскага** і праваабаронцу **Леаніда Сьвеціка**, у якіх не было пры сабе пашпартоў.

У Гомелі на акцыі салідарнасьці былі затрыманыя каля 10 чалавек, у тым ліку звычайныя мінакі.

Аўтамабіль **Анджэя Лісоўскага** апячаталі: гарадзенскі актывіст Саюзу палякаў у Беларусі застаецца падазраваным у справе пра кантрабанду наркотыкаў.

У Салігорску «за зьдзек зь дзяржаўнай сымболікі» аштрафавалі бацькоў маладзевых актывістаў **Івана Шылы**, **Зьмітра Бараноўскага** й **Андрэя Тычыны**. Кожны штраф склаў 3 б.в.

Сябра грамадзянскай ініцыятывы «Трэці шлях» **Паўла Марозава** выклікалі ў менскую пракуратуру й азнаёмілі з пастановай сьледзтва: ён стаў падазраваным у паклёпе на Лукашэнку за мультфільмы палітычнага зьместу.

У Магілёве суд прызнаў законнымі дзеяньні міліцыянтаў, якія ўлетку затрымалі **мясцовых дэмакратычных актывістаў** за нашэньне саколак з надпісам **«Надакучыў»**.

Міліцыя адмовілася распачынаць крымінальную справу па факце апаганьваньня царквы «Новае жыцьцё».

### 18 лістапада

У добраахвотнага распаўсюдніка «НН» **Уладзімера Лазарчыка** міліцыянты канфіскавалі 48 экзэмпляраў газэты. З Лазарчыка было ўзятае тлумачэньне. Газэты, пасьля падачы рэгістрацыйных дакумэнтаў «НН», міліцыянты вярнулі.

### 20 лістапада

Праваабаронца **Ўладзімер Вялічкін** атрымаў зь Берасьцейскага гарвыканкаму адмову на заяўку аб правядзеньні пікетаў для збору подпісаў: ён вылучаецца кандыдатам у дэпутаты.

**АШ**

і «інжынэры чалавечых душаў» нацыянальнага руху чыталі «НН» тады і чытаюць цяпер. Але «Наша Ніва» заўжды была гэткай жа народнай, як і поле, засеянае збожжам. Унікум «НН» — гэта унікум *народнае журналістыкі*, асноўная місія якой — распавесьці аб самім сабе як аб народзе. Такім чынам, «Наша Ніва» — зьява ня столькі мэдыяпрасторы, колькі гісторыі. У іншых народаў ролю цэнтру нацыянальнай крышталізацыі выконвалі вялікія вайскаводы, крывавыя рэвалюцыі, патрыятычныя дыктатуры, а вось у беларусаў — незалежная газэта.

Згадваю «Нашу Ніву» штораз, калі атрымліваю ў лістах салідарнасьці невялікія выданьні тае народнае журналістыкі — «Наш Смаргонскі край», шаркаўшчынскую «Бацькаўшчыну», аркуш з Залесься «Крок» або «Баявы лісток вёскі Дуброва Парыцкага павету». Мне мрояцца тысячы й тысячы беларускіх вясковых і мястэчковых газэтаў, якім, паверце, ёсьць што распавесьці гораду і сьвету. Насьледаваньні «Нашай Ніве», пра якія напісана: «Узарэце сабе *новыя нівы* і ня сейце сярод церня» (Ерамії 4:3).

«Наша Ніва» — кульмінацыя беларускага культурніцтва. Кніжныя бачыны, разгорнутыя ў папяровыя палеткі, ахапляюць літаратуру, фальклёр, быт, мастацтва, палітыку — ды ўвогуле ўсё жыцьцё. Гранёны нашаніўскі шрыфт, у якім угадваюцца дробачкі з эўфрасіньнеўскіх літараў і поўнае зерне Капіевіча, зьбірае ў адно ўсе знакі 1000-годзьдзя беларускасьці, каб засяваць *Нашу Ніву* зноў і зноў.

Як раней, так і цяпер «наша старонка» ператвараецца ў краіну на старонках «Нашае Нівы». «НН» была праграмаю для абвяшчэньня БНР і беларусізацыі 20-х — і пераняла ролю лідэра Адраджэньня на мяжы тысячагодзьдзяў.

У выніку 100-гадовая «Наша Ніва» сталася для Беларусі гэткім жа нацыянальным сымбалем, як *The Times* для Ангельшчыны, *Le Figaro* для Францыі ці *The Wall Street Journal* для Амэрыкі.

Сёньняшняя «Наша Ніва» — аднаўленьне *тае нівы*. Ня большае й ня меншае, ня іншай і ня «вашай» — *нашай*.

Сёньняшняя ж Беларусь — адно вялікае Малое Сітна. Зьняверанае, занядбанае, загрузлае ў граху й рабстве. Сеяць і вырошчваць нацыю на такой ніве надта цяжка. Хтосьці абавязкова заўважыць: ды паглядзеце на свой наклад... Што тыя некалькі тысячаў для 10-мільённай краіны? Але так было заўсёды: «Жніво вялікае, а працаўнікоў мала» (Лукі 10:2).

Тыя, хто верыць, ніколі ня кінуць, ня спляжаць і не прададуць Нашай Нівы. Бо, як і 100 гадоў таму, тут сеюць, вырошчваюць і зьбіраюць ня хлеб і не відовішчы, а нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

У іншых народаў ролю цэнтру нацыянальнай крышталізацыі выконвалі вялікія вайскаводы, крывавыя рэвалюцыі, патрыятычныя дыктатуры, а вось у беларусаў — незалежная газэта.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Дзень салідарнасьці ў Менску. 16 лістапада.**

# За вашу і нашу «Ніву»

Вечарына ў ЭГУ.

У Вільні, у будынку Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту, 16 лістапада прайшла вечарына, прысьвечаная стагодзьдзю «Нашай Нівы». ЭГУ месьціцца на Антокалі, далёка ад Базылянскіх муроў, але тым умовам, якія маюць беларускія студэнты ў Літве, пазайздросьцяць многія іх калегі на радзіме. Дый нашаніўцы ня маюць сёньня ў Беларусі доступу ў такія залі, як абсталяваная па апошнім слове тэхнікі актавая заля ЭГУ.

Ад «Нашай Нівы» былі галоўны рэдактар Андрэй Дынько, ягоны намесьнік Андрэй Скурко і фатограф Андрэй Лянкевіч.

Вечарына пачалася прэзэнтацыяй фотавыставы нашаніўца-вэтэрана Дзяніса Раманюка.

Пасьля згасла сьвятло, загучаў нашаніўскі гімн «Не пагаснуць зоркі ў небе» на Купалавы словы, і на вялізным экране разгарнулася слайд-шоў «Вандроўкі па нашаніўскіх мясьцінах Вільні», падрыхтаванае студэнтамі-беларусістамі ЭГУ. Старонкі першых нумароў «НН» і сучасная Вільня, твары мэтраў нашаніўскае пары і сёньняшняя беларуская моладзь.

Прывітальнае слова прысутным сказаў рэктар ЭГУ, акадэмік Анатоль Міхайлаў. Сымбалічна, што прамову ён пачаў па-беларуску.

Пасьля прамаўляў Андрэй Дынько. «Мы пачалі сьвяткаваньне стагодзьдзя газэты з Бэрліна, працягнулі ў Менску, Полацку і Вільні, а скончыць спадзяемся ў Маскве», — сказаў ён.

Паэт зь Вільні Алег Мінкін чытаў клясычнага, перастворанага ім па-беларуску, «Крумкача» Эдгара По і ня менш клясычнага ўжо «Кукабаку». А таксама свой новы верш «Імгла», прысьвечаны беларускай мове. Аўтар ахвяраваў яго рэдактару-аднаўляльніку «Нашай Нівы» Сяргею Дубаўцу.

З прамовай выступіў былы міністар замежных спраў Беларусі Пятро Краўчанка.

Чаравала сьпявачка Марыя Крупавес — увасабленьне вытанчанае віленскае шматкультурнасьці. Беларускія, літоўскія, польскія, габрэйскія сьпевы ў яе выкананьні вярталі ў залю атмасфэру шматязычнай Крывіцкай Мэкі.

Падчас фаташоў Андрэя Лянкевіча, расквечанага яго лякагічнымі камэнтарамі, заля то замірала, то выбухала рогатам. Студэнты усьцешана дазналіся, што гэта іх не апошняя сустрэча зь Лянкевічам у сьценах ЭГУ. Нашаніўскі фатограф запрошаны чытаць цыкль лекцый.

Вядоўца імпрэзы — гісторык Алесь Смалянчук — дадаў гістарычную нотку: урывак з успамінаў нашаніўца Францішка Ўмястоўскага пра сьвяткаваньне выхаду першага нумару «Нашай Долі».

Цягам усёй вечарыны з залі на сцэну цяклі пытаньні: як нам будаваць адносіны з Расеяй? Якому правапісу аддаяце перавагу? Як выжывае газэта ў сёньняшніх умовах? Калі яна пераедзе ў Вільню? «Мы будзем адцягваць гэты шчасьлівы момант, як толькі можам», — аджартоўваўся галоўны рэдактар.

У Менск сябры Рэдакцыі везьлі падарунак студэнтаў-беларусістаў: транспарант «За нашу і вашу ніву!». Ён упрыгожыць менскія й магілёўскія юбілейныя імпрэзы. Вільня, Менск і Магілёў – адна ніва.

**Сяргей Мікулевіч**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сьпявачка Марыя Крупавес зачаравала слухачоў.**

# Дэкарацыя для «Славянскага базару»

## У Віцебску вырашылі «адбудаваць» вежу Альгерда на Верхнім замку, што была зьнішчаная ў XVII ст. Але як?

Што ў большасьці гарадоў Беларусі былі мураваныя вежы ў замках, ня дзіва. Многія зь іх сталі ахвярамі расейскіх захопнікаў яшчэ ў XIX ст., калі збурылі славутыя вежы-данжоны ў Тураве, Берасьці, Пінску...

Чаму цяпер улады схапіліся за ідэю ўзнаўленьня сярэднявечнай вежы ў Віцебску? Каб паказаць, што рупяцца пра гісторыю. Чаму ж тады няма сродкаў на сапраўдны, цалкам аўтэнтычны замак у Крэве, што быў сьведкам грандыёзных гістарычных падзеяў, а цяпер рассыпаецца? На дзясятку іншых замкаў, што руйнуюцца на вачах, — ад Быхава да Гераёнаў?..

Ну, напрыклад, таму што сродкі ёсьць пакуль толькі ў Віцебску. Або таму што там разумнейшае мясцовае начальства. Або таму што Віцебск — гэта частка фасаду, праз «Славянскі базар». Але і ў Віцебску, бадай, варта найперш рэстаўраваць наяўнае, а не адбудоўваць тое, чаго ніхто ня бачыў.

Але дапусьцім, хочацца нешта менавіта «ўзнавіць», каб быў такі знак. Узнаўленьне. Добра. Тады мо варта спачатку аднавіць нешта, зьнішчанае нядаўна, выгляд чаго добра вядомы? Напрыклад, Усьпенскі сабор на гары, узарваны ў у 1936 годзе сапэрнай брыгадай Пятра Грыгарэнкі. Альбо касьцёл Сьв.Антонія й кляштар бэрнардынаў, зруйнаваны паводле спэцыяльнай пастановы ў 1938-м. Разам з бэрнардынскім кляштарам на супрацьлеглым беразе Віцьбы калегіюм езуітаў ствараў нібыта люстэркавую сымэтрыю Рынкавай і Саборнай плошчаў гораду і адзіны ансамбль. У1956 г., з мэтай «добраўпарадкаваньня і рэканструкцыі», сабор і калегіюм езуітаў таксам ўзарвалі... За савецкім часам у Віцебску было зьнішчана больш як 25 (!) храмаў. Існуюць жа шматлікія фота гэтых ансамбляў, дакладныя абмерныя красьлюнкі. Альбо — цалкам рэальнае ўзнаўленьне Стрэчанскай царквы XVI стагодзьдзя, муры якое былі выяўленыя ў 1993 годзе пры археалягічных дасьледаваньнях Саляных складоў.



Вежу Альгерда паставяць ва ўрбаністычным антуражы.

Праўда, узнаўленьне гэткіх сур'ёзных аб'ектаў вымагае вялікай кваліфікацыі, ня робіцца ўраз. Вежу Гедыміна ў Вільні аднаўлялі ў два этапы ў XX ст. У Пскове і ў Смаленску панаставілі такіх «гістарычных» вежаў. І Троцкі замак таксама на тры чвэрткі — фантазія літоўскіх будаўнікоў. Але: а) тамака гэтыя аб'екты былі прадметам шматгадовых публічных дыскусіяў (пра Гедымінаву вежу нават Мсьціслаў Дабужынскі напісаў цэлае эсэ); б) гэтыя аб'екты ўключаліся як «разынкі» ў адроджаную й дагледжаную тканку аўтэнтычнага асяродзьдзя.

У нашым выпадку рашэньні прымаюцца невядома кім. А таму ўсё залежыць ад сумнеўных суб'ектыўных густаў. Напрыклад, знаны архітэктар Армэн Сардараў у «Советской Белоруссии», кажа: «У Віцебску як нідзе адчуваецца стражытнарускі, праваслаўны ўплыў. І тут ёсьць момант пэўнай этыкі — наколькі мы маем права вярнуцца да схемы Альгердавай вежы. (...) Ці маем мы права ў Віцебску падкрэсьліваць гэтую літоўскасьць? Тым больш, што ніхто ня ведае, якой была вежа ў XIV стагодзьдзі».

Сп.Сардараў яўна не цікавіўся беларускай гісторыяй настолькі, каб ведаць сэнс тэрміну «літоўскі» ў Сярэднявеччы. Інакш бы ведаў, што яно азначала менавіта «беларускі». Як ня ведае ён, што князь Альгерд быў слынным рупліўцам праваслаўя, а ягонай жонкаю была віцебская княжна. І вось яму Віцебск бачыцца «старажытнарускім». А камусьці — гатычным, а камусьці — супрэматычным... Але ж аднаўляць трэба тое, што было, што вядома, а ня тое, што бачыцца! Напрыклад, каталіцкае і ўніяцкае дойлідзтва XVIII ст., той дасканалы барочна-ракайльны ансамбль, што датрываў да савецкага часу.



Прыкладна так выглядала вежа Альгерда.

Дарэчы, мэтадалягічна разьвязаць праблему вобразу тае вежы й характару яе канструкцыяў няцяжка. Мы мусім заплюшчыць вочы і... уявіць сабе горад у XIV стагодзьдзі. Лёгка? Няма праблемаў, сьцвярджае «Советская Белоруссия»! У сваім артыкуле «Камяні Альгердавай вежы» Сьвятлана Ліцкевіч піша з апломбам: «Пытаньне пра тое, як будзе выглядаць адроджаны круглік, гэтак і не знайшло пакуль дакладнага адказу. Але гэта ўжо дэталі. Галоўнае, у чым адмыслоўцы адзінадушныя: вежа павінна быць». От жа «адбудова» помнікаў: як выглядала — ня ведаем, як будзе выглядаць — таксама. Але — павінна быць! Зьвярнеце ўвагу, што аўтарка не ўдакладняе, якія «адмыслоўцы» і дзе выявілі такую рэдкасную аднадушнасьць. А можа, мы ведаем гэтага адмыслоўца?..

Калі ў Камянецкай вежы дадумеліся ўставіць плястыкавыя шклопакеты, калі ў Лідзкім замку зрабілі жалезабэтонны праезд, то...

Новая «старадаўняя» вежа Альгерда сярод савецкага Віцебску будзе глядзецца ня горш, чым комін ТЭЦ. Дэкарацыя для «Славянскага базару» будзе. А толку?

**Сяргей Харэўскі**



# Будзе табе і кава, і какава з гарбатаю!

Ведаючы мэнтальнасьць улады, 12 пунктаў ЭЗ чытаеш, як прыгожую ўтопію. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Эўразьвяз прэзэнтаваў новую стратэгію ў дачыненьні да Беларусі. Аналітыкі ў адзін голас кажуць, што афіцыйнаму Менску прапанаваны пернік (дакладней, шакалядка, Брусэль славуты менавіта гэтым прадуктам).

Іншае пытаньне, наколькі спакусяцца пачастункам беларускія ўлады. Бо начыньне — то бок набор умоваў — можа падацца цяжкатраўным.

Прынамсі, раней такога выразнага канцэптуальнага дакумэнту не было (калі не лічыць «пакрокавай стратэгіі», што не прасунулася ні на крок).

Былі шматлікія заявы, рэзалюцыі эўрапейскіх структураў. Спрабавалі напалохаць санкцыямі.

Цяпер Беларусі прапануюць бонусы: гандлёвыя выгады, фінансавую дапамогу, спрашчэньне візавага рэжыму, разьвіцьцё абменаў і г.д.

Палітоляг Валер Карбалевіч лічыць, што для эўрапейскай палітыкі гэта крок наперад. Зьявілася канцэпцыя, прычым са стымуламі для ўлады і народу.

Дый апазыцыя атрымлівае козыры. Калі раней кіроўныя вярхі казалі, што ў Эўропе нас ніхто не чакае, то цяпер — вось, калі ласка, дзьверы прыадчыняюцца!

Цяпер, ідучы ў народ падчас мясцовых выбараў, замест абстракцыяў (кшталту пасланьня «Шлях да свабоды») можна прасоўваць у масы новую стратэгію Эўразьвязу. Акурат з улікам «каўбаснага мэнталітэту», як раілі аналітыкі.

Во, глядзеце, людцы добрыя, як мы зажывем, калі спадзе жалезная заслона! Трэба толькі трохі націснуць на ўладу. Будуць вам і танныя каўбасы, і добрыя легкавікі, і кватэры ў эўрастылі, і адпачынак на Мальце... («...і какава з гарбатаю», — дадасьць тут аматар чорнага гумару).

Безумоўна, альтэрнатыўныя плыні інфармаваньня ў пэўнай ступені спрацуюць, і грамадзяне Беларусі дазнаюцца аб прапановах Эўропы.

Але ўсё ж разьвіцьцё эўрапейскага сюжэту будзе вызначацца тым, наколькі — скажам наўпрост — варункі прыціснуць кіроўныя вярхі. Аналітык Андрэй Фёдараў канкрэтызуе: найперш гэта будзе залежаць ад моцы расейскага ціску.

Зрэшты, нават калі добра прыціснуць, невядома, што атрымаецца. Можа быць і горай.

Пакуль што паводзіны Менску выглядаюць супярэчліва. Улады баяцца прадэманстраваць слабасьць. Вызваленьне аднаго ці некалькіх палітвязьняў — гэта, мусіць, яшчэ дапушчальнае поле гульні з Захадам. Тым болей што рэпрэсіўная машына заўжды можа зрабіць новы абарот. А вось канкрэтныя крокі ў кірунку дэмакратызацыі пакуль праблематычныя.

«Улады баяцца трэшчыны ў сыстэме, калі іх апанэнты атрымаюць большыя магчымасьці ўзьдзейнічаць на палітычны працэс», — рэзюмуе Валер Карбалевіч.

Сапраўды, ведаючы мэнтальнасьць вярхоў, 12 пунктаў ЭЗ чытаеш, як прыгожую ўтопію. Хаця гэта той выпадак, калі хочацца памыліцца ў прагнозах.



WWW.SVABODA.ORG

**Беларускі пасол Васіль Даўгалёў уручае даверчыя лісты прэзыдэнту Ўсяе Русі Ўладзімеру Пуціну.**

# Маршрутам графа Тышкевіча


Граф Канстанцін Тышкевіч.

У 2007 г. спаўняецца 150 гадоў з часу экспэдыцыі графа Канстанціна Тышкевіча па Вяльлі. Падчас яе Тышкевіч упершыню наведаў, абмерыў і апісаў вытокі й першыя 77 кілямэтраў ракі. Група энтузіястаў вырашыла наступным летам паўтарыць падарожжа графа Тышкевіча. Удзельнікі экспэдыцыі прагнуць далучэньня да выправы водных турыстаў.

У 1857 годзе ўпершыню комплексна, з пагляду геаграфіі, гісторыі, этнаграфіі, былі вывучаныя Вялейшчына й Віленшчына. Вынікі экспэдыцыі выйшлі кнігай «Вяльля і яе берагі» (1871 г., пасьля сьмерці аўтара). Кніга графа Тышкевіча — адзіная манаграфія ў Эўропе, у якой этнічны рэгіён дасьледаваны шляхам падарожжа па рацэ.

Праз 150 гадоў ад Камены да Коўна выбіраюцца прадстаўнікі розных грамадзкіх арганізацый.

У Віленскай ратушы адбыўся ўрачысты абрад упаўнаважаньня будучае экспэдыцыі. Прадстаўнікі пяці грамадзкіх арганізацыяў падпісалі дамову аб партнэрстве.

Ініцыятары ідэі, праплывўшы па Вяльлі ў памяць графа Тышкевіча, хочуць нагадаць грамадзтву Літвы і Беларусі аб яго навуковых заслугах і зьвярнуць увагу грамадзтва на значэньне Вяльлі для абодвух народаў. Вяльля лучыла людзей розных нацыяў, якія жывуць абапал ракі.

Задумана паўтарыць экспэдыцыю Тышкевіча і, карыстаючыся сучаснымі тэхналёгіямі, зафіксаваць зьмены на берагах Вяльлі, што адбыліся за 150 гадоў.



Удзельнікі экспэдыцыі прагнуць далучэньня да выправы водных турыстаў з абедзьвюх дзяржаў.

Кінадакумэнталіст Вітаўтас Дамашэвічус мае створыць відэааповед пра эўрарэгіён Вяльлі, які будзе паказаны па эўрапейскіх тэлеканалах. Таксама ў 2007 г. вынікі экспэдыцыі будуць абагуленыя ў асобным выданьні.

Граф Тышкевіч сваё падарожжа пачаў 5 чэрвеня 1857 г. Роўна праз 150 гадоў яно зноў пачнецца ад вёскі Камена, ад легендарнага каменя, дзе пачынаецца Вялейскае вадасховішча.

Шлях да беларуска-літоўскай мяжы экспэдыцыя праплыве за два тыдні з начлегамі ў Нарачы, Смургонях, Данішаве, Жодзішках. Дзяржаўную мяжу пераплывуць 18 чэрвеня.

У Буйвідах да экспэдыцыі далучыцца плыт «Блюкшыс» з камандай. Праплываючы Літвою, удзельнікі экспэдыцыі зьбіраюцца ўшанаваць міталягічныя мясьціны Сантаку, Рэву, Пашульнішкі.

Купальле, як і 150 гадоў таму, будзе адсьвяткавана ў Вільні, насупраць парку Зьвярынец. Начлегі ў Літве заплянаваныя ў Судэрве, Дукштах, Кернаве, Руклі. А скончыцца экспэдыцыя 1 ліпеня ў Коўне.

**Людвіка Вітушка, Вільня**

Камень з шасьціканцовым крыжам ля вёскі Камена на малюнку графа Тышкевіча (зьлева) і сёньня (унізе).



ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Грыбаедаў пра сучасную Беларусь

«Дома новы, но предрассудки стары» — будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі.

«Суждения черпают из забытых газет» — «Беларусь сегодня — Советская Белоруссия».

«Поют все песнь одну и ту же» — «Мы, беларусы — мірныя людзі...»

«Защиту от суда в друзьях нашли, в родстве...» — no comment.

«Забрать все книги бы да сжечь» — у Акадэміі навук распрацаваны новы від паліва для камбайнаў і трактараў.

«А мужу моему совет дал жить в деревне» — праграма «адраджэньня сяла».

«Не должно сметь свое суждение иметь» — пра ўсіх грамадзянаў.

«Ведь надобно ж зависеть от других» — аснова дзяржаўнай ідэалёгіі.

«Кто другой так мирно все уладит! Там моську вовремя погладит…» — вырашэньне газавага пытаньня.

«Смесь языков?» — «Да, двух, без этого нельзя ж» — хопіць трасянкі, канец дзьвюхмоўю.

«Строжайше запретил б я этим господам на выстрел подъезжать к столицам» — пра міжнародных назіральнікаў на выбарах і рэфэрэндуме.

«Ах, злые языки страшнее пистолета» — «Наша Ніва», радыё «Свабода».

«Услужлив, скромненький, в лице румянец есть» — Сідорскі.

«Надежды много впереди» — «Жыве Беларусь!»

**Перадала вучаніца менскай гімназіі №3**

## Скульптуры вершнікаў у Беларусі ўжо ёсьць

**Час ад часу на старонках друку зьяўляецца інфармацыя аб плянах узьвядзеньня першага ў нашай краіне коннага помніка.** Апошняе паведамленьне ў «Нашай Ніве» аб праекце коннай скульптуры князя Ўсяслава Чарадзея ў Полацку пацьвярджае недахоп інфармацыі аб конных помніках, што ўжо ёсьць. «Беларусы дагэтуль не паставілі ніводнага коннага помніка», — піша Сямён Печанко. На самай справе толькі на Магілёўшчыне іх два: адзін у Бабруйску, другі — у Хоцімскім раёне.

Хоцімскі вершнік узьведзены за 800 мэтраў ад расейскай мяжы ў лесе між беларускай вёскай Горня і расейскай Асінкай. Тут чырвонаармейцы далі апошні ў 1941 г. бой на беларускай зямлі.

Невялічкі атрад савецкіх коньнікаў прыкрываў адыход ад Хоцімску 21-й конна-кавалерыйскай дывізіі 13-й арміі. Заслон з 25 воінаў на чале з палітруком роты сувязі Іванам Гарабцом усю ноч капаў акопы, а ўвесь наступны дзень 16-га жніўня адбіваў спробы немцаў наступаць на Сураж. Спыніць танкавую атаку салдаты не змаглі. Практычна ўсе яны загінулі ў няроўным баі.

У 1981 г. на месцы бою была ўзьведзеная скульптура. Баявы конь з кавалерыстам, які застыў у напружаным імкненьні кінуцца ў бой з паднятай над галавой шабляй.

Бабруйскі помнік навейшы. Гараджане празвалі скульптуру «Конь Раманоўскага». Ён усталяваны некалькі гадоў таму на галоўнай магістралі гораду побач з праваслаўнай капліцай. Дзіўны сымбіёз «Георгія Перамаганосца» і савецкага пехацінца на кані. У касцы і плашч-накідцы ён у імклівым кідку дзідай прабівае галаву нямецка-фашысцкага зьмея.

Разглядзець дэталі скульптуры практычна немагчыма. Яна ўзьнесеная на высачэннай арцы вышэй дрэў. Злыя бабруйскія языкі кажуць, што так атрымалася дзеля жаданьня тутэйшых вэтэранаў бачыць чырвонаармейскую зорку на касцы воіна вышэй за крыж праваслаўнай капліцы. Амбітныя імкненьні вэтэранаў савецкай арміі падтрымліваў старшыня гарвыканкаму Раманоўскі.

Воіна на кані паказваюць гасьцём, спрачаюцца аб ягонай сымболіцы. Адны бачаць у ім традыцыйны сымбаль перамогі над фашызмам. Іншыя, апэлююць да таго, што вершнік чамусьці скача на ўсход, кажуць, што ён сымбалізуе адыход расейскай арміі ў Азію і зьмяншэньне арэалу расейскага ўплыву ў Эўропе. А нацыянальная плынь тутэйшай апазыцыі сьцьвярджае, што помнік лёгка перарабляецца ў «Пагоню»…

Пакуль конныя скульптуры адлюстроўваюць толькі афіцыйна ўслаўленую старонку нашай гісторыі — апошнюю вайну, дзясяткі іншых гістарычных сюжэтаў і асобаў незаслужана занядбаныя. Таму, хоць помнікі Ўсяславу Чарадзею, Гедыміну ці Вітаўту і ня стануць першымі ў нашай краіне, але іх узьвядзеньня чакаю зь нецярплівасьцю.

**Аляксандар Агееў, Магілёў**

## Хто ня кінуў і ня здрадзіў

**Так хочацца паразважаць пра тое, што сёньня адбываецца ў апазыцыі ў дачыненьні да лідэра А.Мілінкевіча.** Для мяне настолькі відавочна, што час і гісторыя абралі гэтага чалавека як лідэра. І тое, што адбылося ўвесну, немагчыма ня зьвязваць зь імем А.Мілінкевіча. Бо ня толькі фальсыфікацыя і хлусьня вывелі людзей на вуліцу, але і давер да прыстойнага лідэра, які ня кінуў і ня здрадзіў. Так, выступы па ТВ А.Казуліна далі пэўны рэзананс. Але давайце ўявім, што не было б Казуліна як кандыдата такога ўзроўню, — падзеі з такой жа колькасьцю людзей і энэргіяй усё адно адбыліся б. А вось калі б не было А.Мілінкевіча як кандыдата, а быў бы іншы з прэтэндэнтаў, я вельмі сумняюся, што мы б убачылі такі вынік. Я перакананая: нягледзячы на нейкія дробныя пралікі і памылкі, менавіта ахвярнасьць і самаадданасьць сумленнага лідэра перадаліся і памножыліся ў сэрцах маладых людзей, якія стаялі на Плошчы. І непрыемна чуць выразы кшталту: «Ну, пры чым тут лідэр, усё адно, хто быў бы лідэрам».

А тыя, хто цяпер супрацьстаяць А.Мілінкевічу, аслабляючы ягоны аўтарытэт, спрабуючы нават адхіліць яго, сваімі дзеяньнямі паказваюць, што жадаюць задавальненьня ўласных амбіцыяў болей, чым свабоды сваёй краіны.

Звычайна Бог і гісторыя сарамаціць такіх людзей. А пасьпяховыя лідэры заўсёды застаюцца лідэрамі.

**Хрысьціянка-эвангелістка Натальля Грышко, Менск**

## Працаваў на шасьцідзесяці працах. Піша вершы

**Яшчэ ў 1971 годзе Вольга Іпатава раіла яму выдавацца.** У той час паэты былі добра забясьпечаныя матэрыяльна. Уладзімер Місьцюк — чалавек вельмі сьціплы. Ён марудзіў ажно 35 гадоў, але друкаваўся ў часопісе «Вожык», газэце «Наша слова» і пэрыядычным друку Гарадзеншчыны...

У 2006 г. У.Місьцюк выдаў кнігу «Зь любоўю да жыцьця». Яе наклад мізэрны — 20 асобнікў. Некаторыя вершы прысьвечаны родным. Адзін зь іх — далёкай сваячцы з Бабра на Меншчыне Яніне Пушкінай. Місьцюк адметны тым, што да свайго 60-годзьдзя меў больш за шасьцьдзесят запісаў у працоўнай кніжцы. Працаваў у розных арганізацыях па розных спэцыяльнасьцях. Мае некалькі адукацыяў. Цяпер жыве ў вёсцы Дулічы, будуе катэдж і піша вершы.

**Аляксей Шалахоўскі, Менск**

## Мы здабудзем Волю!

*Прысьвячаю «Маладому фронту» і асабіста Зьмітру Дашкевічу*

Нішчаць маладзёнаў —
Хлопцаў і дзяўчатаў,
Каб ня зналі волі,
Садзяць іх за краты.

Ды ня зломяць духу
Гэтых маладзёнаў,
Яны прагнуць волі
Богам ухвалёнай.

Быць таго ня можа,
Што не пераможам,
Разам з Божай Воляй
Здабыць Волю зможам!

**Мікалай Кукса, Івянец**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:
а/с 537, 220050 Менск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29.**

# Прага «Нашай Нівы»

Факсымільнае выданьне «НН» зробленае з арыгіналаў, падораных кадэбістам. Піша **Ўладзімер Содаль**.

Пра «Нашу Ніву» людзі майго пакаленьня пачулі найперш у школе пры знаёмстве з творчасьцю Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Канстанцыі Буйлы, Алаізы Пашкевіч-Цёткі, Максіма Гарэцкага і шмат-шмат каго іншых. Менавіта ўсіх іх паклікала да творчасьці «Наша Ніва». Гэта інтрыгавала. Аднак пазнаёміцца з самым выбітным выданьнем, з арыгіналам «Нашай Нівы» мала хто з нас тады мог. Хіба толькі тыя, хто жыў у Менску. І то з адмысловага дазволу. А яго давалі ня кожнаму. Дый не ва ўсіх менскіх бібліятэках, прынамсі і ў так званай Ленінскай дый і ў Акадэмічнай, быў поўны камплект гэтага выданьня за ўсе гады. Яшчэ ратавала цікаўнасьць самых апантаных Вільня. У віленскіх бібліятэках «Нашу Ніву» можна было пачытаць у больш поўных камплектах. Але адно чытаць «Нашу Ніву» ў бібліятэках, архівах, а другое — удома. Спакойна, нясьпешна, зь вяртаньнем да прачытанага і раз, і другі — з кубачкам кавы. Акурат такая магчымасьць мне аднойчы выдалася. Было гэта дзесь на самым пачатку васьмідзясятых гадоў. Я працаваў на Беларускім тэлебачаньні, выдаваў тэлевізійны часопіс «Роднае Слова». Аднойчы мне захацелася распавесьці пра «Нашу Ніву» з тэлевізійнага экрану. Я пазнаёміўся з наяўнымі нумарамі «Нашай Нівы» ў Нацыянальнай бібліятэцы. Былі там і некаторыя ўкамплектаваныя гадавікі. От гэтым часам пра маё памкненьне дачуўся і вядомы цяпер фальклярыст і энцыкляпэдыст Янка Саламевіч. Ён пад вялікім сакрэтам сказаў, што мае колькі гадавікоў гэтай легендарнай газэты і можа мне даць на колькі дзён пакарыстацца ёй дома.

Я не паверыў сваім вушам: я магу ў звыклых хатніх абставінах разам зь сям'ёю, з сваімі дзецьмі чытаць «Нашу Ніву», газэту-легенду!

Праз колькі дзён Янка Саламевіч прынёс абяцаныя гадавікі, і мы сваёй дружнай сямейкай з гэтай газэтай правялі не адзін вечар. Пра гэта сьведчаць і фатаздымкі той пары. Як каму, а для мяне гэтае чытаньне зрабілася знакавым, накіраваўшы да пошукавай і дасьледніцкай працы, якая працягваецца да гэтае пары. Але пра гэта хіба крыху пазьней. А цяпер дарэчы будзе згадаць, адкуль жа ў Янкі Саламевіча «Наша Ніва». Уражаны нечаканай сустрэчай з «Нашай Нівай», сустрэчай нечаканаю, ды і з этычных меркаваньняў я не адважыўся пацікавіцца ў сп.Саламевіча, адкуль у яго такая каштоўнасьць, такі рарытэт. І толькі праз шмат гадоў Янка распавёў:



АРХІЎ У.СОДАЛЯ

**Уладзімер Содаль з арыгіналам «Нашай Нівы». 1980 год.**

— Працаваў у нас у «Энцыкляпэдыі» Мікалай Камінскі. От ад яго і дасталося мне колькі камплектаў нашай першай беларускай газэты. А яму гэтыя камплекты дасталіся з архіву. Да «Энцыкляпэдыі» Камінскі працаваў у архіве. У якім? Здаецца, Кастрычніцкай рэвалюцыі. Там акурат захоўваліся згаданыя гадавікі. А на той час вядома, якая была трактоўка «Нашай Нівы» — лібэральная, дробнабуржуазная. То каму такая газэта патрэбная ў нашай краіне, дзе от-от настане камунізм? Дык от адзін з кадэбістаў, апякун архівістаў, кажа Камінскаму: «Калі хочаце, можаце забраць сабе». І Камінскі забраў. Тады што? Камінскі зьбяднеў, і я за пэўную плату купіў тыя гадавікі. Мне дасталася ад Камінскага «Наша Ніва» за 1909—1910, 1912—1914 гады. Зь іх Зьміцер Санько адбіў факсымільныя гадавікі.

Гэтым парадкам, праз ксэракапіяваньне, былі ўкамплектаваныя гадавікі старой «Нашай Нівы» ў нашых бібліятэках, і гэтым самым нашыя дасьледнікі і проста чытачы атрымалі магчымасьць прасачыць гісторыю станаўленьня нашай першай легальнай газэты. І ня толькі гісторыю газэты, але і народзіны новай беларускай літаратуры і іншых праяваў беларускай культуры. «Наша Ніва» — гэта жывы летапіс гісторыі Беларусі пачатку XX стагодзьдзя.

# Хто народны? Вынікі апытаньня

Улетку «Наша Ніва» запачаткавала дыскусію на тэму Народнага пісьменьніка: ці варта захаваць званьне Народных пісьменьнікаў у сучаснай Беларусі і, калі так, то як?

Да закранутай «НН» тэмы далучыліся шараговыя чытачы. На сайце «НН» адбылося інтэрнэт-апытаньне. Выказаліся беларускія літаратары, літаратуразнаўцы, мастакі, музыкі, выдаўцы і перакладчыкі, сярод якіх Міхась Скобла, Арлен Кашкурэвіч, Генадзь Вінярскі, Пятро Васючэнка ды інш. На радыё «Свабода» ў праграме Юр'я Дракахруста свае меркаваньні выказвалі Адам Глёбус, Яўген Будзінас і Валянцін Акудовіч.

## За Народнага

Патрыярх беларускае інтэлектуалістыкі Арсень Ліс мяркуе: «Калі творца годна рэпрэзэнтуе літаратуру свайго народу як мастак слова і грамадзянін, то ня грэх яго ўшанаваць адпаведным чынам». Ад сябе прапануе колькі кандыдатураў, сярод якіх Аляксей Дудараў, Генадзь Бураўкін, Алесь Разанаў.

Чытачка зь Менску Г. уважае тэму Народнага актуальнай. На яе думку, гэтага званьня годны рок-музыка і літаратар Лявон Вольскі, дзякуючы творчасьці якога моладзь пачала вяртацца да роднай мовы.

Кася зь Менску піша, што сапраўдны Народны пісьменьнік найперш павінен быць адданы Бацькаўшчыне. Яна сьцьвярджае, што Міхал Анемпадыстаў сваімі вершамі гэтую адданасьць дэманструе. Да таго ж піша тэксты для рок-гуртоў, якія маюць уплыў на моладзь.

Чытач Ягор Марціновіч згодны на Народнага, адно што яму бачацца ў гэтай ролі сталыя творцы і менавіта пісьменьнікі. Не перакладнік Сёмуха ды палітык Пазьняк, пры ўсёй да іх павазе, а, напрыклад, Іван Пташнікаў.

## І супраць

А. Глёбус лічыць савецкую традыцыю Народнага пісьменьніка праявай непавагі расейцаў да літаратараў з правінцыі: «Пісьменьнікі, якія пісалі па-расейску і былі імпэрскімі пісьменьнікамі — імпэрыі СССР, не атрымлівалі званьня Народнага пісьменьніка Расеі. А гэта такое грэблівае стаўленьне да літаратараў з ускраін».

Зь ім пагаджаецца чытач Юры Мянкоў з Кармянскага раёну: «Гэтае званьне прысуджалі ў імпэрскі час з мэтай кантраляваць пісьменьніцкае асяродзьдзе». Сп.Мянкоў лічыць, што творцы мусяць займацца сваёй справай ня дзеля ўзнагародаў і прызнаньня, тады гэта будзе сапраўдная творчасьць і літаратура. І ставіць у прыклад паэтку Ларысу Геніюш, якая ніколі ня мела званьняў, у тым ліку званьня Народнай, але паводле духу, сваіх перакананьняў яна была сапраўднай народнай, бо жыла дзеля свайго народу, жыла дзеля Беларусі.

Сяргей Харэўскі лічыць аджылай гэтую традыцыю, а за лепшае ўважае стварэньне літаратурнай прэміі, кшталту Ганкураўскай. І зазначае, што пэўныя спробы і правобразы такой прэміі ў беларусаў ужо ёсьць, маючы на ўвазе «Залатую літару» і «Глінянага Вялеса».

## Кандыдаты на Народнага

Вынікі зладжанага праз пошту і тэлефанаваньні галасаваньня ў значнай ступені адрозьніваліся ад вынікаў інтэрнэт-галасаваньня. У апошнім прынялі ўдзел 715 чалавек. Іх галасы разьмеркаваліся наступным чынам: **Уладзімер Арлоў** — 191, **Лявон Вольскі** — 99, **Адам Глёбус** — 90, Сьвятлана Алексіевіч — 88, Генадзь Бураўкін — 45, Алесь Разанаў — 33, Іван Пташнікаў — 4. Савецкім перажыткам званьне Народнага назвалі 148 чалавек, 17 палічылі, што ніхто ня варты быць Народным пісьменьнікам. Такія сымпатыі маладзейшае часткі нашаніўскай аўдыторыі, чытачоў сайту.

Пры дапамозе пошты і рэдакцыйных апытаньняў прагаласавалі 121 чалавек. Тутака першае месца падзялілі **Генадзь Бураўкін** і **Алесь Разанаў**, за якіх аддалі па 17 галасоў, на другім месцы — **Уладзімер Арлоў**, 14, трэцяе — за **Вольгай Іпатавай** ды Іванам Пташнікавым, па 7. Па 6 галасоў маюць Уладзімер Някляеў ды Віктар Казько, Сяргей Законьнікаў — 4, Сьвятлана Алексіевіч, Анатоль Вярцінскі ды Андрэй Федарэнка — па 3. Па 1—2 галасах атрымалі Адам Глёбус, Лявон Вольскі (лідэры інтэрнэт-апытаньня), Міхал Анемпадыстаў, Валянцін Тарас, Рыгор Барадулін, Алесь Петрашкевіч, Юры Станкевіч, Васіль Сёмуха, Вітаўт Чаропка, Данута Бічэль, Аляксей Дудараў, Андрэй Хадановіч, Васіль Зуёнак, Зянон Пазьняк, Янка Сіпакоў. Ня бачаць вартых узнагароды 12 чалавек.

## Хто мае ўзнагароджваць

Найлепш, калі гэтым будуць займацца «старыя» Народныя, мяркуе Міхась Чыгунок. Бо толькі яны маюць маральнае права ўзнагароджваць іншых такім ганаровым тытулам ці вырашаць, што такое ўзнагароджваньне не патрэбна наагул. «Хто пасьля дазволіць сабе заявіць, што Барадулін ці Гілевіч памыліліся ў вызначэньні таго ці іншага на гэту пасаду?» — зазначае сп.Міхась і дадае, што пры гэтым абавязкова трэба ўлічыць меркаваньне народу. Для гэтага трэба ладзіць шматлікія апытаньні, грамадзкія абмеркаваньні з прыцягненьнем вядомых і аўтарытэтных людзей.

Вольф Рубінчык прапануе надаць гэтую функцыю парлямэнту, які мае ўзнагароджваць творцаў падчас адмысловых паседжаньняў.

Зь іншых ідэяў, што прагучалі, найбольш рэалістычнай здаецца прапанова, каб наданьнем званьня Народнага займалася Таварыства беларускай мовы. Няма іншай такой масавай і аўтарытэтнай арганізацыі. Дый і задачы ТБМ — захаваньне, узбагачэньне і папулярызацыя нашай мовы й літаратуры. Засталося распрацаваць справядлівы і юрыдычна варты мэханізм...

## Яскравы аргумэнт

Пісьменьніцкі асяродак перажывае нялёгкі час. Апальны пісьменьніцкі саюз канчаткова выселілі з будынку, кіраўнік іншае арганізацыі дазваляе сабе называць беларускамоўных школьнікаў «ублюдкамі». На адкрыцьці помніка Народнаму пісьменьніку Івану Шамякіну не было прадстаўнікоў абедзьвюх пісьменьніцкіх арганізацыяў.

У той жа час Народны паэт Рыгор Барадулін выказаўся ў падтрымку непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў у Беларусі акурат у той момант, калі пераьслед яго набыў злавесныя рысы. Адзін з актывістаў Саюзу Андрэй Пачобут назваў гэта «салідарнасьцю Беларусаў з Палякамі», заступніцтва паэта расцэньваецца як голас беларускага народу. Магчыма, гэта найбольш яскравы аргумэнт на карысьць таго, што аўтарытэт Народнага пісьменьніка яшчэ ня зжыў сябе.

**Сямён Печанко**

# Алег Трусаў: «Трэба ствараць аргкамітэт па ўручэньні агульнацыянальных прэміяў»

Закінутае летам «Нашай Нівай» пытаньне аб тым, хто ў сёньняшняй Беларусі можа лічыцца Народным пісьменьнікам, сустрэла значны грамадзкі розгалас. Нехта называў прозьвішчы вартых на гэтае званьне творцаў. Хтосьці казаў, што гэта перажытак мінулага і добра, што сучасная Беларусь адмовілася ад гэтай савецкай спадчыны. Рэдакцыя атрымала дзясяткі лістоў зь меркаваньнямі чытачоў.

Каб падсумаваць вынікі нашага апытаньня, мы зьвярнуліся да старшыні Таварыства беларускай мовы Алега Трусава. Пры памысных умовах акурат Таварыства беларускай мовы магло б стаць інстытуцыяй, якая магла б надаваць званьне Народнага пісьменьніка.

**«Наша Ніва»: Сп.Алег, як Вы ўвогуле паставіліся да нашаніўскай ініцыятывы вызначыць, хто сёньня Народны сярод беларускіх пісьменьнікаў?**

**Алег Трусаў:** Сама па сабе ініцыятыва, канечне, цікавая. Хоць «Народны», «Заслужаны» — гэта, натуральна, савецкая спадчына. У нармальных эўрапейскіх краінах такога няма. У нашай жа краіне былыя савецкія традыцыі почасту робяцца адносна дэмакратычнымі, улічваючы спэцыфіку разьвіцьця нашай краіны. Хто, напрыклад, мог падумаць, што будуць апазыцыйныя камуністы? Калі ўлады пасьля распаду СССР працягвалі даваць гэтае званьне, то я думаю, і спрэчак бы не ўзьнікала, трэба яно ці ня трэба.

**«НН»: Значыць, Вы не ўважаеце наданьне званьня Народнага за савецкі анахранізм?**

**АТ:** Раней казалі, што няма патрэбы ў існаваньні Саюзу пісьменьнікаў, казалі, што ён савецкі, сталінскі, яго трэба закрываць. Аднак калі ўлада пачала ціснуць на Саюз, то ў яго ўступілі ўсе ранейшыя крытыкі: ад Сідарэвіча да бумбамлітаўцаў. Тое самае і з прысваеньнем званьня Народнага. У краіне ў любым разе павінны быць нейкія літаратурныя прэміі. Ёсьць Нобэлеўская прэмія, але ніхто не заяўляе, што гэта анахранізм буржуазнага часу, яе крытыкуюць, штогод кажуць пра тое, што ўшанавалі ня тога пісьменьніка, але ўсе хочуць яе атрымаць. І калі ў Беларусі будзе нешта падобнае, хай гэта будзе прэмія, пасада, званьне ці нешта іншае, дык гэта нармальна. Гэта не супярэчыць агульнаэўрапейскай практыцы.

**«НН»: На Ваш погляд, чаму сёньняшнія беларускія ўлады не імкнуцца адрадзіць гэты інстытут Народнага пісьменьніка?**

**АТ:** Таму што цяперашняя ўлада не разумее і ня хоча зразумець ролі пісьменьніка ў грамадзтве. Ва ўладзе цяпер стаяць людзі, якія ўвогуле не чытаюць ніякіх кніжак, ня тое што беларускіх. У савецкі час пры ўсіх агаворках слова «пісьменьнік» было станоўчае, таму і ўлады трымалі пісьменьнікаў ля сябе. Савецкая ўлада будавала камунізм, яна думала пра вечнасьць, гэтая ўлада жыве толькі сёньняшнім днём, яна нічога не будуе, ні да чога не імкнецца. Пісьменьнікі ў такіх умовах уладам папросту непатрэбныя, ні савецкія, ні беларускія, ні праўладныя, ні тым болей незалежныя. З гэтай прычыны не даюць пісьменьнікам ні ордэнаў, ні званьняў.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«НН»: А хто тады б сёньня змог узяцца за наданьне званьня Народнага пісьменьніка?**

**АТ:** Было б вельмі добра, каб за гэтую справу ўзяліся адразу некалькі арганізацыяў. Скажам, ТБМ, ТБШ, Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына», БАЖ, ПЭН-Цэнтар і г.д. Адным словам, тыя арганізацыі, якія маюць дачыненьне да прыгожага пісьменства. Спачатку, я думаю, варта зладзіць пры «Нашай Ніве» круглы стол з удзелам прадстаўнікоў гэтых арганізацыяў. Вызначыць разам крытэры, паводле якіх будуць адбірацца годныя кандыдаты. Можа быць, у далейшым гэтае званьне ня будзе называцца «Народны пісьменьнік», а як-небудзь інакш. Проста насьпела патрэба ў нейкай агульнанацыянальнай пісьменьніцкай прэміі.

**«НН»: Калі такая прэмія ўрэшце зьявіцца, якія Вы бачыце пэрспэктывы для яе?**

**АТ:** Такая прэмія мусіць уручацца штогод. У ідэале было б добра, каб яе ўручалі ня толькі пісьменьнікам, але і скульптарам, мастакам, журналістам, гісторыкам і г.д. Кожная прэмія можа насіць сваё імя. Для пісьменьнікаў — Багушэвіча, для мастакоў — Драздовіча і г.д. Для пачатку хай бы ляўрэатаў узнагароджвалі якім-небудзь чыста сымбалічным прадметам. Скажам, невялічкім зьліткам золата. І ня вельмі дорага, і з густам. Пасьля, можа быць, дапамогу будуць аказваць нашы эмігранты, бізнэсоўцы.

Мусіць існаваць грамадзкі камітэт, які і будзе займацца вылучэньнем кандыдатаў на гэтыя прэміі. Будзе існаваць цікавасьць у грамадзтве, спаборніцтва між кандыдатамі. Гэткая прэмія можа ізноў адрадзіць інтарэс да беларускай літаратуры. Існуюць прэміі «Гліняны Вялес», ПЭН-Цэнтар уручае прэмію імя Алеся Адамовіча, але ўсе яны маюць нейкі мясцовы характар, а патрэбная агульнанацыянальная прэмія для творцаў.

**«НН»: Якую ролю ў грамадзтве мусіць выконваць ляўрэат?**

**АТ:** Найперш ён мусіць быць прапагандыстам беларускасьці. Арганізацыі, што вызначалі яго, бяруцца за раскрутку гэтага творцы. Выдаюць ягоныя кніжкі, ладзяць сустрэчы з чытачамі.

**«НН»: А хто зь сёньняшніх пісьменьнікаў варты званьня Народнага?**

**АТ:** Як на мой погляд, то найлепшыя кандыдатуры цяпер Уладзімер Арлоў і Вольга Іпатава. Менавіта на сустрэчы з гэтымі пісьменьнікамі зьбіраецца шмат людзей, іхнія кнігі чытаюцца людзьмі.

**Гутарыў**
**Зьміцер Панкавец**

# Першы беларус

Непасрэдным продкам усіх беларусаў можна лічыць толькі першага чалавека, які сам сябе назваў беларусам. Гэта быў Саламон Рысінскі, *Solomo Pantherus Leucorussus*. Піша **Алег Латышонак**.

Пэўне ж няшмат на сьвеце нацыяў, якія ведаюць імя і прозьвішча першага чалавека, які да гэтай нацыі належаў. Вядома, кожны народ мае сваіх продкаў, а ўсе мы паходзім так ці інакш ад Адама і Эвы. Пра беларусцаў Мацей Стрыйкоўскі пісаў, што паходзяць яны, так як і маскоўцы, ад Ноевага сына Яфэта, ягонага нашчадка Мосаха і Мосахавага «ўласнага патомка» Роса або Руса. Усётакі непасрэдным продкам усіх беларусаў можна лічыць толькі першага чалавека, які сам сябе назваў беларусам. Гэта быў Саламон Рысінскі, які ў 1586 годзе запісаўся ва Альтдорфскі ўнівэрсытэт пад Нюрнбэргам як *Solomo Pantherus Leucorussus*. Гэта і ёсьць першай вядомай гістарычнай навуцы дэкляряцыяй беларускасьці.

Праз два гады ён, у пісьме з камэнтаром да прац Аўзоніяда, накіраваным свайму нямецкаму суаўтару і сябру Канраду Рытэрзгаўзэну, назваў сваю бацькаўшчыну *Leucorossia*. У іншым пісьме Рысінскі тлумачыць суаўтару ўжываньне прыналежных прыметнікаў: «Яшчэ й цяпер маскоўцы, беларусы (*Leucorussi*) і вялікая частка літоўцаў такім часта карыстаюцца».

## А дзе тая Беларусь?

Да Рысінскага назву Белая Русь прымянялі выключна чужаземныя пісьменьнікі ў дачыненьні да самых розных частак Русі: ад Галіччыны праз Валынь, Пскоўшчыну, Полаччыну і Ноўгарад Вялікі па Маскоўшчыну. Пры тым яны пісалі пра «Белую Русь», «белых русінаў» або «беларусцаў». У Рысінскага назвы краіны і нацыі зьяўляюцца адразу ў сёньняшняй форме: Беларусь і беларусы, бо так перакладаюцца грэцка-лацінскія тэрміны *Leucorossia* і *Leucorussi*.



**Альтдорфскі ўнівэрсытэт, дзе вучыўся Рысінскі.**

## Інтэлектуальны прарыў

А цяпер уявім сабе, што ніхто ў сьвеце ня лічыць сябе беларусам. Пра Белую Русь пішуць толькі чужынцы, прычым памяшчаюць ад Белага да Чорнага мора. Усе навокал называюцца хто русінам, хто ліцьвінам. І вось Рысінскі прыходзіць да думкі, што гэтая «Белая Русь» — менавіта ягоная бацькаўшчына, а беларусам зьяўляецца ён сам. Такім чынам тое, што Рысінскі сябе назваў беларусам, а сваю бацькаўшчыну Беларусьсю было абсалютнай навізной, проста гіганцкім інтэлектуальным прарывам.

Застаецца яшчэ ўстанавіць, што канкрэтна значылі для Рысінскага тэрміны беларус і Беларусь. Са згаданага раней выказваньня Рысінскага вынікае ясна, што ён не лічыў сябе ні маскоўцам, ні літоўцам. Стасоўна апошніх Рысінскі ведае, што вялікая частка літоўцаў гаворыць па-славянску, але ня ўсе (зь літоўскай мовай мусіў быць знаёмы з часу, калі настаўнічаў у Жмудзі). Дарэчы, знаёмыя ў Нямеччыне ведалі яго як руса (*Russus*). Сваю бацькаўшчыну ў прыдуманай самому сабе эпітафіі падчас сьмяротнай, як яму здавалася, хваробы таксама традыцыйна назваў проста Русьсю: «Вось я, каго нарадзіла на мяжы Масквы шматсьнежнай, / Слаўная зьвярамі, паляўнічымі пушчамі, борамі Русь». Гэтая Русь ляжала там, дзе бачылі яе тады ўсе тубыльцы,



**Крыштап Радзівіл Пярун.**

г.зн. над Дняпром і Дзьвіной у Вялікім Княстве Літоўскім.

## Пад маскоўскай акупацыяй

Тэрміналёгія, якой карысталіся сучасьнікі Рысінскага, дазваляе ўстанавіць месца яго нараджэньня. Саламон быў, як можна меркаваць, сынам шляхціца Фёдара Рысінскага гербу Астоя з Рысіна ў Полацкім ваяводзтве (сёньня ў Расеі). Сам Рысінскі ўсё-такі двойчы назваў як месца свайго нараджэньня Кабыльнікі. Існавалі тады дзве мясцовасьці з такой назвай: мястэчка Кабыльнік (сёньня Нарач) у Ашмянскім павеце і ленны маёнтак Кабыльнікі ў Віцебскім ваяводзтве. Ашмяны тады не лічыліся часткай ні Русі, ні Белай Русі. У 1585 г. ашмянскія францішкане Белай Русьсю (*Alba Russia*) называлі Полаччыну. Такім чынам, Рысінскі нарадзіўся відавочна ў Кабыльніках Віцебскага ваяводзтва. У час яго нараджэньня Полаччына знаходзілася пад маскоўскай акупацыяй, і Рысінскія, відаць, вымушаныя былі пакінуць сямейнае гняздо.

## Беларус, шырэй — сармат

Як беларус, лічыў сябе прыналежным да шырэйшай супольнасьці сарматаў, бо аднойчы падпісаўся як *Solomo Rysinius Sarmata*. Сарматызм пазьней выradзіўся ў вузкую ідэалёгію шляхты Рэчы Паспалітай. Усё-такі, у часы Рысінскага і для яго асабіста сармата абазначала альбо грамадзяніна Рэчы Паспалітай і ў тым сэнсе паляка, або, шырэй — славяніна. Рысінскі карыстаўся тэрмінам сармат адначасова ў абодвух значэньнях. Відаць гэта ў яго пісьме да Вінанда Карнэлія. З аднаго боку, Рысінскі захапляецца польскай мовай і называе яе сармацкай, а палякаў — сарматамі. З другога боку, Рысінскі піша, што мова рускага народу таксама багатая як мова палякаў. Увогуле сьцьвярджае: «Як шырока сармацкая мова распаўсюджаная, на колькі гаворак падзяляецца, якія народы, якія краіны, якое насельніцтва абымае, тут немагчыма даць дакладны пералік; але, карыстаючыся дабрадзействамі гэтай мовы, кожны зможа прайсьці ад Адрыятыцкага заліву да Каспійскага мора безь перакладчыка, разумеючыся на такіх велічэзных прасторах. Пры тым, якія народы, якія плямёны, якія акругі ўключае гэтая старана сьвету, пакідаю дзеля ацэнкі вучоным у геаграфіі».Тут відавочна, што сармацкая мова — гэта мова ўсіх славянаў.

## Праява Новага часу

Такім чынам, Саламон Рысінскі лічыў сябе беларусам і славянінам, грамадзянінам Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.




**Полаччына.**

Самаакрэсьленьне Рысінскага як беларуса можна трактаваць як літаратурную гульню. Тым ня менш, спосаб думаньня Рысінскага пра нацыянальнасьць — безумоўна праява Новага часу. Раней у ВКЛ этнічнасьць была зьнітаваная зь веравызнаньнем. Хаця здараліся выняткі, як правіла русін быў праваслаўным, а літовец — каталіком. Рэфармацыя прынесла з сабой ломку традыцыйных этнаканфэсійных стэрэатыпаў. У тым сэнсе можна сьцьвердзіць, што Рысінскі змог падумаць пра сябе як пра беларуса менавіта таму, што быў пратэстантам-кальвіністам.

Рысінскі ніколі не вяртаўся да праблемы сваёй нацыянальнасьці, а прынамсі нічога пра гэта ня ведаем. Пасьля вяртаньня ў Вялікае Княства служыў Крыштапу Радзівілу Перуну і ягонаму малодшаму сыну, таксама Крыштапу. Да канца жыцьця пражываў ва ўласна Літве, перш за ўсё ў Вільні. Займаўся рэлігійнай дзейнасьцю, пісаў лацінскія панэгірыкі сваім дабрадзеям, зьбіраў фальклёр і выхоўваў Януша Радзівіла, у будучыні — першага здрадніка Рэчы Паспалітай.

Служба Радзівілам, заўзятым літоўскім сэпаратыстам, можа тлумачыць, чаму Рысінскі пра сваю беларускасьць больш ня згадваў — ня месца дзеля гэтага было на двары правадыра Літвы.

## Першы беларус быў пратэстантам

Паміраў першы беларус вельмі цяжка. У 1625 годзе ў Дзяляцічах, «у першы чацьвер пасьля сьвятога Марціна, пасьля поўдня, калі ён за сталом сядзеў, параліж яго ўзяў і мову яму заняў. Потым ноччу меў кадук цяжкі разоў сорак. Памяці ня страціў і бачаньня, што відаць было зь ягоных жэстаў, якія паказваў на напамінаньне ксяндза Рамаvоўскага, дазваляючы на замацаваньне яго ў веры і надзеі, аб розных артыкулах. Паліўкі і воды розныя піў, ажно ўжо ў нядзелю вечарам больш глытаць ня мог, а ўсё ж такі кадук меў, хаця ня так цяжка і ня так густа, ажно да самай сьмерці. А з панядзелка на аўторак на досьвітку, у шэсьць гадзін, пры пану Набароўскім і пры ксяндзу Рамаvоўскім, якія давалі малітвы, ды пры іншай моладзі ціхенька заснуў у Госпадзе пасьля стагнаньня цяжкага».

Крыштаф Радзівіл загадаў пахаваць астанкі Рысінскага ў Любчы і «над магілай пана Рысінскага высокі і харошы мураваны слуп узьнесьці і мармуровую табліцу ў яго паставіць, а з тылу каля гэтага слупа харошы курган насыпаць». Загад, пэўне ж, быў выкананы, але час сьцёр помнік з твару зямлі. Засталіся ад Рысінскага некалькі кніжак ды ўсе мы з вамі — беларусы.



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Невядома, дзе дакладна ў Любчы пахаваны Саламон Рысінскі.**

## АЛЯКСЕЙ ЗНАТКЕВІЧ

«ВЫЙШАЎ БЫЎ У АБЕД КУПІЦЬ ГАЗЭТУ…»

Выйшаў быў у абед купіць газэту
У восеньскі ціхі дзень.
Падышоў да кіёску, стаў за нейкім хлопцам,
А тут падыходзіць мудзіла
І лезе без чаргі, не спытаўшыся.

Той хлопец, што наперадзе, маўчыць.
Давялося мудзілу мякка адпіхнуць.
Пачакайце крыху, кажу,
І прашу цётачку ў шапіку:
«Нашу Ніву», калі ласка».

Заплаціў, узяў газэту,
А мудзіла злуецца:
«Ты, калхозьнік, пізь..ец цібе!
Пріехал тут са сваей дзіревні!»

«Гэта ты калхозьнік, а я — беларус».

Мудзілы часта ходзяць гуртам,
Вось і тады падбеглі яшчэ тры, праўда, нейкія нягеглыя.
Самы карузьлік нават нагой мяне садануць спрабаваў,
Ды я пасьпеў адскочыць.

А той першы ўсё запрашае:
«Пайдзём ва двор, толька ты і я».
Астатнім кажа, адыдзіце, маўляў,
Мы, маўляў, удвох разьбярэмся.

Можа, ён і ня поўны мудзіла быў,
Можа, сапраўды хацеў сам-насам,
Але досьвед вучыць,
Што такія рэчы лепей не правяраць,
Таму я пайшоў назад на работу.

Добра, што газэту тады хадзіў купляць.
На рагу галоўнага праспэкту — там шмат было людзей
У ціхі восеньскі дзень,
Калі «Нашай Ніве» заставалася некалькі год да ста
І яе прадавалі ў шапіках.

## АДАМ ГЛЁБУС

СЯБРЫ

Каб недарэмна чалавечы век
Пражыць пад сінім купалам нябёсаў,
Мае сябры працуюць у царкве.
Такая праца ў іх, такія лёсы.

Сябры мае малюць на сьцяне
Цяжарную Марыю зь Лізаветай,
Анёла ў прыадчыненым акне
І голуба ў аблоках сьветла-сьветлых.

## АЛЕСЬ АРКУШ

***

гэй лётчык
ці бачыш за аблокамі
зямлю
ці верыш у сілу
матораў
ці маеш абярэг
на шчасьце

колькі ў баках
паліва

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

У ЛЮБОЕ НАДВОР'Е!

Адразу за дзьвярыма — туман,
пагроза стабільнасьці нашай бацькаўшчыны.
Мяркуйце самі, колькі грошай убухалі
у пабудову новай бібліятэкі,
колькі студэнтаў гарбацілася на суботніках,
колькі электраэнэргіі штовечар ідзе
на яе падсьветку рознакаляровымі агеньчыкамі…
А спусьціўся туман — і не відаць ні халеры!

Ну і што цяпер паказваць Алене Хадановіч,
што расьсякае ў патрыманым вазочку
па мікрараёне Ўсход?

Іншая рэч — газэта «Наша Ніва»:
васямнаццаць тысяч рублёў на тры месяцы —
і ў любое надвор'е, у самы жахлівы туман,
шточацьвер званок у дамафоне.
Не, Аленка, гэта не бабуля,
ты толькі глянь, што гэта нам прынесьлі.
І Алена Андрэеўна паўзе па тваіх каленях,
падбіраецца да стала і ўважліва разглядае
фоткі й літары на паперы, круціць галавою,
то левым вокам зірне, то правым,
то схопіць за голаў вядомага палітаглядальніка,
то адарве кавалак ад літаратурнага крытыка.
Што ты, Алька, ён жа татку Нобэля абяцаў!
Толькі пасьпявай адсоўваць — ніякай літасьці
ні жартам, ні прыватным абвесткам,
ні кінарэцэнзіям, ні шахматным этудам,
ні нават калёнцы галоўнага рэдактара!

Хвіліна няўвагі — і рука дацягнулася
да партрэта вядомага палітыка!
«Так яму, так!» — радуюцца бацькі.
Дзіця зрабіла свой выбар.
Дзіця наагул расьце — і ўмее ўсё болей і болей.
Хай толькі нам прынясуць новую газэту!
Хай толькі настане чарговы чацьвер
і распаўсюднік вынырне з туману,
націскаючы на дамафон!

## ЮРАСЬ ПАЦЮПА

ЭЛЕГІЯ V

...бы музыка здалёку, з таго сьвету,
на кухні газ, як курыца худая,
сінее стальлю, п'янай ад крыві,
пралітае з бадзянкі, што камар
паўчаркі выпіў. Ініцыятыву
вось праяўляе плебс, з гадзіну недзе
бардзюры крышачы і парапэты
у вольны ад работы плённай час.
Мы зьменім дух, бо гэты верш яшчэ
ня скончаны, але пра што такое
не напісалі мы? У шыбе месяц
сынкрэтычны — макавым насеньнем
у ім Бэтговэн Людвіг Ван. Я вам
такое гэтым вечарам сказаць
хацеў. Даруйце за маўчаньне. Толькі
душа не пракаўтне густое пасты
неба і жывот яе бурчыць,
як батарэя ацяпленьня. Ціск,
тэмпэратура, быццам іншасьвет
у сьвет прыходзіць празь мяне. Было
відаць на месяцы абрысы Джорджа
Бэрклі, і дажджом сьцякла саната.

*1990 г.*

## ДЗЬМІТРЫ ДЗЬМІТРЫЕЎ

***

мітычнай мітусьнёй абшарпаны абшар:
сёй–той тэсей ў карункавым кірунку
па лёхах лябірыніцца з клубком блукаць,
па лёгіцы цаглін на мудрагелістым падмурку...

падлеткавым палётам замінаюць прамяні:
нібы спрыяе неба спрыту карнікаў ікараў,
што высьпелі на высьпе, каб бяз высьпяткаў увысь
рашуча рушыць з марай шаргануць па Шары…

дэдалы дадалі дэталь да далягляду:
жартоўны жах і жорсткасць найдасьціпнейшай
сьцяны...
у шчылінах яна! ад шчырасьці юначай!
наўпрост за ёй — Прастора безь мітычнай
мітусьні

*Сакавік 2006 г.*

***

самота:
мо там сам Бог у скрусе
бо ў курсе

як цягнецца рука
да дзьмухавечнага рухавіка




**Перадвыбарчы плякат у Чарнігаве.**

## АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ

СОН

Пастка зачыняецца. Мы едзем у падземным транспарце,
Бы мышы ў рай ці думкі з галаву на паперу.
Таму, хто стаіць насупраць, ня варта прыдумляць алібі —
Ён сёньня гатовы загінуць, бо сьлепа ў нешта верыць.

Вочы, бязглуздыя вочы, бо сьвету яны ня бачаць,
А толькі сьвятло ў канцы жыцьця ці, традыцыйна, тунэлю.
Вось толькі гэта сьвятло зусім нам не на ўдачу,
Мы ў ім ператворымся ў попел, скуматы бяздушных целаў.

Горад будзе дыміцца навінамі, страхам, плёткамі.
Міліцыя зноў з сабакамі будзе хадзіць па вагонах.
Студэнтаў будуць цягаць зноў па чарзе на допыты,
Кагосьці пасадзяць за тое, што носіць на швэдры Пагоню.

Вочы, бязглуздыя вочы камусьці заўсёды дарэчы.
Як проста ператварыць пісьменьніка ў тэрарыста,
Калі ўсе каналы дзяржаўныя, а іншыя можна адсекчы,
Як закладніку голаў ці студэнту права вучыцца.

Я мушу прачнуцца зранку, калі я яшчэ ня мёртвы,
І выйсьці на двор і мёртвых словам рабіць жывымі,
Бо слова мацней за АМОН, ППРБ і бомбы.
Слова, што прыйдзе свабода хутка ўжо на Радзіму.

ПАВАЛ КАСЬЦЮКЕВІЧ

# All I wanted All I needed

(жызн.)

*Прысьвячаецца Сяргію Жадану.*

Ну, вядома, урэшце *Depeche Mode* у Ізраіль не прыехаў.

Можна падумаць, узапраўды мог прыехаць. Я вось, прыкладам, не сумняваўся.

Пакуль Хайфа і Бэйрут сядзелі ў сховішчах ад бомбаў, у Тэль-Авіве зачаравана сачылі за амплітудай палёту ракет, як у цырку назіраюць за паветранымі акрабатамі: даляціць — не даляціць, упадзе — не ўпадзе. Ня ўпала. Менавіта тады мае сябры, выйшлыя з былога Саюзу, ачмурэлыя ад сабачай працы начнога ахоўніка, душачыся «гашам», запіхваючы ў сябе паўфабрыкаты і праганяючы іх напоем блізкаўсходняга пралетарыяту, кока-колай, слабенька так, зусім не ад'ядаючы сабе сэрца, сталі чакаць на *Depeche Mode*. Ён меўся прыехаць. 3 жніўня. І, як вядома, не прыехаў. Мартын Гор і Дэйв Гэган даслалі ліст, што мы, маўляў, хацелі, гэта нашыя гукарэжысэры адмовіліся, просім прабачэньня, мы вас любім, заўсёды радыя, шоў маст гоў он ды іншыя ваніты і локшына на вушы.

Пакаленьне дворнікаў і вартаўнікоў тады канчаткова пераканалася: Мартын Гор — прыдурак і імпатэнт. І пашкадавала таго часу, калі на сьценах блёчных дамоў у далёкай ужо ў прасторы і часе краіне выводзілі ацэтонавай фарбай запаветны вэнзэль «D» і «M». І рэч тут зусім не ў вайне, кажуць яны. Сапраўдныя героі прыяжджаюць і на лінію фронту.

Сьпявайце такой бяды гэтую песеньку разам з намі: «Мы ня любім анікога, наагул, зусім нікога, і ў тым ліку *Depeche Mode*». Дарэчы, правільна — шэйх Насралла і ніякі не Насаралла ці пагатоў Насрулла.

* * *

Сьпярша хачу паведаміць сёе-тое Вольфу Рубінчыку, рэдактару сымпатычнага бюлетэню «Мы яшчэ тут!» і рэдактару «НН» Андрэю Дыньку. Рэч у тым, што абодва прасілі мяне напісаць для іхніх выданьняў: першы што-небудзь пра ізраільскае жыцьцё, другі — апавяданьне. Я пачаў быў пісаць і тое і другое, для першага — аптымістычныя ўспаміны-дзёньнік пра цяжкасьці эміграцыі, а для «НН» — выдумваць апавяданьне пра русалчыны сьлёзы, засмучанае каханьне і таму падобны мэзальянс. Але надоечы, каб не збрахаць, 6 лістапада, на пляцы перад Тэль-Авіўскім мастацкім музеем сустрэў купку наркаманаў, выйшлых з былога Саюзу, ім было год па 30. Яны туліліся пад тутавым дрэвам і нешта такое абмяркоўвалі. Напэўна, дзе ўзяць. Я глядзеў ім у вочы і разумеў, што пісаць пра русалчыны сьлёзы я ўжо ня здолею. Такім чынам, шаноўныя Вольфе і Андрэю, кіна ня будзе! Я напісаў вам штось больш праўдзівае. Сёе-тое з жыцьця.

Памятаеце, калі былі яшчэ відэакасэты і на іхніх карэньчыках побач з назвай у дужачках пісалі жанр: «Боев.» — баявік, «др.» — драма, «ком.» — камэдыя. І быў яшчэ адзін жанр, які сустракаўся трохі радзей: ён называўся «жизн.» («жизненное кино», кінастужка пра праўдзівае, нявыдуманае жыцьцё). Дык вось, аднойчы ў Менску ў камэрцыйным шапіку я ўбачыў касэту, дзе побач з назвай (ня памятаю ўжо якой) стаяў надпіс «жызн.». Менавіта так, праз «ы». Думаю, што гэты «жызн.» ненаўмысны, трохі кплівы такі, цынічны-разьдзяўбайскі, як само жыцьцё, лепей за ўсё апісвае жанр майго аповеду.

* * *

Рэальную гісторыю зь непрыдуманага жыцьця? Ёсьць паміж Хайфай і Галянскімі вышынямі грудок з камяністым плято. Ня дужа высокі такі пагорак, мэтраў шэсьцьдзесят увышкі. Называецца ён Ар Мэгіда. У прынцыпе проста Мэгіда, бо «ар» на іўрыце азначае «гара». Цяпер там археалягічныя раскопкі ці нешта кшталту таго. Паводле Новага Запавету, напярэдадні апакаліпсісу менавіта тут мусіць адбыцца апошняя бітва паміж сіламі Дабра і Ліха. У «Адкрыцьці» Яна Хрысьціцеля гэты пагорак называецца Армагедон.

31 сьнежня 1999 году семдзесят (а многія крыніцы чамусьці настойваюць на гэтай лічбе) чалавек, выйшлых з былога Саюзу: талкіністаў, мэталістаў, панкаў, гіпі, наркаманаў і проста харошых людзей — вырашылі адсьвяткаваць надыход новага мілeніюму ў гаёчку пад гарой Мэгіда і, у выпадку канца сьвету, які гэтак назойліва ўпіхвалі народу шматлікія мэдыйныя Вангі, падмагчы чалавецтву ў фінальнай бітве зь Ліхам. Вядома, у канец сьвету тады верылася слаба, сьмех дый годзе, але, як распавядае мой сябра, навочны сьведка, тыя, што сьвяткавалі новы мілeніюм пад Мэгіда, шчыра думалі пра гэтую падзею. Паміж зацяжкамі «дзеда», барбарскімі скокамі ля кастроў і любошчамі ў кустоўі яны прызнаваліся адзін аднаму — і вогнішча ўзносіла іхнія словы ў неба, — што шчыра вераць у хуткі апакаліпсіс, бо ўсе прыкметы ўжо колькі год лунаюць у паветры, ды сьвет навокал даўно нагадвае Бабілён, які неўзабаве мае быць зруйнаваны. Не, яны ня верылі — яны ведалі, яны былі пэўныя, што заўтра — алес капут, усяленскі гамон. І мае быць апошняя бітва.

А за ляском узвышаўся грудок Армагедон.

І гэтая бітва адбылася. Хоць я сам на ёй не прысутнічаў, у галаве я часьцяком пракручваю аповед сябра. У першы дзень міленіюму, нараніцу, зь цяжкасьцю, з вось такеннай галавой ад пахмельля, уся гэтая хеўра паднялася на ўзаранае археалягічнымі раскопкамі і залітае бязьлітасным ізраільскім сонцам плято, гэтыя сем дзясяткаў учора абдзяўбаных, напаленых, закінутых «калёсамі», а сёньня амаль цьвярозых пасажыраў, трымаючы драўляныя мячы, апранутыя ў фальшывая кальчугі, што цягаюць на свае сходы талкіністы і сябры рыцарскіх гурткоў.

І яны стаялі там на гэтым мулкім плято: выйшлыя з Украіны, Грузіі, Малдовы, Казахстану, Латвіі, Азэрбайджану. Гэтых 70 бакінскіх (і ня толькі) камісараў, гэтых 70 байцоў-панфілаўцаў. Чамусьці менавіта з ўсяго воінства анёлаў, арханёлаў, сямі мільярдаў жывых людзей і незьлічонай процьмы нябожчыкаў, ня кажучы ўжо пра сілы Ліха, якія ўсе паводле задумы мусілі былі прысутнічаць на прызначаным канцы сьвету, на апошні бой выйшлі толькі гэтыя семдзесят. Пасажыры, якім ня выпала паспытаць манны нябеснай, затое ўдалося пакаштаваць дасхочу камякоў маннай кашы. Якім у трэцяй клясе травілі байкі пра дзядулю Будаленіна, а ў шостай распавядалі, які ён бэд гай і ўвогуле лашок. Пасажыры, чые мазгі ў дзевяностыя пераехала камбайнам.

Яны стаялі на тым плято і разумелі, што канец сьвету скасавалі. Яны адчувалі, што наагул Дабро і Ліха пакінулі гэтую плянэту, што прароцтва, аб якім так доўга бубнілі Настрадамус і «Камсамольская праўда», у першы дзень міленіюму не збылося. Што д'ябал пабабіў іх і сачкануў, гэтаксама як праз шэсьць з хвосьцікам год іх пабавіць *Depeche Mode*, і што ёсьць толькі гэтае сьляпучае сонца, толькі гэтае камяністае плято, гэтае клятае неба і што біцца трэба ўсё роўна. У аповедзе майго сябра мне больш за ўсё падабаецца эпізод, калі адзін мэталіст ці хто з тае кампаніі ўскараскаўся на валун і зьвярнуўся да сваіх улюбёных супляменьнікаў з прамовай: «Ну, шо, піпл? Біцца апошнім боем будзем ці як?» І ў адказ пачулася бразгатаньне драўляных мячоў і пустых ботлаў з-пад «Стопкі» ды ўзрушаны сіп шасьцідзесяці дзевяці прапітых глотак: «Бу-у-удзем, братка!»



Яны падзяліліся пароўну, па-братэрску, трыццаць пяць на трыццаць пяць — сьценка на сьценку. І яны біліся на гэтым факінг Армагедоне, самі з сабой, брат з братам. Трыццаць пяць сумленна біліся за нашых, за Дабро, за мір ва ўсім сьвеце, за чырвоных, за Радзіму, за дэмакратыю, гэтаксама як другая палова, іхнія сябры, якім паводле лёсаваньня выпала быць ліхімі сіламі, з гонарам змагаліся за мангольскае іга, за псоў-рыцараў, за фашыстаў, за праклятыя імпэрыялізм, за ворагаў дэмакратыі, за Бэн Ладэна, за вось Зла. Яны біліся да крыві, да пераломаў, да страсеньня мазгоў, покуль не прыехала паліцыя і не пахапала тых, хто не пасьпеў даць лататы, у пастарунак. У «аддзяленьне міліцыі Заводзкага раёну».

* * *

Цэнтар Тэль-Авіву, золкая восень, алея Ротшыльда, кавярня ў венскім стылі. Агнястрэльны імем і арыйскі прозьвішчам сюды завітвае Узі Вайль, адзін з найвядомейшых у краіне сатырыкаў. Мы сустракаемся тут пагаманіць наконт перакладу ягонай кніжкі на беларускую. Узі Вайль! Аўтар, які разумее сучаснасьць і сучаснага чалавека як мала хто. Чалавек, чые кнігі дапамаглі мне перажыць такую самотную зіму леташняга году. Сьпярша мне хацелася распавесьці яму трохі пра краіну, на мову якой я зьбіраюся перакладаць. Я зірнуў Узі ў вочы — Узі дэпрэсаваў. Я хацеў распавесьці пра постсавок, пра тое, які гнюсны смак быў у гарэлкі на выпускным, пра тое, што ён ні каліва не зьмяніўся пасьля выпускнога, у інстытуце, пра тое што і цяпер ён — паскудней ня знойдзеш, карацей, пра ўсё гэта. «Зразумела», — грымотна, усё роўна як дыктар па радыё, прагугнявіў Узі і засмучана глынуў з маленькай бутэлечкі содавую. Што табе зразумела, бівень? Я зірнуў у ягоныя акуляры-сподачкі, на ягоную недапітую содавую і выкшталцоную эўрапейскую тугу. І ў мяне зьявілася моцнае памкненьне, проста ўсьвядомленая неабходнасьць лясьнуць пісьменьніка ў твар. Што ты там зразумеў, карузьлік, пра сусьветны дэпрэсьняк, пра электрычкі, пра мэтафізычныя скавышы, якія дзьмуць у гэтых электрычках, ад якіх пруцянеюць ногі ў ке-

**Працяг на старонцы 36.**

# All I wanted All I needed

Працяг са старонкі 35.

дах, пра... што ты разумееш, кавярны сядзюк? Я сьцяў кулакі. І ўсьміхнуўся. Мы мірна дагаманілі, дамовіліся наконт кнігі, я распавёў анэкдот, дапіў свой капучына і праводзіў Узі да таксоўкі. Мой эўрапеец ува мне перамог. Сам ня ведаю, як гэта адбылося.

Узі, ты сышоў, а жаданьне начысьціць табе пысу засталося. Як засталося яно у майго сябрука, Ігара Сыраежкіна, Цара Ерусалімскага, пасьля сустрэчы з Жанам-Клёдам Ван Дамам. Але мой сябрук стрымаўся зь іншых прычынаў.

Ігар любіць Ерусалім. У яго ён свой. Які? Тэлефанаваньні знаёмым наркадылерам шточацьвер, бандзюкаватыя, дзе зьбіраюцца адно вышлыя з былога СССР, дыскатэкі па пятніцах, гарэлка літрамі, зарыганыя прыбіральні, шотысказаўчмо, бойкі да паўсьмерці, пераламаныя рукі і рабрыны, і ён сам, Ігар Сыраежкін Першы, соль гэтага гораду, які велічнай хадой пераможца нараніцу вяртаецца дадому ў гіпсе з больніцы «Гадаса». Ён ідзе ранішнімі вулкамі, і сонца прыветна, як роўнаму, глядзіць Ігару ў твар.

Так і жыў ён жыцьцём ерусалімскага манарха, ціхамірна, аж да самага візыту Жана-Клёда Ван Дама. Як састарэлы жыгала, які, каб давесьці сабе сваю вартаснасьць, шукае сабе ўсё маладзейшых каханак, так на схіле сваёй кар'еры Жан-Клёд шукае ўсё экзатычнейшыя мясьціны для сваіх фільмаў. Сходы маніякальных сэктаў на антычных крушнях старога гораду, кунг-фу на фоне краявідаў зь Мёртвым морам, страляніна на сярэднявечных вулках і таму падобная лухта. Кіно, якое здымалі з удзелам Ван Дама ў Ерусаліме, называецца «Тайна ордэну». Стоадсоткавая дрэнь. Калі выйдзеце на пэнсію — абавязкова вазьмеце паглядзець, і добры стул вам забясьпечаны.

Дык вось. Сьляпучая раніца. Ігар Сыраежкін з чарговым гіпсам на правай руцэ вяртаецца дадому вулкамі старога гораду і бачыць натоўп разявакаў, масоўку, бодзігардаў. І сярод іх — Ван Дам! Цэнтнэр спрэсаваных цягліц. Кумір дзяцінства. Уласнай пэрсонай. І так блізка. Здаецца, дасі пендаля яму па ягоным накачаным задзе і дастанеш потым пару кухталёў. Вось ён, кумір, можна ў пысу заехаць, здароў, Жан-Клёдзе, нагой у жывот — мус, прывітаньне ад ерусалімскіх пацаноў, красунчык, а там ужо як пойдзе, пляжыць, лупцаваць, як табе мая левая, дарлінг, дубасіць галівудзкую зорку, пакуль ня скруцяць целаахоўнікі. Потым будзе, вядома, балюча, бо целаахоўнікі вунь якія мажныя. Але якое значэньне маюць іхнія кулакі ў параўнаньні зь пендалем, рэальным пендалем пад зад самому Жану-Клёду Ван Даму, які ў позьнесавецкім гіт-парадзе дзіцячых багоў саступаў адно Рэмба і Шварцнэгеру.

Але, павагаўшыся, Сыраежкін урэшце не заехаў Ван Даму, бо яму надта спадабалася прыгажосьць гэтага крыштальнага імгненьня, эстэтыка няспраўджанага: ягоны ўлюбёны Ерусалім, першыя промні сонца за Аліўнай гарой, ён, Сыраежкін Ігар, поўны мядзьведжай сілы, а побач Жан-Клёд Ван Дам, кумір дзяцінства, ягонае беззаганнае галівудзкае цела, цэласьць якога ліпіць на валаску, залежнае толькі ад яго, Ігара Сыраежкіна, волі. І завіслы ў паветры пендаль пад зад. Я ўпэўнены, што Ігару не слабо было вытнуць Ван Дама. Ну, зламалі б Сыраежкіну целаахоўнікі не адну рабрыну, як зазвычай яму ламалі на дыскатэках, а тры. Якая Сыраежкіну розьніца?

Я паважаю Ігара нават больш, што ня вытнуў, што акурат мог, але паўстрымаўся. Ня біў, як заўсёды б'е, а спыніўся, бо заўважыў у тым зіхоткім імгненьні нешта выключнае. А мне становіцца сорамна, што тады ў кавярні, з Узі Вайлем, я наадварот спудлаваў і не заехаў.

Мы сядзім і ўважліва слухаем Сыраежкіна. Мы ўсе даўно выдатна ведаем сюжэт, аднолькава любім у ім Ігара і Жана-Клёда ды лічым, што гэта — найпрыгажэйшая гісторыя, якую толькі можа распавесьці чалавек. Мне нават падабаецца, што гэты выпадак Сыраежкін распавядае па дзясятым коле, красава! Як чарговы раз дастае гэты каштоўны дыямэнт з кішэні, поўнай саплей, гераіну і дваццацішэкелевых купюр. Яго адкшталтаваны да неймавернасьці лексыкон, калі апісвае фігурыстасьць кумірскага азадка і смачнасьць неадпаленага пендаля. Каб вы ведалі, начысьціць морду Ван Даму — гэта ўсё адно, што перапаць з Алісай Селязьнёвай.

* * *

Бог зь ім, з Depeche'ам. І што ты возьмеш з Узі Вайля? Ён чалавек зь іншай плянэты. Час ад часу я сустракаю некаторых удзельнікаў той бітвы на Армагедоне. Іхнія ногі пакуль што ходзяць і трымаюць сваіх уладальнікаў на зямлі. Ігар Сыраежкін цяпер працуе праграмістам у адной кампаніі high tec, праходзіць рэабілітацыю ад наркаманіі. Зь Ігарам усё будзе добра. Калі да нас не прыедзе Сільвэстар Сталёнэ. Бо гэтым разам Ігар можа не стрываць. Нэрвы, знаеце.

Пакаленьне DM крочыць па плянэце. Па вуліцах Менску, Харкава, Мюнхэну, Тэль-Авіва. З таўром ГОСТу на пакуль слабаакрэсьленых плехах. З кавалкамі квашанай, made in Germany, капусты на стралецкай барадзе. Унучкі Гарбачова і дзеці Саманты Фокс. Усё, што яны ведаюць, гэта тое, што іх каўбасіць не па-дзіцячы. Жыцьцё — марная марнасьць і пагоня за ветрам, але яны, яны не ганяюцца за ветрам, ён сам дзьме праз іхнія дзюравыя лёгкія, прыбівае папяровыя плечы да самюткай зямлі. Час кароткі. Калі-нікалі мне здаецца, што я зьліваюся зь імі ў суцэльнай джынсамасе, а часам, што яны мне чужыя, што я ім не належу і што на тым, яшчэ да майго нараджэньня, шалёным кастынгу мяне выбралі на ролю жывога і я жыцьму доўга-доўга. Мо да 47.

All I ever wanted,
All I ever needed
Is here in my arm.

Усё, чаго я жадаў,
Усё, што мне было трэба, —
*Вось яно, у маіх руках.*

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ

# Шампуры і мяса

*Завецца ж спадчына мая*
*Ўсяго Старонкай Роднаю.*
***Янка Купала***

Помнікі не паўстаюць раней за падзеі. Яны толькі падкрэсьліваюць, што нешта не забыта й не закінута, працягвае ўплываць, і каб надалей захоўваць дзейснасьць уплыву, мае патрэбу ва ўзнаўленьні. Была зьява: літаратурная дзейнасьць беларускай эміграцыі па той бок жалезнай заслоны. Амаль не вядомая на радзіме ў час СССР, яна атрымала гістарычны шанец і адыграла сваю ролю падчас перабудовачнага вызваленьня розумаў. Тыдзень за тыднем вёў у этэры цудоўныя гутаркі пра беларускую старасьвеччыну Вячаслаў Ракіцкі і ягоныя суразмоўцы, і цяпер гэтыя словы леглі на паперу. Адбываецца ня толькі перавыданьне, але ствараецца нешта новае, і — парадаксальна — у той жа час другаснае: сьведчаньне памяці, помнік раней зробленай працы, знак нашай пашаны да рупліўцаў. Другаснасьць тут успрымаецца як дадатковая плашчыня зьместу.

Рэакцыя, якую выклікаюць гэткага кшталту кнігі-помнікі, амаль цалкам вызначаецца кантэкстам, у які яны трапляюць. Сёньняшні кантэкст, і ў тым ліку юбілей «Нашай Нівы», робіць выданьні напамінам пра адносны характар нашага руху наперад, і гэта падаецца больш актуальным, чым аналіз саміх кніжак.

З аднаго боку, рух навідавоку. Дастаткова зірнуць у выдадзены на пачатку 1980-х рэвалюцыйны на той час альбом «Жывапіс Беларусі XII—XVIII стагодзьдзяў», каб пабачыць там «Партрэт невядомага», у якім сёньня нават неспэцыяліст лёгка пазнае Радзівіла Рыбаньку. Разгарнуўшы «Каханы горад», трапляеш на **знаёмыя** імёны і творы: безумоўны прагрэс і дасягненьне.

Але акрамя гэтага прыемнага пачуцьця пазнаваньня, два выданьні 2006 г. ставяць межы нашай радасьці, бо дагэтуль застаюцца актуальнымі чыста інвэнтарнага характару зьвесткі пра мінуўшчыну, і дагэтуль творы, сабраныя ў «Каханым горадзе», хаця ўжо ўлучаныя ў беларускую літаратуру, не перадалі эстафэту сучасным пісьменьнікам. У абодвух разох можна канстатаваць, што па-ранейшаму захоўваецца стан сымбалічнай апазыцыі: аднаму пантэону гістарычных дзеячаў процістаўляецца іншы, беларускі, савецкай літаратуры — літаратура эміграцыйная, але пры параўнаньні не ўжываецца аніякіх крытэраў, акрамя наяўнасьці/адсутнасьці.

Сп.Ракіцкі з суразмоўцамі стварыў новы, удасканалены й пашыраны, багата ілюстраваны каталёг нашай гераічнай мінуўшчыны, годна працягнуўшы (а дзе й перасягнуўшы) папярэднікаў — Ластоўскага, Караткевіча, аўтараў «100 пытаньняў і адказаў з гісторыі Беларусі» і іншых. Перадача, а за ёй і кніга істотна наблізілі да людзей шэраг цікавых фактаў, якія маюць усе падставы ўвайсьці ў нацыянальную сьвядомасьць.



**Вячаслаў Ракіцкі. Беларуская Атлянтыда.** — Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2006. — (Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе).



**Каханы горад: Зборнік эміграцыйнае ваеннае прозы.** — Менск: Беларускі кнігазбор, 2006.

Складальнікі й выдаўцы «Каханага гораду» стварылі яшчэ адну магчымасьць пазнаёміцца са здабыткамі эміграцыйнай літаратуры, якія маюць поўнае права прэтэндаваць на месца ў культурным багажы адукаванага беларуса. Але — і тут мы гаворым не пра кнігі, а пра кантэкст — вышэй за сілы згаданых дзеячаў перавесьці гэтыя каштоўнасьці са стану пасіўнае даступнасьці ў больш актыўны стан прысутнасьці. Два тамы ўдасканалілі тое, што й бязь іх мела месца, і ў чарговы раз падкрэсьлілі, што мяжа паміж наяўнасьцю й выкарыстаньнем «рэпатрыяваных» культурных каштоўнасьцяў збольшага неперааодоленая. Складзены яшчэ адзін падрабязны каталёг спадчыны, асобныя рэчы выстаўленыя перад самыя вочы нашчадкаў, але ўступленьне ў правы адбываецца з зусім іншай хуткасьцю.

Не ў апошнюю чаргу з тае прычыны, што вартасьць прапанаваных скарбаў вельмі шмат залежыць ад спосабу выкарыстаньня. «Запіскі эмігранта» Л.Савёнка просяцца на сцэну і ў этэр, маляўнічыя падрабязнасьці мінулага зь «Беларускай Атлянтыды» крыкам галосяць аб выкарыстаньні ў кіно ці літаратуры, але самі па сабе гэтыя тэксты не выглядаюць на добрую чытанку. Усё нарыхтавана: і шампуры, і мяса, і паліва, і смакавітыя дадаткі, але гатовага шашлыку — няма, і вогнішча не гарыць. І гэты стан трывае ўжо вельмі працяглы час.

Зьяўленьне кожнай папулярнай (ненавуковай) працы, скіраванай на агульнаасьветныя функцыі ў пытаньнях Беларушчыны, раз за разам падкрэсьлівае адсутнасьць хаця б роўнага сілай патоку мастацкіх твораў, дзе выведзеныя на дзённае сьвятло шэрагі фактаў і падрабязнасьцяў асэнсоўваліся б і набывалі новае жыцьцё. Мала пазначыць нашу спадчыну ў часе і прасторы, трэба спрабаваць завесьці на ёй гаспадарку.

# Ці прыйдзе збавеньне?

Сучасныя спробы атрымаць максымум эфэкту ад рэлігійнага рэнэсансу 1990-х, хоць і пашыраюць абрад, але падважваюць веру. Піша **Алег Дзярновіч**.

Гэтымі восеньскімі днямі, але толькі 1517 году, Марцін Лютэр прыбіў да брамы Вітэнбэрскага кляштару тэзы супраць індульгенцыяў ды слаўнага іх прадаўца Ёгана Тэцэля, які дасягнуў вяршыняў у бессаромнасьці свайго рамяства. 95 тэзаў, прызначаныя для ўласна тэалягічнай дыскусіі, вельмі хутка сталі шырока вядомыя ды нечакана выклікалі масавую і палкую дыскусію. Працэсы, якія былі падштурхнутыя абурэньнем ад дэкадансу клеру, скончыліся ня проста зьменамі ў царкве, але прывялі да перагляду фундамэнтальных дагматаў каталіцтва. Першапачаткова ж палемічныя стрэлы скіроўваліся супраць індульгенцыяў — спэцыяльных граматаў, выдадзеных ад імя папы, якія былі сьведчаньнем дараваньня грахоў — тых, што зьдзейсьненыя, і тых, што будуць учыненыя. Індульгенцыя выдавалася за асаблівыя заслугі перад царквой альбо за грошы. Акурат у канцы Сярэднявечча практыка продажу індульгенцыяў дасягнула неверагодных маштабаў, і ў гэтай праблеме сфакусаваліся незадаволеньне і расчараваньне ў пазыцыі царквы ў тагачасным грамадзкім жыцьці. Індульгенцыі можна было купіць паўсюль — ня толькі ля храмаў, але і на кірмашах. Хоць продаж індульгенцыяў меў і зусім іншы эфэкт ужо для гісторыі культуры. Папа Леў X, які паходзіў з роду Мэдычы, упрыгожваў галерэі Ватыкану творамі Рафаэля ды выдаткоўваў вялізарныя сумы на актыўнае будаўніцтва. Гэтыя ініцыятывы аплачваліся «нямецкімі грахамі» — грашыма, якія праз індульгенцыі вымантачваліся з кішэняў «заальпійскіх барбараў».

Сёньня паўсюль: у падземных пераходах Менску, у прадуктовых крамах ва ўсіх гарадох Беларусі — можна пабачыць кіёскі альбо пункты збору ахвяраваньняў на карысьць Праваслаўнай Царквы. Часам гэта вядзе да паніжэньня і так невысокіх стандартаў беларускага гандлю, бо там, дзе былі скрынкі для торбачак пакупнікоў, зьявіліся паліцы з абразамі. Вось у гэтай ідэі паўсюднай прысутнасьці прыхаваная небясьпека для традыцыйнай рэлігійнай сьвядомасьці.

У 1950—1960 гадох у Францыі маладыя каталіцкія сьвятары, каб быць бліжэй да сваіх парафіянаў, пайшлі на фабрыкі. Яны працавалі побач з заводзкімі работнікамі і меркавалі, што спрыяюць пашырэньню Эвангельля. Вынікам стала яшчэ большая сэкулярызацыя францускага грамадзтва. Так і сучасныя спробы атрымаць максымум эфэкту ад рэлігійнага рэнэсансу 1990-х хоць і пашыраюць абрад, але падважваюць веру. Біблейская максыма «Богу Богава, а кесару кесарава» мае найперш значэньне падзелу сьвецкай і сьвятарнай сфэраў. Тое, што ёсьць атрыбутам рэлігійнага жыцьця, дарэчы, і ў царкве, ня мусіць вытыркацца з кожнага закуточку нашай паўсядзённасьці.

# Гадаваньне на чужых мовах

«Тата, а ў той дзяўчынкі таксама тата, а ня папа...» Піша **Руслан Равяка**.

Сёлета адпачываў у Ялце. Мая дачка, перабіраючы на пляжы каменьчыкі, пазнаёмілася з аднагодкаю-ўкраіначкаю. Тая лепятала на сваёй мове, мая, нагуляўшыся, падбегла да мяне і кажа:

— Тата, а ў той дзяўчынкі таксама тата, а ня папа…

Гэткая рэакцыя маёй дачкі дзеля таго, што ходзіць яна ў расейскамоўны садок.

Прыпомнілася, як у 1996 годзе я зьбіраў подпісы за чарговага кандыдата. У адной кватэры падпісвалася маладая сям’я, расейскамоўная. Пачуўшы маю беларускую, раптам аднекуль з пакою выбег хлопчык гадоў чатырох і пачаў сакатаць па-наску. Як выявілася — водзяць у садок з нашай моваю. Мяне гэта тады моцна ўразіла. Падалося, што ня ўсё згублена на той неспакойны час. Садок заклаў у малога больш, чым ягоныя бацькі. Прынамсі навучыў роднай мове, даў адчуваньне прыгажосьці яе гучаньня.

Навукоўцы кажуць, што роднасьць моваў назаўжды прапісваецца ў розуме да шасьці гадоў. Што прапішацца цяперака ў галовах малога пакаленьня, калі людзі ўсё больш адрываюцца ад вёскі ды ня чуюць мовы на тэлебачаньні? Некаторым дзецям нават «Калыханкі» не паказваюць, пераключаючы на расейскамоўны аналяг на СТБ.

Ня так даўно ў нас гасьцявала жончына сяброўка, што стала жыве ў Менску. Пабачыўшы дубляваны па-беларуску мультфільм, што глядзела мая дачка, сяброўка зьвярнулася да маёй:

— Як добра, што вы паказваеце дзіцяці фільмы па-беларуску. Мая ж сёлета пайшла ў школу, і беларуская мова для нас сталася пакутаю. Дачка плача, што нічога не разумее. Ніколі ж раней ня чула. Відаць, давядзецца наймаць рэпэтытара.

Мая расейскамоўная палова ўздыхнула з палёгкаю — прынамсі, у адным прадмеце нам грошай на рэпэтытара выдаткоўваць не давядзецца.

У Баранавічах існуе прыватная школка ці, лепей сказаць, курсы для дзяцей. Іншыя мае знаёмцы водзяць туды сваю дачку пасьля школы, ад 19-й да 21-й гадзіны, а таксама ў суботу. Выкладаюцца розныя прадметы для розных узростаў. Напрыклад, за 75 тыс. у месяц дзяцей там вучаць беларускай мове. Цяпер у групе 9 чалавек. Дарэчы, добрых спэцыялістаў у роднай мове ў горадзе менш, чым высакаклясных выкладчыкаў ангельскай, нямецкай ды нават польскай.

Хацелася б, каб я памыляўся, магчыма, што настаўнікі роднай мовы проста невядомыя — бо незапатрабаваныя…

*Баранавічы*

# Зроблена рукамі Альбіны Юдчыц

берасьцейскае апавяданьне

**НАТАЛКА БАБІНА**

Касьцюмчык быў скамечаны. Касьцюмчык з поліэстэру для фізкультуры; толькі мой касьцюмчык у свой час ляжаў у адмыслова пашытым палатняным мяшэчку, а касьцюмчык Томці — у поліэтыленавым; але як мне запомніўся той палатняны, так Томця будзе памятаць гэты. І пах поліэстэру, скамечанага адразу ж па ўроку і засунутага ў мяшэчак.

Восень.

Ужо зімна.

Попелішча зарастае зялёнымі калівамі.

Я нарадзіла Томцю лёгка. Здаецца, можна сказаць, што роды былі самыя лёгкія. Яны былі натуральныя і зразумелыя ў маім расхістаным і штучным жыцьці.

Маці перастала са мной размаўляць адразу пасьля таго, як я паведаміла ёй, што ў мяне будзе дзіця. Не, спачатку яна накрычэла на мяне. Сэнс крыкаў зводзіўся да таго, што яна, маці, ня ведала, наколькі я дурная. Ведала, што дурная, але ня ведала, што настолькі. Але шчыры дзякуй маці, што яна не спрабавала выгнаць мяне з кватэры — кватэры, якая засталася па бабулі, кватэры, куды маці засяліла мяне, каб я ўладкавала свой лёс, і дзе, замест гэтага, я напоўніцу праявіла сваю дурасьць.

І мы сталі жыць з Томцяй.

Калі я, празь сьлёзы, упершыню пабачыла Томцю, мяне зьдзівіла, наколькі яна падобная да свайго бацькі. Але нават гэта ня зьменшыла майго шчасьця. Аднак потым, калі дзяўчынка з кожным месяцам станавілася ўсё больш падобная да мяне, я зразумела, што мяне гэта кранае неяк па-асабліваму. Час зьвіваецца ў скруткі, і аднойчы ў парку, на старых арэлях, я пабачыла саму сябе трыццаць год таму, русявую і цыбатую.



**Наталка Бабіна** — пісьменьніца. Нарадзілася ў Заказанцы (Берасьцейшчына). Жыве ў Менску.

Томця пайшла ў школу.

Як і трыццаць год таму, у Берасьці няма ніводнай беларускай школы, ніводнай беларускай клясы. Як няма ні польскіх, ні ўкраінскіх. Не адчуваючы сябе ў сілах барукацца з гумовымі людзьмі, я адвяла Томцю ў трынаццатую сярэднюю школу, дзе калісьці вучылася сама. Тут гулка і цемнавата, а ў спартовую залю трэба ісьці праз галерэю.

Толькі дзіця будзе любіць цябе ні за што і нават насуперак усяму.

Прыхапіўшы ранец і мяшэчак зь фізкультурнай формай, мы ідзем са школы, і Томцін сябрук Назар распавядае пра рымскіх глядыятараў, і што ягонага дзядзьку забралі ў Магілёўцы, і што ў яго ёсьць мульцік «Мадагаскар», і што летам, калі ён быў з сабакам у лесе, то міма іх нехта прабег.

— Чалавек? — удакладняю я.

— Не, — гаворыць ён. — На чатырох лапах, а сабака страшна гаўкаў!

Мне хочацца абараніць Томцю ад усяго, але я ведаю, што гэта немагчыма.

Томця сядае рабіць урокі. Яна трымае асадку троху ня так, як трэба, і занадта схіляецца над сшыткам, але не даецца, каб я паправіла. Я пакідаю яе на самоце.

Ар'ян даслала фотку. Яна стаіць на тле свайго поля, а Паўль абдымае яе так, каб мы бачылі вялізны круглы жывот. Ар'ян на часах, засталіся мо якія дні. Я пішу ёй некалькі вясёлых слоўцаў і націскаю «Адаслаць». Калі Ар'ян прыехала да нас упершыню, яна прывезла нам у падарунак нож для нарэзкі сыру і кулёчак каштанаў. «Гэта ёсьць ядомы каштан, — тлумачыла яна. — Ён расьце на двары ў маёй бабулі. Мы зьбіраем некалькі мяхоў і ямо ўсю зіму. Мы пражым іх на жароўні».

— Мама! — Томця паднімае галаву ад прапісяў. — Я ня веру Назару.

— Наконт чаго?

— Што каля іх нехта прабег на чатырох лапах.

Назар, Ян, Мілена, Ева, Багданка, Саўка — так завуць Томціных дружбакоў з клясы. У нашай клясе было тры Наташы, чатыры Лены, тры Сьветы, а рэшта — Ірыны.

Я адкідваю бульбу і закрашваю алеем капусту. Потым я яшчэ завару сабе кавы, а Томці зраблю чакаляды.

За вокнамі сячэ дождж. У цемры чуваць рыканьне машын; гудзіць цеплаход над ракой; вокны сьвецяцца. Сёньня дзяды, але талеркі не дрыжаць і ня падаюць долу са стала.

Томця есьць і курчыць мінкі, і я раблю ёй заўвагу.

Вось і ноч. Бомкнуў кампутар: Паўль шчасьлівы паведаміць, што Ар'ян нарадзіла дзяўчынку. У сьпісе на рассылку ня менш за паўсотні адрасоў. Я ўяўляю, як цяпер Паўль танчыць і скача на сваёй фэрме пад Дэльфтам; уяўляю, як пачуваецца Ар'ян у больнічнай палаце, як яна разглядае сваё дзіця. Уяўляю, як перад іхным домам шуміць вялізны стары каштан пад гэтым дажджом.

Я дасылаю ім віншаваньне і сядаю за работу. Зараз я зраблю ім падарункі, маёй любай сяброўцы і ейнай дзяўчынцы.

Я вяжу вельмі хутка.

Томця бледная, як усе дзяўчынкі ў горадзе. Яна скінула коўдру, а тонкія ручкі схавала пад падушку.

Я і мая дзяўчынка, у вышыні і цемры над горадам, над ракой, над машынамі, там, дзе сячэ дождж, дзе пралягаюць паветраныя дарогі дзядоў, дзе цячэ час, дзе сьвішча вятрыска. Вось і гатова: пульхны мілы касьцюмчык для малой і стылёвы жакет для Ар'ян. Зараз яшчэ наляплю свае фірмовыя ярлычкі:

*Handicraft by Albina Judčys*
*Belarus*

А калі — ужо хутка — разьвіднее, то зялёныя калівы ўжо спрэс заплятуць попелішча, і жыцьцё са сьмехам пойдзе сабе далей.

# Бацьвіньне

Многія супы ў беларускай традыцыйнай кулінарыі носяць назву, аднолькавую зь іхнім галоўным інгрэдыентам: буракі, капуста... Такая ж лёгіка закладзеная і ў назву бацьвіньня, знакавай калісьці стравы, сымбалічнасьць якой сёньня амаль забытая. Акадэмічныя слоўнікі тлумачаць бацьвіньне як:

1) лісьце і сьцёблы буракоў;

2) страву, прыгатаваную з бураковых лісьця і сьцёблаў.

Да гэтых значэньняў варта было б дадаць і трэцяе: адмысловы гатунак буракоў, які вырошчваюць менавіта дзеля бацьвіньня, а не караняплодаў. Гэта так званыя лісьцевыя буракі, або мангольд, як называюць іх немцы. У Эўропе гэтая зяляніна досыць папулярная, а ў нас малавядомая, але паколькі хвалі спажывецкай рэвалюцыі няўхільна нас накрываюць, дык зарэзэрваваць за ёй гістарычна абгрунтаваную назву варта ўжо цяпер.

Але маладое лісьце надаецца на салаты, супы і іншыя стравы і ў звычайных буракоў. З бацьвіньня, як і ўласна з буракоў, можна гатаваць халаднік. Аднак *халаднік*, таксама як знакавая страва, заслугоўвае асобнай размовы, а гэтым разам мы ўсё ж пагаворым пераважна пра бацьвіньне гарачае, ня тое каб зусім забытае ў Беларусі, але без належнай рэпутацыі, «рэстараннай прапіскі» і зь цьмянай для большасьці нашых сучасьнікаў міталёгіяй.

Сэзон на бураковае бацьвіньне трывае досыць коратка, 1—2 месяцы, так што стравы зь яго ядуць пераважна ўвесну ці на пачатку лета. Пазьней, калі пачнуць разьвівацца караняплоды, бацьвіньне робіцца грубейшым і нясмачным, таму ласавацца бураковым лісьцем трэба, пакуль яно маладое ды далікатнае. Зрэшты, сэзон можна і працягнуць. Па-першае, можна скарыстацца лядоўняй. Але нашы продкі рабілі інакш. Бацьвіньне буракоў, як і іншую «дармавую» зяляніну — лісьце шчаўя, крапівы, лебяды, у траўні-чэрвені зьбіралі да іх цьвіценьня, складвалі ў фаскі і макітры, перасыпалі сольлю, дадавалі кмену і іншых духмяных зёлак, салілі ў запас, а пазьней да самай восені гатавалі розныя вадкія стравы (варывы). Але, напрыклад, у праваслаўнае сьвята Дня адсячэньня галавы Івана Прадцечы 11 верасьня (29 жніўня ст.ст.) чырвонае бацьвіньне баяліся варыць дзеля прымхаў, бо верылі, што інакш у доме на працягу году пралiецца чыя-небудзь кроў. Зрэшты, хоць наша бацьвіньне вядомае і ў посным варыянце, яно ўсё ж лепш праяўляе свой характар у тлустай, скаромнай вэрсіі. Гаршкі ці саганкі на кіслыя стравы (бацьвіньне, боршч, капусту, шчаўе) былі заўжды асобныя, адрозныя ад посуду для варкі прэсных: крупніку, заціркі, макароны.

Самы просты традыцыйны спосаб заквасіць бацьвіньне — хутка, на адзін вар — накрышыць, апарыць, дадаць некалькі скарынак чэрствага чорнага хлеба і пакінуць (лепш за ўсё ў керамічным гаршку) на 2—3 дні. Зрэшты, калі няма магчымасьці або цярпеньня чакаць, можна проста скарыстацца лімонным квасам. Лісьце буракоў і так мае натуральны кісьлявы смак, а сьцёблы — саладкаваты, гэтае спалучэньне і робіць смак бацьвіньня такім асаблівым, можна сказаць — падкрэсьлена сармацкім.

Як і большасьць іншых вадкіх страў, бацьвіньне доўгі час «закалочвалі», г.зн. загушчалі мукой, пакуль у XIX ст. не распаўсюдзілася бульба. Як вядома, любы сялянскі суп мусіў быць вельмі густы (бо другой стравы найчасьцей і не было), зь іхніх больш рэдкіх гарадзкіх аналягаў кпілі — «крупіна за крупінай ганяецца з дубінай». Штосьці крухмалістае абавязкова мусіла дадавацца дзеля г.зв. «путранасьці». Спачатку вараная бульба дадавалася ў бацьвіньне пераважна расьцёртая ў «камы», але ў больш сучасным варыянце гэта проста пакрышаная бульба. У літоўскай кухні дагэтуль дадаюць панцак (ячныя крупы). Смак бацьвіньня выдатна падкрэсьліваюць варанае яйка і кроп — гэтыя два дадаткі можна лічыць абавязковымі для бацьвіньня, незалежна ад таго, ці мы варым халаднік, ці гарачы суп з бацьвіньня. Таксама клясычны дадатак да ўсіхварыў такога тыпу — сьмятана (або сыракваша ці масьлянка).

Бацьвіньне было настолькі характэрнай стравай жыхароў ВКЛ, сучасных Літвы і Беларусі, што ў Кароне (Каралеўстве Польскім) XVII—XVIII ст. іх называлі *boćwiniarze* — грэблівая мянушка, у якую ўкладаўся прыкладна такі зьмест, як пазьней у «бульбашоў». Для напышлівага паляка было відавочна, што толькі такі дзікун, як ліцьвін, можа есьці гэтую «сьвінскую» страву (што праўда, бацьвіньне і дагэтуль сапраўды часта вараць сьвіньням). Бацьвіньне, бярозавік і жонкі, якія нібыта легкадумна і ледзь не са згоды мужоў дораць сваю пяшчоту першаму-лепшаму госьцю, — такі стэрэатып ліцьвінаў быў калісь распаўсюджаны ў нашых заходніх партнэраў у «саюзнай дзяржаве» таго часу. Кожны трэці сойм Рэчы Паспалітай, які мусіў праходзіць у «барбарскай» Горадні, лічыўся занадта вялікай саступкай «сэпаратыстам»:

«Litwa sejm z Warszawy przeniosła do Grodna, Gdzie dotąd z wilki dzikie sejmowały świnie. Trudno też o inakszy dowcip na boćwinie» («Літва сойм з Варшавы перанесла ў Горадню, Дзе дагэтуль саймавалі дзікія сьвіньні з ваўкамі. Цяжка знайсьці інакшы дамарошчаны досьціп»).

Яшчэ адна зьдзеклівая прымаўка з таго часу: «У нашага Радзівіла бацьвіньне нарадзіла, а хлеба — ані кавалка». Але ж і бураковае бацьвіньне не расьце само — як і збажына, яно патрабуе сякой-такой працы, пра што кажа вершык








зь беларускага дзіцячага фальклёру:

Хто ня ўмее араць,
Таму хлеба ня даць,
Ні капусты, ні бацьвіньня.
Хай пасець у полі сьвіньні.
Яму сьвіньні дакучылі,
Хутка араць навучылі.

Нягледзячы на ўсе кпіны, бацьвіньне (па-польску *botwinka*) урэшце увайшло ў канон польскай кухні як «крэсовая» або «літоўская» страва — хоць, як і ў іншых выпадках, мала хто з сучасных палякаў усьведамляе шматзначнасьць гэтага азначэньня: «літоўскі». Сёньня палякі саромеюцца бацьвіньня менш, чым беларусы, і сьмела экспэрымэнтуюць з інгрэдыентамі: курыны булён, ракавыя шыйкі, шпарагі, любіста... Зрэшты, усе гэтыя прадукты — частка нашага супольнага «сармацкага» канону, табуаванага ў XX ст.

У Літве, зь якой мы, па сутнасьці, дзелім адну кухню, як і адну гісторыю, бацьвіньне называюць *lapienл* (ад lapas — «ліст»), але і ў паўночна-заходніх дыялектах беларускай мовы ёсьць гэтае слова: лапеня. Яе гатуюць ня толькі з маладых буракоў, але і са шчаўя, лебяды, сьніткі, дзьмухаўца, крапівы. Але ж і па-беларуску «бацьвіньне» ў шырокім сэнсе азначае націну любой з гэтых расьлін). Яшчэ адзін варыянт беларускай назвы «бацьвіньне» — бацьвіньнік. Ня грэбавалі гэтай стравай і беларускія габрэі, пра што сьведчыць прозьвішча чэмпіёна сьвету па шахматах М.Бацьвіньніка, чые продкі былі зь Менскай губэрні. Расейская *ботвинья* — страва, роднасная нашаму бацьвіньню, але ня тоесная. Па-першае, гэта выключна халаднік, звычайна на квасе, гарачай вэрсіі сучасная расейская кухня ня ведае. Па-другое, у якасьці зеляніны ў ёй цяпер чамусьці зусім не ўжываецца бацьвіньне буракоў, а толькі крапіва, лебяда, шчаўе, шпінат, зялёная цыбуля і г.д. Па-трэцяе, у яе заўжды кладуць (асобна адвараную) рыбную паляндвіцу — асятра, ласося, сьцерлядзі, судака і г.д.: таннае бацьвіньне і дарагая рыба складаюць своеасаблівы кантраст. У сучаснай Расеі гэтая страва, бадай, ператварылася ў своеасаблівы «атракцыён» для заходніх турыстаў, бо ў яе дзе-нідзе дадаюць і вішні, і дыню, і нават віно ды гарэлку — магчыма, гэтая экзотыка сапраўды паўтарае капрызныя густы паволскіх купцоў часу ці то Астроўскага, ці то Міхалкова, але ад супольных каранёў з нашым бацьвіньнем, калі такія былі, адышла досыць далёка. Зрэшты, імкненьне зьдзівіць гасьцей экзотыкай у наш кліпавы ды кічавы, постмадэрнісцкі час абсалютна непазьбежнае, ну то і ў радаводзе нашага бацьвіньня можна пашукаць чагосьці гэткага. Але адрозна ад расейскай сваячкі, гэтая страва наўрад ці ўпішацца ў посны фармат. Як сьцьвярджаў калісьці вялікі містыфікатар Вацлаў Ластоўскі, «асабліва славіцца бацьвіньнік зь сьвінымі ванглёнымі вушамі і скабамі, белены сьмятанай». Я такога не каштаваў, але чамусьці хочацца верыць, што менавіта такую страву і трэба прызнаць кананічнай, самай сапраўднай крывіцкай. Можа быць, яе варта назваць «бацьвіньне a la Lastowski», або «бацьвіньне падзісенску»? Хай бы за гэтую ідэю ўхапіліся землякі Ластоўскага ды Драздовіча з былога Дзісенскага павету, багатага калісь на містыку і аўтэнтыку, мусіць, яшчэ з часу, калі тут моцна і яскрава, як нідзе больш у краіне, сутыкнуліся полацкі і літоўскі ўплывы.

**Алесь Белы**

### Ва ўспамінах Юльляны Мэнке

**(каханкі Івана Луцкевіча) ёсьць кавалак пра тую бацьвіну: «Памятаю толькі, што ўсе прыносілі Сьвятому Дзіцяці дары й затым пялі: «Вось прыйшлі і два Ліцьвіны, прынясьлі гаршчок бацьвіны! Ах, дурныя вы, Ліцьвіны, не хачу вашай бацьвіны!» Затым была прыпеўка: «Скачы, Саўка, скачы, Машка, выпіў сам гарэлкі пляшку» і ішлі скокі. Адзін наш работнік, які быў зь Беласточчыны, падтрымаў тату ў гэтых скоках. Мы ўсе сьмяяліся. Потым тата апавядаў, што хлапчуком, калі яго бацькі жылі ў Хорашы ля Беластоку, ён бегаў зь дзяцьмі Хрыста славіць і пяяў зь імі беларускія калядкі і гэтую яшчэ прыпомніў».**

### Бацьвіньне

*450 г костак для булёну,*
*2 л вады,*
*1 сярэдняя морква,*
*1 корань пятрушкі (або сялеры),*
*1 цыбуліна,*
*3 сярэднія бульбіны,*
*соль на свой густ,*
*1—2 бабкі (лаўровае лісьце),*
*па 3—5 гарошын чорнага перцу і ангельскага зельля (духмянага перцу),*
*1 добры пук бацьвіньня з маладымі бурачкамі,*
*па 1 невялічкім пучку зеляніны: зялёная цыбуля, пятрушка і кроп,*
*1 ст. лыжка тлушчу,*
*2 ст. лыжкі мукі,*
*½ шклянкі сьмятаны,*
*3 вараныя яйкі.*

Прамыць косткі, заліць халоднай вадой і давесьці да кіпеньня. Зьняць шум, праварыць яшчэ 1 хв., дадаць моркву (кубікамі або таркаваную на грубай тарцы), пакрышаны корань пятрушкі, пасэраваную цыбулю, пакрышаную бульбу, соль і закрасы. Варыць, пакуль бульба ня зробіцца мяккая (каля 15 хв.). Добра прамыць бацьвіньне, пакрышыць, апарыць (або праварыць 2—3 хв.). Дадаць у суп бацьвіньне і добра прамытую і пасечаную зеляніну і варыць яшчэ 8—10 хв. На патэльні растапіць тлушч, пакласьці муку і, падліваючы крыху булёну, варыць да ўтварэньня густога пюрэ (або зьмяшаць муку зь невялікай колькасьцю вады ў аднародную пасту, потым дадаць сьмятаны, старанна перамяшаць), якое дадаць да супу за 1—2 хв. да канца гатаваньня. Дадаць сьмятану і палавінкі (або чвэрткі) вараных яек. Падаваць гарачым.

### Лапеня па-літоўску

*1 добры пук бацьвіньня (буракоў, рэпы, шчаўя, шпінату і г.д.),*
*2 л вады ці ялавічнага булёну,*
*3 ст. лыжкі панцаку (ячных круп),*
*2 бульбіны,*
*соль на свой густ,*
*120 г смажанага бэкону,*
*½ шклянкі сьмятаны.*

Прамыць і асушыць бацьвіньне, пакрышыць, заліць гарачай вадой і давесьці да кіпеньня. Зьліць ваду. У кіпень ці гарачы булён скласьці бацьвіньне, прамыты панцак, накрышаную кубікамі бульбу, соль. Варыць да мяккасьці бульбы. Дадаць падсмажаны бэкон — скрылькі разам з топленым тлушчам. Падаваць гарачай са сьмятанай.

### Кансэрванае бацьвіньне на зіму

*Маладыя бурачкі разам з бацьвіньнем, лімонны квас.*

Дробна пакрышыць бацьвіньне і бурачкі, скласьці ў рондаль, заліць кіпенем так, каб цалкам пакрыць вадой, варыць 5 хв., адкінуць на друшляк, даць сьцячы. На кожны літар кансэрвы дадаць 1 лыжачку лімоннага квасу бяз горкі. Гарачай раскласьці кансэрву ў слоікі, пастэрызаваць. Закатаць машынкай і перахоўваць у халодным месцы.





Надыходзіць лістапад,
Паскідаў лістоту сад.

Мы лісты сабе знайшлі
Ды зрабілі караблі.





Будзем лётаць, дзе захочам,
Можам днём, а можам ноччу!

Капітан Танака ©

## ФЭСТЫВАЛЬ

**Schmerzwerk**

**24 лістапада.** Прэзэнтацыя кнігі Зьмітра Вішнёва «Фараон у заапарку». З удзелам Зьмітра Вайцюшкевіча, Альгерда Бахарэвіча, Зьмітра Пляна, Віктара Жыбуля, Джэці, гуртоў «Рацыянальная дыета», «Краджа золата», музыкаў зь біг-бэнду Васіля Коназа, Тэатру Пс.–Н. **18.00. Палац мастацтваў (Казлова, 3), канфэрэнц-заля.**

**27 лістапада.** Прэзэнтацыя кнігі Альгерда Бахарэвіча «Ніякай літасьці Валянціне Г.». З удзелам Андрэя Хадановіча, Юрася Барысевіча, Вікі Трэнас, Вольгі Гапеевай, Зьмітра Вішнёва. **18.30. Галерэя «Падземка» (пр. Незалежнасьці, 43).**

**30 лістапада.** Прэзэнтацыя кнігі Ільлі Сіна «Сапсаваныя лялькі» і CD праекту KEIN «sicksicksick». Будуць: Валянцін Акудовіч, Вольга Гапеева, Спэцбрыгада афрыканскіх братоў, Зьміцер Плян. **19.00. Фальварак «Добрыя мысьлі» (Маскоўская, 12).** Уваход вольны.

# Эстонская крыжаванка

**Падобная да звычайнай — адзінае, што словы абмежаваныя не чорнымі палямі, а рыскамі. Напрыклад, у 1-м слове паземна ляжыць 5 літар, у 2-м старчма — 3 літары і г.д.**

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | | | | | 12 | | | | |
| 13 | | | | | | 14 | | | |
| 15 | 16 | | | | | 17 | 18 | | |
| 19 | | 20 | 21 | | | | 22 | 23 | |
| 24 | | | | | 25 | 26 | | | |
| 27 | 28 | | | 29 | 30 | 31 | 32 | | |
| 33 | | | | 34 | | | | | |
| | 35 | | | | | | | 36 | 37 |
| 38 | | | | | | 39 | | | |

**Паземна: 1.** Рэдактар «Віцебскага кур'ера». **6.** Нобэлеўскі ляўрэат 1921 г., аўтар «Вострава пінгвінаў». **11.** На ёй змагаліся глядыятары. **12.** Рэклямны, дакумэнтальны… **13.** Покрыўка будынку. **14.** Армянскія шашкі. **15.** Што сказала Сьмерць, выйграўшы партыю ў Вылівахі? («Ладзьдзя Роспачы».) **17.** Марскі рак. **19.** Тое, што і лемантар. **22.** Пісьменьнік-постмадэрніст, напісаў «Імя ружы». **24.** Тканіна для дэманстрацыі фільмаў. **25.** Дыктатары наганяюць на падданых… **27.** Сымбаль армянскага народу. **31.** Прахон у сьцяне дому. **33.** Адзеньне праваслаўнага сьвятара. **34.** Фірма — вытворца брытваў. **35.** Від чырвонай фарбы. **36.** Горад у Кіргізіі, дзе летась былі забурэньні. **38.** Прозьвішча дзекабрыста і вёска на Берасьцейшчыне. **39.** Абутак для ровара і аўтамабіля.

**Старчма: 1.** Мужчынскі голас. **2.** Папулярны спэктакль Пінігіна паводле п'есы Ясьміны Рэзы. **3.** Жахлівы горад з кінастужкі часу перабудовы. **4.** Шэф ААН да 2006 г. **5.** Габрэйскае імя — так звалі рэбэ-цудатворцу з Умані. **6.** Ня злодзей (арго). **7.** Вал у машынах. **8.** Жаночае імя. **9.** Горад на поўдні Францыі. **10.** Ім выпадае быць распаўсюдніку «НН». **15.** Японскі клясык, аўтар раману «Жанчына ў пясках». **16.** Маленькі казачны герой. **18.** Выбарная пасада ў гарадзкой управе. **20.** Савецкі дыплямат і ледакол. **21.** Буйная яшчарка. **23.** Край у Швайцарыі. **26.** Легендарны беларускі дзед-партызан. **27.** Мёртвае мора ў Сярэдняй Азіі. **28.** Старажытнаэгіпецкі бог сонца. **29.** Француcкі міліцыянт. **30.** Рэспубліка ў складзе Расеі. **32.** Прайграў Бушу на выбарах-2004. **35.** «Жоўтыя штаны — … два разы». («Кін-дза-дза!») **37.** Выклічнік, якім просяць змоўкнуць.

**Склаў Вольф Рубінчык**

**Адказы**

**Паземна: 1.** Базан. **6.** Франс. **11.** Арэна. **12.** Ролік. **13.** Страха. **14.** Тама. **15.** Аман. **17.** Амар. **19.** Буквар. **22.** Эка. **24.** Экран. **25.** Страх. **27.** Арарат. **31.** Акно. **33.** Раса. **34.** Жылет. **35.** Кінавар. **36.** Ош. **38.** Лунін. **39.** Шына.

**Старчма: 1.** Бас. **2.** Арт. **3.** Зэра. **4.** Анан. **5.** Нахман. **6.** Фраер. **7.** Ротар. **8.** Ала. **9.** Нім. **10.** Скараход. **15.** Абэ. **16.** Мук. **18.** Мэр. **20.** Красін. **21.** Варан. **23.** Кантон. **26.** Талаш. **27.** Арал. **28.** Ра. **29.** Ажан. **30.** Тыва. **32.** Керы. **35.** Ку. **37.** Ша.

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 25 лістапада

**БТ, 12.10**

«Тэма».

Расея (СССР), 1979, рэж. Глеб Панфілаў.

Псыхалягічная драма.

Прыўладны пісьменьнік Кім Ясенін, сутыкнуўшыся ў правінцыйным гарадку зь дзяўчынаю Сашай, разумее, у які тупік завялі яго хлусьня й прыстасавальніцтва...

Глеба Панфілава заўжды цікавіла тэма ўлады — і ўлада забараніла карціну. Але праз восем гадоў на Бэрлінскім кінафэсьце «Тэма» атрымала «Залатога мядзьведзя».

Ролі выконваюць: Міхаіл Ульянаў, Іна Чурыкава, Станіслаў Любшын.

**СТВ, 23.55**

«Чэ Гевара: дзёньнікі матацыкліста».

ЗША—Нямеччына—Вялікабрытанія—Аргентына—Чылі—Пэру—Францыя, 2004, рэж. Вальтэр Салес.

Драма.

У 1952 г. два студэнты-мэдыкі Альбэрта Гранада і Эрнэста Гевара дэ ля Сэрна адпраўляюцца на матацыкле ў вандроўку па Лацінскай Амэрыцы. Выпрабаваньні, чалавечы боль, жабрацтва, спробы дапамагчы людзям…

Тры прызы на Канскім фэсьце, «Оскар», узнагароды Брытанскай кінаакадэміі, прэмія «Гоя» за найлепшы сцэнар і іншыя прызы.

У ролі Чэ Гевары — Гаэль Гарсія Бэрналь («Благое выхаваньне»).




### Нядзеля, 26 лістапада

**БТ, 16.00**

«Бацькі».

Францыя, 1983, рэж. Франсіс Вэбэр.

Камэдыя.

П'ер Рышар і Жэрар Дэпард'ё даведваюцца, што зьяўляюцца татамі аднаго няўрымсьлівага хлапца. Героі кідаюцца ў вышукі…

**БТ, 23.10**

«Распусьнік».

Вялікабрытанія, 2004, рэж. Лорэнз Данмор.

Гістарычная драма.

Джон Ўілмат — граф Рачэстэр, паэт, нягоднік і сыфілітык. Бунтар, пачвара і ахвяра амаральнасьці.

Адна з найцікавейшых роляў Джоні Дэпа.

**НТВ, 23.15**

«Апошняе танга ў Парыжы».

Італія—Францыя, 1972, рэж. Бэрнарда Бэрталючы.

Трагедыя.

Выпадак зводзіць амэрыканца (Марлён Брандо) і францужанку (Марыя Шнайдэр). Для саракагадовага героя брутальная жарсьць, сэкс без імёнаў — экзыстэнцыйны надрыў і каханьне наконадні сьмерці. Для юнае гераіні — забаўка перад вясельлем.

Карціна была абвешчаная ў СССР парнаграфічнай.Шэдэўр сусьветнага кіно. Адна з асноўных роляў Марлёна Брандо, якую немагчыма пераўзысьці.

Апошняе танга ў Парыжы паставіла кропку ў бунтах 60-х… і адкрыла шлюзы таннай эротыцы.

**Андрэй Расінскі**

## ТЭАТРЫ

**Опэра**
*На сцэне Цэнтральнага дому афіцэраў*
**2 (сб)** — «Рыта, альбо Пірацкі трохкутнік», «Джані Скікі».
**3 (ндз)** — «Чароўная музыка».
**3 (ндз)** — «Яўген Анегін».

**Купалаўскі тэатар**
**26 (ндз)** — «С. В.».
**29 (ср)** — «Чорная панна Нясьвіжу».
**30 (чц)** — «Маэстра».
**1 (пт)** — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**2 (сб)** — «Таполевая завея».
**3 (ндз)** — «Паўлінка».
*Малая сцэна*
**25 (сб)** — «Балада пра каханьне».
**26 (ндз)** — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
**29 (ср)** — «Востраў Сахалін».

**Тэатар юнага гледача**
**1 (пт)** — «Каліф-шавец».
**1 (пт)** — «Апошняя дуэль».
**2 (сб)** — «Дарога на Бэтлеем».
**2 (сб)** — «Сястра мая Русалачка».
**3 (ндз)** — «Маленькія трагедыі».

## ВЫСТАВА

**Графіка**
**Да 22 сьнежня** ў «М-Галерэі» Інстытуту імя Гётэ ў Менску (вул. Фрунзэ, 5) працуе выстава «Графіка» Валер'я Славука. У графіцы майстра мірна суіснуюць рэальныя і фантастычныя сюжэты, рэальныя і фантастычныя пэрсанажы. Мастак аформіў мноства беларускіх (і ня толькі) казак, надаўшы ім аб'ём, колер, новае гучаньне і выразнасьць.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Жыгімонт і Барбара ў Вене

**Ілюзіяніст** (Illusionist).

ЗША—Чэхія, 2006, каляровы, 110 хв.

**Жанр:** драма паводле раману Стывэна Мільгаўзэра.

**Адзнака:** 7 (з 10).

На бяду сустрэліся бедны юнак і герцагіня. Яны ня роўня адзін аднаму. Праз пятнаццаць гадоў закаханы герой вяртаецца ў Імпэрыю як ілюзіяніст Эйзэнгайм. Яго дзівосы неверагодныя — і герцагіня адразу кідаецца ў абдымкі былога сябра.

Але дзяўчына ўжо заручаная з кронпрынцам — і ёй належыць не апошняе месца ў плянаваным дзяржаўным перавароце. Ганарлівы прынц ня можа дапусьціць, каб сарвалася мадэрнізацыя аўстра-вугорскай манархіі...

Фільм Ніла Бёргера — гэта чары. Чары эпохі з палацамі, кацялкамі, мундзірамі, карункамі, жабракамі — і палітычнымі інтрыгамі.

Гэта чары кінэматографу, на які вельмі падобныя сьпірытычныя сэансы Эйзэнгайма. Выпаленыя сэпіяй вуліцы, чараўнік пад дрэвам, здані дзяцей — і глядацкі шок. Апэльсінавае дрэва, якое вырастае на нашых вачох, выдрэсіраваныя матылі, імгненны партрэт імпэратара.

Чараўнік Эдварт Нортан («Байцоўскі клюб») — стрымана-таямнічы, сьледчы (Пол Джамаці) — імпэтны й валявы, кронпрынц (Руфус Сьюэл) — ганарліва-мярзотны, а закаханая гераіня (Джэсыка Біл) — копія Скарлет Ёхансан.

«Ілюзіяніст» — гэта чары любові. Стрыманай, палкай, ціхай. Яна здольная чакаць і прыдумлівая на вынаходніцтвы.

Гісторыя мага і герцагіні ў нечым нагадвае каханьне Жыгімонта Аўгуста й Барбары Радзівіл. Але разьвязка аўстрыйскай драмы прымусіць жанчын плакаць ад радасьці.

Ды толькі, колькі прадоўжыцца шчасьце, збудаванае на геніяльных ілюзіях?

**Андрэй Расінскі**



# «Бэніфэст» Анемпадыстава

12 сьнежня ў клюбе «Юла»

Сваё трохгодзьдзе партал «Тузін Гітоў» вырашыў адзначыць выданьнем чарговага дыска — «Прэм'ер Тузін 2006» і вялікім канцэртам, прысьвечаным творчасьці Міхала Анемпадыстава. Рокпаэт і мастак стаў на «Тузіне Гітоў» чалавекам году, ён аўтар тэкстаў адразу двух галоўных беларускіх гітоў — «Аўтабіяграфіі» (Ігар Варашкевіч і Лявон Вольскі) і «Сьвятла ў цемры» (IQ48). 12 сьнежня ў клюбе «Юла» будзе вялікі канцэрт «Бэніфэст Міхала Анемпадыстава».

«Бэніфэст» — нешта сярэдняе між бэнэфісам, маніфэстам і фэстывалем. Весьці яго будзе сам герой году. «Такога маштабнага творчага вечара ў мяне яшчэ не было, — прызнаецца Міхал. — Таму я запрасіў сваіх сяброў-музыкаў і ў якасьці выканаўцаў, і ў якасьці гасьцей». Прагучыць розная музыка, але Анемпадыстаў абяцае зрабіць так, каб зьмена стыляў дапамагала слухаць, а не замінала. Сярод удзельнікаў будуць Кася Камоцкая, Зьміцер Вайцюшкевіч, Ігар Варашкевіч, праект «Народны альбом». *IQ48* засьпявае ня толькі «Сьвятло ў цемры», але і новую песьню на верш Анемпадыстава. *Apple Tea* акрамя сваёй джазавай праграмы рыхтуецца сыграць галоўны гіт сэзону на «ТГ» — «Аўтабіяграфію». Гэтая песьня, дарэчы, упершыню прагучыць ужывую ў Беларусі.

12 сьнежня адбудзецца і рэліз новага дыска — «Прэм'ерТузін 2006», у які ўвойдуць найлепшыя песьні сэзону, якія абіралі наведнікі і экспэрты гіт-параду. Сюды ўвойдзе ўсё самае лепшае з таго, што гучала цягам дзевяці месяцаў на «Тузіне Гітоў».

**Сяргей Будкін**




НАШЫ ШАШКІ

# Блізьняткі далі рады

У юнацкіх шашачных спаборніцтвах, раўнуючы з шахматнымі, ёсьць свае плюсы. Малодшыя школьнікі volens nolens гартуюць характар, бо часьцяком гуляюць зь дзецюкамі прызыўнога веку. Партыі ў шашках карацейшыя — не стамляюць ні гульцоў, ні трэнэраў. Апроч усяго, у асяродзьдзі шашыстаў часьцей пачуеш беларускую гамонку, асабліва ў кулюарах.

Сёлета ў мурох Рэспубліканскага цэнтру алімпійскай падрыхтоўкі першынство аспрэчвалі сотня юнакоў і дзяўчат. У рускіх шашках вызначыліся Антон Гуркоў з Горадні і Андрэй Толчыкаў з Гомелю. Чэмпіёнкай сярод дзяўчат па шашках-64 стала Воля Федаровіч (вынік — 100%), а ейная сястра-блізьня Даша заняла пачэснае 4-е месца ў хлапечым турніры. Прэтэндавала нават на першае, але на фінішы саступіла Толчыкаву.

Майстар ФМЖД Толчыкаў лёгка выйграў і турнір па шашках-100 — ён жа ў іх чэмпіён сьвету сярод кадэтаў. У дзяўчат першай выявілася зноў жа Вольга Федаровіч, Дар'я — другой, Ганна Зінчук зь Віцебску — трэцяй.

А судзьдзі хто? Галоўным паўсюдна быў міжнародны арбітар Аляксандар Аніська, які ўпарта выбіваў з удзельнікаў сяброўскія складкі ў фэдэрацыю. Асыставаў яму сын Віталь — судзьдзя першай катэгорыі. Аніська-юніёр ласкава паказаў карэспандэнту «НН» партыю першаразраднікаў, што завяршылася «чортавым колам». Ёсьць на што паглядзець.

**ВР**

## Ваш ход

Ход чорных. А. Рык (Бабруйск) — В. Сарокін (Віцебск)



**Адказ:** 1...dc5 2. ff8 fg5 3. hf6 ba3 4. fb4 aa3X.

# Дзякуй за ахвяраваньні

Дзякуем за салідарнасьць **Пасольству Славаччыны ў Беларусі**.

**Дзякуем І.Л., Міхаілу А., Віктару К., А.К., Аляксандру К., Рыце Н., В.П., Д.К., Л.К., Ігару Б., Уладзімеру Р., Ігару С., Марыне С., А.Я., А.Ц., Паўлу І., Тацяне В., В.В., Канстанціну Л., Мікалаю К., Сьвятлане Р., Д.В., Ю.В., А.Г., Уладзімеру Дз., І.П., В.Д., Л.Р., Міхаілу Ж., Сяргею У., Рыгору Р., Веры М., Л.Т., Уладзіміру К., Алесю Ш., Анатолю В., Станіславу Б., Зьмітру К., Тацяне Г., А.П., Алене К., Н.Ш., Л.П., Аляксею Д., Т.К., М.Т., А.М., Уладзімеру П., Ксені Д., Аляксею Б., Валянціне Ш.** зь Менску.

**Л.Л., Ігару Х., П.Н.** зь Менскага раёну.

**Любові Ш.** зь Віцебску.

**Фёдару К.** з Талачына.

**Леаніду А.** з Гарадка.

**Валерыі Х.** зь Дзяржынскага раёну.

**Сяргею С.** з Полацку.

**Дар'і Л.** з Смургонскага раёну.

**Марыі К.** з Астравецкага раёну.

**Міхаілу Г.** зь Берасьця.

**Т.Ш., С.Р., І.Б.** зь Бярозы.

**Іне С., Сяргею С.** з Барысава.

**П.Г.** з Мастоў.

**Анатолю П., Антону Т.** з Жодзіна.

**Антону З., Леакадзіі Н.** з Валожынскага раёну.

**Н.К.** з Наваполацку.

**Уладзімеру П.** з Аршанскага раёну.

**Д.П., Ц.** са Жлобіна.

**Г.Б., Алене А., Т.Б., Сямёну Г., Аляксандру Б., Міхалу А.** з Магілёва.

**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.

**Івану Ю.** з Бабруйску.

**Глафіры Д.** зь Бешанковіцкага раёну.

**В.З., Марыі Б.** з Гомелю.

**Г.Д.** з Чэрвеню.

**Сяргею К., Тадэвушу Ш., Аляксандру К.** з Маладэчна.

**Анатолю К.** са Стаўпецкага раёну.

**Аляксандру Р., Валеру П.** з Баранавічаў.

**Вользе А.** зь Любанскага раёну.

**Тамары М., Г.Л., Марыне С., Людміле М., Натальлі М.** з Горадні.

**Эдмунду А., А.Р.** з Шаркаўшчынскага раёну.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3015 212 000 012 — Асабовы рахунак: ______

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3015 212 000 012 — Асабовы рахунак: ______

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 36000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

**...ён быў таемным фанатам «НН» і працаваў для выданьня пад псэўданімам:**

**Павал Севярынец.**

— Я выклікаў вас, бо не магу ўвайсьці ў вобраз і атрымаць творчае натхненьне: зрабіце ў мяне у кабінэце пэрсанальны шмон і забараніце перадачы.





**Альгерд Бахарэвіч.**

— Ня раюісьці з законапраектам. У шэфа дрэнны настрой: зранку ня можа знайсьці рыфму да выразу «ў Эўропу».

**Андрэй Лянкевіч.**



...а давайце, Уладзімер Уладзімеравіч, сфотаемся з высунутымі языкамі, чыста гэтак па прыколу, для інтымнага альбому.

МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА

# лІтаратурНы сшытак «НН»

*лістапад 2006*

Хто народны? Вынікі нашаніўскай дыскусіі ........ 28
«Трэба ствараць аргкамітэт па ўручэньні агульнанацыянальных прэміяў». Гутарка з Алегам Трусавым ...... 29
Першы беларус. Эсэ Алега Латышонка ........ 30
Паэзія. Алесь Аркуш, Адам Глёбус, Дзьмітры Дзьмітрыеў, Аляксей Знаткевіч, Юрась Пацюпа, Андрэй Хадановіч, Андрэй Храпавіцкі ........ 32
All I wanted All I needed. Апавяданьне Паўла Касьцюкевіча ........ 34
Шампуры і мяса. Даніла Жукоўскі пра кнігі Вячаслава Ракіцкага і эміграцыйнае прозы ........ 37
Алег Дзярновіч. Ці прыйдзе збавеньне? ........ 38
Руслан Равяка. Гаданьне на чужых мовах. ........ 38
Зроблена рукамі Альбіны Юдчыц. Апавяданьне Наталкі Бабінай ........ 39

## Юбілейныя вечарыны й фуршэт

**23 лістапада** (чацьвер) нашай газэце спаўняецца 100 гадоў. З гэтай нагоды адбудуцца два ўрачыстыя сходы. Першы пачнецца а 17-й, другі — а 19-й. Адрас: сядзіба БНФ, Варвашэні, 8. Сьпявае Лявон Вольскі, рэдактары адкажуць на пытаньні.

**24 лістапада** (пятніца) а 19-й адбудзецца дабрачынны фуршэт з мэтай збору грошай на газэту. Каб узяць удзел, трэба пераказаць на рахунак Рэдакцыі 100 тыс. рублёў. Даведкі праз т. 284-73-29, (029) 707-73-29.

Вечарыны ў Бялынічах і Магілёве адбудуцца **30 лістапада**. Даведкі праз т.(029) 388-35-61, Алег.

## Сабачыя гісторыі

Адзін Сабака вырашыў правесьці перапіс Грэжданоў у грамадзянскім вобшчастве. Справа была даручана Граждану, які пайшоў у грамадзянскае вобшчаства і праз паўгоду вярнуўся героем Савецкага Саюзу.

* * *

Адзін Сабака трапіў за краты. Граждан, даведаўшыся пра гэта, узрадаваўся: «Цяпер і ў мяне на вуліцы запаляць ліхтары, засыплюць канавы, а мне дадуць грамату за добрыя паводзіны...»

* * *

Адзін Сабака на дабрачынным фуршэце з нагоды 100-годзьдзя «Нашай Нівы» выступіў перад прысутнымі зь юбілейнай прамовай. А Граждан выпіў пляшку віна, зьеў кіляграм каўбасы і ўкраў скураную шапку, спадзеючыся, што яна Фядутава.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

З назначэньнем новага прадсядацеля міністраў, Какаўцова, каторы зараз пасьля сьмерці П.А.Сталыпіна сказаў, што пара ўжо кінуць нацыянальныя сваркі і «нацыянальную» палітыку, — у палітыцы правіцельства наступае перамена.

Мы ўжо казалі ў «Нашай Ніве», што хаця «курс» палітыкі мо і пераменіцца, але гэта будзе больш перамена *спосабаў*, чым *мэты* палітыкі правіцельства.

**«НН». 1911. №43.**

# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 46.**

## ЖАРТ

Рэцэпт новай стравы: мяса, запечанае зь яблыкамі.

Як гатаваць: вазьміце кіляграм чарвівых яблык...

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### СЯБРОЎСКАЯ ВАНДРОЎКА

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў падарожжа «Нёманская каса» 26 лістапада (нядзеля) маршрутам: Менск—Вузда—Кухцічы—Наднёман—Нясьвіж—Вішнявец—Новы Сьвержань—Менск. 23—24 сьнежня: Вільня—Коўна—Румчышкі. Т.: 292-54-58, 622-57-20, 110-19-28, 509-12-16, 573-88-17.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2721. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 22.11.2006.
Замова № 6501.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.